# Забытых таямніцаў чар

## Легенды, паданні, аповесці ваколіц Белавежскай пушчы

пад рэдакцыяй
Наталлі Герасімюк

Музей і Асяродак Беларускай Культуры ў Гайнаўцы

Гайнаўка 2006

Дадзеная публікацыя з’яўляецца вынікам праекту „Забытых таямніцаў чар”, які быў рэалізаваны Аб’яднаннем Музей і Асяродак Беларускай культуры ў Гайнаўцы.

*Праект рэалізаваны пад патранажам Еўрарэгіёну Белавежская пушча, пры грашовай падтрымцы Еўрапейскай Вуніі.*

МУЗЕЙ І АСЯРОДАК БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ Ў ГАЙНАЎЦЫ
культурна-асветніцкая арганізацыя,
якая займаецца стварэннем і распаўсюджваннем беларускай культуры.

Польшча, г. 3 Мая 42; 17-200 Гайнаўка
тэл.+48 85 6822889; факс: +48 85 6823016;
e-mail: belmuzeum@poczta.onet.pl; asiarodak@op.pl
www.belmuzeum.fm.interia.pl

| | |
|---|---|
| Рэдактар: | Наталля Герасімюк |
| Праект вокладкі: | Наталля Герасімюк |
| Карэктар: | Тамара Лаўранчук |
| Пераклад: | Людміла Карпюк, Тамара Лаўранчук |
| Ілюстрацыі: | Агнешка Ціханюк |
| Апрацаванне: | Выдавецка-Эдытарская Агенцыя ЭкаПрэс А. Паскробка |
| Склад: | Артур Садурскі |
| Друк і афармленне: | Друкарня МКЯ |

# Змест

Прадмова (*Наталля Герасімюк*) ..........
Легенда пра Белавежскую пушчу ..........
Венерын чаравічак ..........
Катэрка ля Такароў (*Г. Пятроўская*) ..........
Жывая вада ..........
Сакі (*В. Ціханюк*) ..........
Чорны крыж (*Т. Ціханюк*) ..........
Пачуйкі (*П. Герасімюк*) ..........
Дубічы Царкоўныя (*В. Ціханюк*) ..........
Магічны Дуб (*Б. Пень*) ..........
Стары Корнін – ікона Божай Маці (*В. Андрасюк*) ..........
Вёска Мора ..........
Легенда аб пабудове царквы ў Пухлах (*Г. Пятроўская*) ..........
Сярэбраная Горка (*Т. Ціханюк*) ..........
Адкуль Тыневічы ..........
Аб паўстанні Трывежы ..........
Горка ля Новаберазова ..........
Анямелы звон (*М. Гайдук*) ..........
Схаваны скарб ..........
Прыгожая Кінга ..........
Войшыкі ..........
Грай, грай, грачу ..........
Як паўстала вёска Хітра (*М. Данілюк*) ..........
Хвоя *(К. Пажэзіньска)* ..........
Смаляны чорт ..........
Савіны Груд – Паедынакі (*М. Баўтрамюк*) ..........
Чаму Буды ..........
Прыгожая дуброва ..........
Крыштапова (*А. Сабесюк, М. Адулінскі*) ..........

Калена (*М. Анішчук*) ....................
Валун (*М. Гайдук*) ....................
Месца Моцы (*М. Баўтрамюк*) ....................
Крыначка (*М. Баўтрамюк*) ....................
Прыбудкі (*Б. Трахімчык*) ....................
Чаму наша сяло называецца Скупава ....................
Два свінары (*Я. Корбэль*) ....................
Ляды (*А. Корх*) ....................
Шастакова ....................
Лядская Пушча (*Т. Заброцкі*) ....................
Дух Пушчы (*М. Гайдук*) ....................
Паратунак (*К. Кульбацкая*) ....................
Забрады (*А. Раманчук*) ....................
Масева (*Ю. Скепка, Д. Мішчук*) ....................
Туркава Гара (Турэцкая Гара) (*М. Харкевіч*) ....................
Красная Грэбля (*Ё. Стоцкая*) ....................
Урочышча нязвыклай сілы ....................
Балота Яна ....................
Жыватворная крыніца ....................
Мацейкава Гара ....................
Баб’я Гара (*А. Раманчук*) ....................
Баб’ягорац і пошасць (*М. Гайдук*) ....................
Векавечная мяжа ....................
Адкуль Поразава ....................
Свіслач ....................
Ружа колеру сонечных промняў (*І. Масляніцына*) ....................
Ружаны ....................

Выбавенне (*І. Масляніцына*) ..........
Вёска Варанілаўцы ..........
Нашчадак (*І. Масляніцына*) ..........
Востраў Веча (*І. Масляніцына*) ..........
Пра горад Пружаны і раку Мухавец (*М. Зелянкова*) ..........
Вандроўка каралевы (*І. Масляніцына*) ..........
Жаночы суд (*І. Масляніцына*) ..........
Пружаны ..........
Легенда пра недабудаваны касцёл (*І. Масляніцына*) ..........
«Святы» Шэраш (*І. Масляніцына*) ..........
Божая Маці-заступніца (*Г. Мусевіч*) ..........
Будавалі башню Веліканы? (*Г. Мусевіч*) ..........
Легенда пра горад Камянец (*А. Ненадавец*) ..........
Легендарная горка (*Г. Мусевіч*) ..........
Ваўкі далі назву (*Г. Мусевіч*) ..........
Не стала царквы (*Г. Мусевіч*) ..........
Мурыны (*Г. Мусевіч*) ..........
Свінёва (*Г. Мусевіч*) ..........
Бяздоннік (*Г. Мусевіч*) ..........
Грушка (*А. Трафімюк*) ..........
Легенда пра горад Высокае (*В. Міронаў*) ..........
Манах *(Л.Белямук, Н. Герасімюк*) ..........
Пра нячыстую сілу (*Т. Кучко*) ..........
Таполя - абаронца (*Т. Кучко*) ..........
Панікві (*Г. Мусевіч*) ..........
Пракляцце (*Т. Кучко*) ..........
След Божай Маці (*Н. Сідарук*) ..........

Дарагі сябра, чытаючы гэтую кнігу, не судзі нас строга, бо, на добрую справу, няма за што. Не мы першыя і, маю вялікую надзею, што не апошнія, шукалі забытыя таямніцы, якія крые нашая зямелька – Белавежскі Край. Перад намі былі выдатныя людзі – этнографы, філолагі, мовазнаўцы і гісторыкі: Аляксандр Сержпутоўскі, Мікола Гайдук, Марыя Зелянкова, Аляксей Ненадавец і многія-многія іншыя. Мы збіралі тое, што захавала найбуйнейшая энцыклапедыя ў свеце – чалавечая памяць. З векапомных часоў з пакалення ў пакаленне перадаваліся легенды, паданні, гісторыі. Дзядулі і бабулі, каб заняць чым унукаў, расказвалі ім тое, што некалі чулі ад сваіх дзядуль і бабуль. Расказвалі, што захавала памяць, часам прыўкрашваючы аповесць выдумкамі. Да сапраўдных гісторый дадавалі казачную афарбоўку, каб цікавей было. Здаралася, што фантазія выкрочвала далёка за межы рэчаіснасці, але там-сям ў расказе мільгалі знаёмыя назвы, прозвішчы, месцы, і гэта дазваляла (і нават прымушала) верыць у праўдзівасць аповедаў. Мо, хто скажа, што не ўсё сабралі, што ёсць яшчэ шмат цікавага, да чаго не

дайшлі або выпадкова прапусцілі. Згаджаюся, ды і як бы інакш. Няма магчымасці сабраць *усё*, ды і наступным „збіральшчыкам” нешта трэба пакінуць... :) А так, па-шчырасці – гэта не канец, гэта толькі пачатак.

На тое, каб кніжка нарадзілася і ўбачыла свет, працавала шмат людзей. Няма магчымасці пералічыць усіх – гэта заняло б столькі месца, колькі сама кніга, – таму дазволю сабе падзякаваць настаўнікаў і вучняў школ з ваколіц Белавежскай пушчы (і з Польшчы, і з Беларусі), дзядуляў і бабуляў, якія адкрылі нам свае душы і, пакорпаўшыся ў памяці, расказалі цікавыя гісторыі; навукоўцаў і студэнтаў, якія кіравалі нашай працай, вучылі, раілі, падказвалі, а пасля дапамагалі апрацаваць сабраны матэрыял; перакладчыкаў, якія дапамаглі зрабіць кнігу зразумелай і для палякаў, і для беларусаў. Шчыры дзякуй усім, хто так ці інакш, часам нават не ведаючы таго, спрычыніўся да нарадзін гэтай публікацыі.

А табе, сябра, жадаем прыемнага чытання. Спадзяемся, што, прачытаўшы, захочаш наведаць Белавежскі Край і ўбачыць тыя месцы, пра якія мы расказалі. Запрашаем.

*Наталля Герасімюк*

vacat

# Легенда пра Белавежскую пушчу

Са старажытных часоў Белавежская пушча славіцца як унікальны прыродны комплекс у Еўропе. З 14 стагоддзя яна была месцам, дзе палявалі польскія каралі, а з канца 18 – царская сям’я, прыбліжаная знаць. Прыгожай была Белавежская пушча ў мінулым. Статкі ласёў, дзікіх коз, дзікоў хадзілі па лясах. Зайцоў – процьма. Паветра напоўнена водарам кветак, саснова-яловай смалы, папараці, чабору, шыпшыны, пахам лясных ягад, грыбоў.

Многіх людзей, якія бываюць у Белавежскай пушчы і якія жывуць тут, цікавіць пытанне: адкуль пайшла такая назва? Некаторыя лічаць, што гэта павялося з лёгкай рукі краязнаўцаў 14 стагоддзя, якія памылкова лічылі, што назва пайшла ад Белай вежы. Камянецкую вежу нярэдка называюць Белай. Збудаванні тыпу Камянецкай вежы называюцца данжонамі. У старажытнасці данжоны бялілі. Адсюль і пайшла назва Белавежскай пушчы.

Па сутнасці ж, Камянецкая вежа ніколі белай не была. Бяліліся толькі нішы, што размешчаны на ўзроўні пятага яруса. Аднак аб назве Белавежскай пушчы і яе наваколля ў народзе бытуюць легенды, паданні, народныя выдумкі, казкі з адлюстраваннем рэальных падзей, сведкамі якіх былі нашы далёкія продкі. Адной з такіх легенд і з’яўляецца вось гэтая.

На працягу амаль стагоддзя Камянец і Белавежская пушча служылі апорным пунктам ва ўзброеных сутычках паміж Літоўскай дзяржавай і Польшчай. З 1366 года Каменец у ВКЛ быў ва ўдзеле князя Кейстута, потым (з 1392 года) князя Вітаўта. Князь Вітаўт падараваў сваёй дачцэ ўгоддзі пушчы, бо яна любіла прыроду: розныя кветачкі, кусточкі, лісточкі, шчэбет розных птушак, размову звяроў. Яна разумела, якая жыўнасць на што жаліцца, якая дапамога ёй патрэбна. Любіла наведваць запаведныя мясціны пушчы. Часта аглядала свае ўгоддзі з самага верху Камянецкай вежы. Гэта была самая прыгожая дзяўчына на ўсю ваколіцу: доўгая белая каса, чорныя бровы. Яна вель-

мі любіла ўборы белага колеру. Узімку насіла футра з белага меху. Улетку – белую сукенку і белы капялюш. Людзі называлі яе белай княжной. Яна была настолькі прывабнай, што ніхто не мог прайсці міма, каб не палюбавацца яе красой. Жаночая краса – адзін з цудаў прыроды. Яна неаддзельная ад кахання, а каханне злучаецца з вечнасцю. Разам з тым яна і чароўная агалёнасць, і часцінка быцця і свету чалавечнасці. І пакахаў гэтую прыгажуню сын польскага князя Ягайлы. Цудоўнае каханне было ў маладых. Яны абое любілі прыроду з яе лясамі і жыўнасцю. Вельмі часта марылі, як захаваць для нашчадкаў гэтую прыгажосць.

У 1383 годзе князь Януш Мазавецкі, выкарыстаўшы міжусобную барацьбу вялікага князя Ягайлы з Вітаўтам, захапіў Камянец і ўгоддзі пушчы. Каханне маладых людзей было такое вялікае, што яны не маглі жыць адно без аднаго. Нягледзячы на тое, што бацькі не былі ў згодзе, вырашылі пажаніцца. Дзяўчына чакала свайго каханага ля сцен Камянецкай вежы. Адсюль яны прыехалі ў горад, які цяпер называецца Беласток.

Але праз год Ягайла пасля тыднёвай асады ўзяў штурмам Камянец з яго ўгоддзямі. Памірыўшыся з Ягайлам (1384г.), Вітаўт далучыў Камянец да сваіх зямель. Вось тут і вырашылі бацькі ўзаконіць шлюб сваіх дзяцей. Шлюбны рытуал правялі ў Камянцы. Адсюль на белых конях, у белай калясніцы, у белым убранні жаніх і нявеста, аб’ехаўшы тры разы Камянецкую вежу, накіраваліся ў горад, які зараз называецца Белавеж. Тут маладыя пасяліліся. Дарога, па якой ехалі, была ўсланая белым палатном, якое ткалі з ільну жанчыны пушчанскіх вёсак, затым адбельвалі ў рэчцы. На паверсе замка, дзе жылі маладыя, былі вежы, пафарбаваныя ў белы колер.

Усё, што было звязана з белай княжной, атрымала адпаведныя назвы: на польскім баку - гарады Бяла-Падляска, Беласток, Белавеж, а ў Камянецкім раёне – Белая вежа, Белавежская пушча, вёскі Падбела, Падбельскія Агароднікі, Белая і рака Белая. А месца, дзе мы жывем, – Белавежскі край.

# Венерын чаравічак

Здавён-даўна ведама, што расліна з прыгожай назвай „венерын чаравічак” селіцца ў такіх мясінах, куды сонца не заглядае, дзе шмат вільгаці і прахалоды.

Назву сваю кветка атрымала ад імені багіні прыгажосці Венеры. Старажытная легенда расказвае, што багіня, уцякаючы ад праследавання, схавалася сярод высокіх дрэў у непраходных балотах. Тут яна згубіла свой залаты чаравічак, аздоблены чырвонымі істужкамі.

Замест яго вырасла прыгожая кветка з прыемным пахам. На водар незвычайнай расліны злятаюцца насякомыя, збягаюцца звяры. Але горыч лістоў ахоўвае кветку ад знішчэння.

Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы

Аб паходжанні царквы ў Такарах-Катэрцы расказвае легенда. У кожнай легендзе ёсць зерне (альбо хоць зернейка) праўды. У гэтым выпадку легенду падтрымлівае царкоўная Хроніка. У 1852 годзе, у дзень св. Троіцы, жыхарка Такароў Еўфрасіння Івашчук збірала ў полі шчаўе. Нечакана, нібы з-пад зямлі, вырасла перад ёй жаночая постаць. Была гэта незвычайная незнаёмка, вельмі прыгожая жанчына, якая строга паглядзела на Еўфрасінню. Паводле Еўфрасінні, жанчына сказала, што свята вызначана Богам для таго, каб людзі хадзілі ў царкву, маліліся, а не працавалі. Дадала, што мясцовыя жыхары будуць пакараныя за свае грахі і нявер'е, Бог пакарае іх моравым паветрам (морам). Гэтае прадказанне спраўдзілася – у 1853 г. выбухла эпідэмія. Жанчына таксама параіла Еўфрасінні пайсці да мясцовага святара і сказаць, каб ён разам з прыходскім людам прасіў Бога аб прабачэнні. Жанчына знікла так раптоўна, як і з'явілася.

Еўфрасіння Івашчук не сумнявалася, што гэта была Божая Маці.

Як далей кажа легенда і пацвярджае царкоўная хроніка, на месцы з'яўлення постаці святар такарскага прыходу паставіў крыж. З часам сюды сталі спантанна прыходзіць пілігрымы розных канфесій і веравызнанняў. Хворыя атрымлівалі аблягчэнне альбо нават пазбаўленне ад хвароб.

Узнясенне крыжа ва ўрочышчы Катэрка, нягледзячы на шматлікія аздараўленні, не знайшло падтрымкі з боку вышэйшых духоўных улад, і крыж быў перанесены на мясцовыя могілкі.

Там, дзе стаяў крыж, з'явілася крынічка. Пілігрымы ізноў пачалі прыходзіць да цудадзейнага месца.

Святары такарскай царквы, убачыўшы, што на трэці дзень св. Троіцы (і ў іншыя дні) да ўшанаванага месца прыходзіць многа наведвальнікаў, дабіваліся дазволу пабудаваць тут капліцу.

У 1909 г. на трэці дзень св. Троіцы быў пакладзены вуглавы камень пад будову драўлянай царквы. А сама царква Іконы Божай Маці Ўсіх Смуткуючых Радасць была асвечана і перададзена вернікам у 1912 годзе.

Калі ў вёсцы Сасіны стаяла яшчэ старая царква, каля яе біла крыніца з жывой вадою. Прыходзілі сюды людзі хворыя і кульгавыя, мыліся жывою вадою і адыходзілі здаровымі. Слава аб цудоўнай крыніцы ішла далёка па свеце. Усё больш і больш прыходзіла з розных краёў людзей няшчасных на лячэнне.

Аднойчы прыйшла аднекуль да крыніцы знатная пані з хворым сабакам. Яна без дазволу выкупала сабаку ў жывой вадзе.

– Што ты робіш? – абурыліся хворыя і калекі. – Ці ж можна купаць у цудоўнай крыніцы нячыстае стварэнне?

– Мой сабака чысцейшы ад вас, паганых, – фанабэрыста адказала пані.

Ніхто з людзей не пасмеў пярэчыць знатнай пані. І як толькі панскі сабака вылез з вады, на вачах у людзей берагі крыніцы сышліся, жывая вада знікла.

Стогн жалю пракаціўся па натоўпе... Пані, прадчуваючы нядобрае, праз момант знікла. Людзі кінуліся ратаваць цудоўную крыніцу. Адкопвалі яе чым хто мог. Капалі і рыдлёўкамі, і рукамі. Капалі многа і доўга. Але не маглі трапіць на яе след. Зямля ўсюды была сухая. Пасмутнеўшыя, разбрыліся па сваіх хатах.

Праз нейкі час на месцы цудадзейнай крыніцы зноў паявілася вада. Але яна ўжо не біла халодным струменем, а кропля за кропляй сачылася, быццам слёзы. Людзі зноў кінуліся да крыніцы. Кропля да кроплі збіралі ваду і шукалі ў ёй ратунку ад сваіх няшчасцяў і хвароб. Але вада больш не лячыла.

Калі знікла крыніца з жывою вадою, на вёску пасыпаліся няшчасце за няшчасцем. Ноччу ўвосень невядома ад чаго згарэла старая царква. Людзі ўміралі як мухі, і не было каму хаваць пакойнікаў. Людзі ва ўсім абвінавачвалі фанабэрыстую знатную пані з сабакам. Не шукалі яны збавення ў крыніцы. Сцежкі да яе хутка зараслі травой і карчамі, а людзі пачалі забываць месца, дзе

некалі біла жывая вада. Крыніца ж не дала забыць аб сабе. Нават тады, калі збожжа на палях жоўкне ад няўмольнай засухі, на месцы крыніцы заўсёды кропля за кропляй сочыцца вада, быццам слёзы па загубленым шчасці.

Царква ў Саках стаіць на ўзгорку, пакрытым сасновым лесам. Ля падножжа знаходзіцца крынічка-калодзеж. Непадалёку ад яе павольна цячэ ручай, які сваім журчаннем расказвае такую легенду...

У часы татарскіх наездаў адзін з жыхароў вёскі быў узяты ў палон. У няволі працаваў у пякарні. Не раз карыстаўся драўлянай дошкай, якой закрываў печ. Аднойчы ўначы прысніўся яму сон, у якім малады хлопец папрасіў яго забраць з сабою гэтую дошку. Пасля таго, як сон паўтарыўся, перапалоханы, змучаны татарскаю няволяй, жыхар Сакоў сапраўды забраў з сабою дошку, схаваў яе пад падушку і, сумуючы па радзіме, заснуў. Калі прачнуўся, убачыў, што знаходзіцца непадалёку ад родных Сакоў, а драўляная дошка ад печы аказалася іконай св. Дзмітрыя. Аб гэтым здарэнні расказалі мясцоваму памешчыку, і той на месцы цудоўнага здарэння пабудаваў драўляную царкву. Ікона стала прычынай многіх выздараўленняў, здабыўшы тым самым тытул цудатворнай.

Падчас пажару царквы адзінай рэччу, якая ацалела, была ікона св. Дзмітрыя...

Праз нейкі час на месцы пажару была пабудавана новая, больш велічная, драўляная святыня.

# Чорны крыж

Адразу пасля II сусветнай вайны з адным жыхаром вёскі Ялёнка, што непадалёку ад Кляшчэляў, здарылася нязвыклая гісторыя.

Аднойчы Васіль мусіў адвезці некага са сваякоў фурманкай на чыгуначны прыстанак у Вітаве. Вася не ведаў, што чакала яго ў дарозе. Людзі гаварылі, што ў месцы, якое называюць „Чорны Крыж", нешта палохае, бываюць нязвыклыя здарэнні.

Вася спакойна даехаў да вакзала, развітаўся са спадарожнікам і рушыў дадому. І акурат тады здарылася з ім тое, што яшчэ больш узмацніла існуючую ў народзе легенду. Малады мужчына баяўся поцемкам ехаць праз лес, тым больш, што дарога бегла праз Чорны Крыж, ахутаны дурной славай. Гэта месца знаходзілася паміж Вітавам і Ялёнкай, непадалёку ад Чахоў Арлянскіх, дзе пры лясной дарозе стаяў вялікі драўляны крыж. Ніхто не ведаў, што ў гэтым месцы палохае.

Едучы фурманкай па лясной дарозе, Васька пачуў бляянне, азірнуўся і ўбачыў на сваім возе барана. Нечакана сарваўся страшны вецер, хоць дагэтуль было ціха і спакойна. Вецер перапалохаў каня, той ірвануў у вар'яцкі галоп, вырваўся з вупражы, дашчэнту знішчыўы воз. З Васем, на дзіва, нічога не сталася. Распрэжаны конь пабег у напрамку Ялёнкі. Перапалоханы Васіль кінуў разбіты воз і подбегам падаўся за канём дадому. У роднай вёсцы расказаў, што з ім здарылася. Ніхто не ведаў прычыны здарэння. Найчасцей тлумачылі гэтыя з'явы дзейнасцю бесаўскіх сіл. Месца ўсё больш палохала людзей, і ўжо сама назва – Чорны Крыж – выклікала страх.

Назаўтра Васька вырашыў пайсці да лесу, каб пазбіраць рэшткі разбітага воза. Як жа ж ён здзівіўся, калі ўбычыў свой воз – цэлым. Можа, гэта быў толькі сон?..

У вёсцы Чахі Арлянскія жыла некалі жанчына, якая магла прадугледзець падзеі і здарэнні. Яе прадказанні заўсёды збываліся. Людзей здзіўляла як яна адгадвае будучыню, бо жанчына не варажыла на картах, не склікала добрых ці злых духаў, не выкарыстоўвала іншых спосабаў: чарадзейскіх закляццяў, вылівання воску, назірання з'яў прыроды.

Жанчына казала, што „чуе" ўсё гэта, будучы на „грудку" – узгорку. Там нейкая сіла падае ёй знакі, і яна ўжо ведае, што мае здарыцца.

Цікава, што ў гэтым выпадку значыла слова „чуе", бо па-беларуску „пачуць" – значыць „чуць гук вушамі", або „адчуць". Невядома, ці арлянская прадказальніца чула нешта – нейкія гукі - ці адчувала пэўныя знакі.

Непадалёку ад Чахоў Арлянскіх знаходзіцца ўзгорак, які завецца „Пачуйкі". Гэта менавіта на ім можна было „пачуць" і прадугледзець розныя здарэнні.

# Дубічы Царкоўныя

У сяле Жыравец, непадалёку ад урочышча Бахматы, на ўзгорку, рос некалі вялікі дуб. Казалі, што яго дух ходзіць па вёсцы, заглядае на падворкі і ў хаты, заклікае людзей жыць паводле запаветаў веры..

Жыхары Жыраўца верылі, што дуб ведае пра ўсе іх справы і падзеі. Не хацелі слухаць яго павучэнняў і вырашылі пазбыцца такога надакучлівага сведку і ментара. Хацелі спілаваць дуб. Але ён адгадаў іх намеры і выклікаў трохдзённую страшную буру. Былі вялікія страты – некаторыя дамы разваліліся, іншыя згарэлі ад маланак, пасевы былі знішчаны. Людзі пачалі адкрыта выступаць супраць дуба. Мужыкі схапіліся за пілы і сякеры, каб зваліць дрэва. Аднак усе інструменты псаваліся, а дуб стаяў, як стаяў. Зразумелі людзі, што няма іншага выйсця – трэба падпарадкавацца волі дрэва. Сабраліся ля дуба і пачулі, што трэба пабудаваць царкву. Тое і зрабілі. І вось, нібы выканаўшы сваю місію на зямлі, дуб усох, а пасля знік зусім, нібы пад зямлю праваліўся.

Царквы тае ўжо няма. Некаторыя кажуць, што згарэла ў пажары, іншыя - што праvalілася пад зямлю ўслед за дубам. На месцы, дзе пасля пабудавалі новую царкву, засталася ікона Божай Маці. Новая царква дагэтуль стаіць у вёсцы Дубічы Царкоўныя. Людзі кажуць, што ў тым месцы, дзе некалі стаяла старая царква (а зараз толькі каменны крыж), на Вялікдзень чуваць званы і галасы людзей.

Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы

У Тафілаўцах рос дуб, адораны магічнай сілай. Казалі, что калі ў час поўні паставіць пад ім кошык яблык, то стануць яны залатымі. Дрэва магло рабіць цуды толькі раз у тыдзень і дапамагала выключна тым, каму дапамога сапраўды была патрэбна. Аднаго разу разгулялася страшная бура. Маланкі раздзіралі неба, бесперапынныя перуны перакатваліся з аднаго канца свету ў другі. Адна маланка трапіла ў дуб і расшчапіла яго. Людзі пазбіралі ашчэпкі і зрабілі з іх сані. Зімой аказалася, што сані ездзяць без каня і фурмана, могуць перавозіць вялікія цяжары і спаўняць жаданні. Было адно правіла, якога трымаліся ўсе жыхары вёскі: звяртацца за дапамогай да саняў можна толькі раз у тыдзень. Спраўна служылі яны людзям.

Праз нейкі час найбагацейшы і найбольш прагны вясковец пачаў прымушаць сані да штодзённай работы. Пужаў, што калі не паслухаюцца, то парубае іх і спаліць. Жаданні багацея былі шторaз большыя. Нарэшце чаша цярплівасці перапоўнілася, цудадзейныя сані не змаглі споўніць чарговага патрабавання скнары. Помста была хуткай: прагны багацей загінуў пад саннымі палазамі, а самі сані недзе зніклі...

# Стары Корнін – ікона Божай Маці

Заснавальнікам Старога Корніна быў каралеўскі дваранін Астафій (Яўстафій) Халецкі. Пачаткі сягаюць у 1570 г. У 1631 была пабудавана царква св. Ганны, што дало пачатак прыходу.

Ікона аб'явілася ў месцы, дзе расла тапаля, і біла невялічкая крынічка. Як расказваюць, у канцы XIX стагоддзя зрэзалі старую тапалю, а на яе месцы вырасла другая. У расшчэплены пень уваткнулі малады парастак, галінку з яе самой, спалучаючы такім чынам былое і сучаснасць, творачы працяг гісторыі. Тая галінка, з якой вырасла прыгожая тапаля, і цяпер знаходзіцца на святым месцы, у некалькіх кроках ад царквы св. Архангела Міхаіла.

Менавіта на гэтым дрэве пастухі некалі ўбачылі незвычайнае святло, выяву. Паводле „Кнігі цудаў...", апрацаванай і выдадзенай праф. Антонам Мірановічам, па меркаваннях тагачаснага святара Яна Сімановіча, можна зрабіць выснову, што ікона Божай Маці знаходзілася на галоўным каменным алтары царквы. Расказваюць, што аднойчы на алтары перад іконай пакінулі запаленую свечку, якая стала прычынай пажару, падчас якога алтар часткова згарэў, але ікона засталася некранутай - толькі крыху закапцілася.

У час моравога паветра (чумы) ікона свяцілася незвычайным святлом, аздараўляючы хворых і пакутуючых. У 1709 годзе слуга Амяльян Коцікаў ішоў з плебаніі „да ветру"... „у нядзелю бачыў святло ў царкве, другі раз у аўторак уначы, пасля, у чацвер, яшчэ большае святло бачыў прападобны айцец, які прыйшоў у царкву, бачыў святло прамяністае ад зямлі ажно да царкоўнага купала і постаць нейкай Пані, якая хутка знікла..."

Гэтае здарэнне прывяло да таго, што царква ў Старым Корніне стала аб'ектам шматлікіх паломніцтваў у дні епархіяльных святаў св. Ганны і св. Архангела Міхаіла.

Музей і Асяродак Беларускай Культуры ў Гайнаўцы

Калі верыць рэестру цудаў, паломнікі наведвалі цудоўную ікону ўвесь год. Сярод іх былі вернікі розных рэлігій. Міласць Божай Маці сыходзіла на іх падчас малітваў.

Найбольш выздараўленняў было ад рэўматызму, хвароб вачэй, болю галавы, гастрытаў, каўтуноў.

Як кажуць людзі, яшчэ ў міжваенны час у царкве было шмат ключак і кіёў, іх пакідалі хворыя пасля выздараўлення. Пасля кожнага рамонту святыні кастылёў станавілася штораз менш, але адна пара кайданоў, як сімвал вызвалення і выздараўлення, засталася вісець на бэльцы пад хорамі. Вісіць яна там і сёння.

Ікона Божай Маці падчас I сусветнай вайны (падчас „бежанства”) павандравала разам з людзьмі і назад ужо не вярнулася.

У царкве ў Старым Корніне ад векапомных часоў знаходзіцца ікона св. Ганны, якую жыхары называюць Прадаўжальніцай Корнінскай Іконы Божай Маці.

# Вёска Мора

Даўным-даўно ўвесну і ўвосень паблізу вёскі, якая не мела назвы, на навакольных лугах разлівалася вялікая паводка. Шматлікія чароды водных птушак, розныя віды гусей і качак затрымліваліся тут на адпачынак і жыраванне.

Аднойчы хлопец з тае вёскі знайшоў дзіўную птушку. Ніколі яшчэ не бачыў падобнай. Была яна даволі вялікая. На лапах паміж пальцамі была плеўка для плавання, зусім як у качкі, але гэта, напэўна, была не качка. Птушка мела вузкую, вострую дзюбу. Ногі ў яе раслі амаль ля самага хваста, таму зусім не надаваліся да хаджэння. Птушка толькі і магла, што адпіхацца нагамі і сунуцца чэравам па зямлі. Апрача дзівоснага выгляду, рабіла ўражанне моцнай і здаровай, аднак па нейкай прычыне не магла ўзняцца ў неба.

Знаходка так зацікавіла хлопца, што ён вырашыў паказаць яе старцу, які жыў у вёсцы. Стары дакладна агледзеў птушку, пагладзіў у роздуме сівую доўгую бараду і сказаў, што знойдзены крылаты цуд – гэта марская птушка, і таму ўзляцець можа толькі з вады. Параіў хлопцу занесці птушку на разліў, што цягнуўся за вёскай, і пусціць на ваду. Хлопец так і зрабіў. Якое ж было яго здзіўленне, калі птушка пасля доўгага „разбегу" па вадзе ўзнялася ў паветра і адляцела.

Вестка аб марскіх птушках, што наведваюць навакольныя разлівы, разнеслася далёка навокал, і хутка вёску пачалі называць Мора.

Так кажа легенда. Але тыя птушкі існуюць на самай справе і называюцца гагарамі. Звычайна яны не гняздзяцца ў нашай ваколіцы. Найчасцей можна іх сустрэць у час пералётаў на пабярэжжы і вельмі рэдка ў глыбіні кантыненту.

# Легенда аб пабудове царквы ў Пухлах

*Ты, Маці, з'яўлялася ўсюды,*
*І наш край спазнаў твае цуды.*
*У Пухлаўскім сведчаць прыходзе,*
*Што літасць Твая жыве ў народзе.*

Узнікненне вёскі і царквы ў Пухлах, якая ляжыць на правым беразе ракі Нараў, цесна звязана з легендай, што передаецца з пакалення ў пакаленне.

У канцы XVI стагоддзя аб'явілася там ікона Пакровы Божай Маці. У тым месцы, дзе цяпер стаіць царква, расло агромністае дрэва (ліпа), у цені якога жыў вельмі хворы чалавек. Пухліна не дазваляла яму хадзіць, сядзець, працаваць - адным словам, нармальна жыць. Сваё выратаванне ён бачыў у Богу і горача маліўся аб дапамозе.

Аднойчы на вершаліне дрэва хворы заўважыў вобраз Божай Маці. Яшчэ гарачэй пачаў маліцца, спадзеючыся на заступніцтва і дапамогу Багародзіцы. Напрыканцы яго зямнога жыцця Маці Божая прынесла яму выратаванне.

Месца гэтае ад назвы хваробы – у тутэйшай гаворцы „опухалі" – называецца Пухлы.

Царква ў Пухлах – царква Пакровы Божай Маці.

# Сярэбраная Горка

Непадалёку ад вёскі Чыжы, назва якой утварылася ад прозвішча Чыж (а было гэта яшчэ ў часы паншчыны), пры адной з дарог з Чыжоў да Шчытоў--Дзятлава, стаяла драўляная цэркаўка. Як кажуць найстарэйшыя жыхары Чыжоў, царква гэтая многа стагоддзяў таму пры таямнічых абставінах правалілася пад зямлю, утварыўшы ў гэтым месцы горку, якую і назвалі пазней „Сярэбранай Горкай". Невядома, чаму расступілася пад царквой зямля. Кажуць, з-за людскіх грахоў... Відаць, многа гадоў таму так Бог пакараў чыжавян.

У некаторыя вялікія святы жыхары вёскі ў скрусе і пакоры ідуць на Сярэбраную Горку с хрэсным ходам (працэсіяй), з царкоўнымі харугвамі і іконамі, спяваючы царкоўныя песні, стараючыся такім чынам аказаць гонар гэтаму месцу, быццам жадаючы адпакутаваць за грахі продкаў. У час II сусветнай вайны на Сярэбранай Горцы разыгралася адна з найбольшых на гайнаўшчыне бітваў паміж савецкімі і нямецкімі войскамі. Шмат загінула салдат. Узгорак арасіла кроў. Да сённяшняга дня на Сярэбранай Горцы збіраюцца чыжавяне, каб адслужыць малебен па палеглых - легенда быццам набыла новае значэнне. Аднак аповесць аб царкве пад зямлёй перадаецца з пакалення ў пакаленне, а ў святочныя дні некаторым удаецца пачуць царкоўныя спевы і біццё званоў, якое ідзе з-пад зямлі на Сярэбранай Горцы...

Як кажуць чыжавяне, калісь здараліся цуды, цяпер ужо не...

## Адкуль Тыневічы

А было гэта так. З нараўскага праваслаўнага манастыра шляхам на Бельск і Драгічын выбралася трое манахаў. Спыніліся на ўзгорку сярод лесу, расклалі агонь. Потым ужо пастаянна спыняліся на тым самым месцы. Праз нейкі час гэтыя манахі пабудавалі тут тын – загарадзь з тоўстых бярвенняў, каб абараніць сябе ад драпежных звяроў. Памалу тын разрастаўся, побач пасяліліся мужыкі, людзі пачалі карчаваць лес і займацца земляробствам. У Нарве жыхароў недалёкага тыну пачалі называць тыневічамі. Так засталося да сённяшняга дня. Ад мянушкі жыхароў пачала называцца цэлая вёска.

Цяпер ёсць дзве вёскі Тыневічы – Вялікія і Малыя.

# Аб паўстанні Трывежы

Дзе цяпер Вежанка і Трывежа, даўным-даўно жыў пан. Ён там пабудаваўся і засадзіў гектар саду. Вакол яго замка раслі высокія і вельмі прыгожыя дрэвы. Звалі іх сокаламі. Пан меў пад сваім уладаннем многа гектараў зямлі. Полем яго апекаваўся падпанак... Пан, пад уладаннем якога былі гэтыя землі, не хадзіў па іх, а толькі высылаў свайго падпанка Аніську, а сам з паняй шпацыраваў па сваім парку ды раз-пораз узлазіў на вежу, якая стаяла каля двара, і глядзеў на свае доўгія палі, правяраючы, як працуюць яго сяляне. На гары ў полі стаялі яшчэ тры вежы, на якія ўзлазіў падпанак Аніська...

Надышоў урэшце час, і пан памёр. Застаўся толькі Аніська з дочкамі. Пачаў ён зямлю прадаваць. Народ на гэтае месца з’язджаўся з усіх бакоў. І на гэтай гары, дзе стаялі тры вежы, вырасла вёсачка Трывежа, а ўбок, дзе стаяў панскі замак і дзе была адна вежа, узнікла вёска Вежанка.

## Горка ля Новаберазова

Недалёка ад вёскі Новае Беразова знаходзіцца невялічкая горка, на якой зараз расце малады густы лес. Вакол гэтай горкі знаходзяцца пясчаныя палі гаспадароў. Дзялянкі некаторых з іх праходзяць праз гэту горку, і гаспадары незадаволены, што не могуць пасеяць там ні грэчкі, ні жыта.

Раней, як гавораць, „за памяць іх дзядоў", тут горкі не было. На гэтым месцы стаяла вельмі прыгожая і багатая царква. Прыходзілі сюды людзі і з суседніх, і з далёкіх вёсак. Яна не была звычайнай. У гэтай царкве часам былі цуды. Калі прыйдзе вялікае свята, то збярэцца столькі народу, што поўная царква і нават вакол царквы. А папы выходзяць благаслявіць народ.

Аднойчы было так. Адзін чалавек вельмі доўга хварэў і быў ужо пры смерці. Людзі яго прывезлі да царквы, дзе папы яго аздаравілі.

Так ішла слава аб цудзе-царкве. Людзі прыносілі сюды багатыя дары і складалі іх на царкву. Не падабалася гэта адным зладзеям, якія рашылі дабрацца да храма і забраць усё багацце.

Аднойчы на вялікае свята, калі людзі прынеслі многа дароў да царквы, зладзеі рашылі выкрасці ўсё менавіта ў тую ноч. Было іх трое. Яны былі вядомымі на ўсю ваколіцу. Ноччу ўзялі жалезны лом, каб аглушыць вартаўніка, і пайшлі. Ціхенька падкраліся да царквы, аглушылі варту, узялі ключы і ўвайшлі ўсярэдзіну. Пачалі яны браць святыя чашы з золата і другія вельмі каштоўныя рэчы. Калі пачалі выходзіць, царква правалілася, і яны разам з ёю. Потым на гэтым месцы паўстала горка.

Людзі казалі: калі пойдзеш туды ноччу, то чуваць, як злодзеі енчаць. Але я таго не чуў, хоць хадзіў некалькі разоў паслухаць.

# Анямелы звон

Як яно было, сёння ўжо немагчыма да праўды дайсці. Старыя насельнікі Курашава – колішняга сяла белавежскіх асочнікаў – успамінаюць пра тое здарэнне, калі ўдарыць звон у тамтэйшай цэркаўцы.

Ехаў аднойчы праз сяло нейкі заможны пан і надта ж упадабаў сабе гэтую мясціну. Загадаў фурману затрымаць коней, сышоў з карэты і стаў шпацыраваць туды - сюды па вясковай вуліцы. Захапляўся ён як ветлівасцю тамтэйшых сялян, якія схіляліся перад ім у нізкіх паклонах, так і прыстойнасцю іхніх хацінаў, што патаналі ў зелені. Узрушылася яго сэрца, і вырашыў ён чым-небудзь адзначыць свой побыт. Было тое ў нядзелю, а мо ў іншы святочны дзень. Людзі спяшаліся ў царкву, што за вёскай на пагорку красавалася. Аднак звону не было чуваць, а даходзіў адтуль бразгат нейкага жалезіва. Тады і з’явілася ў пана жаданне падараваць вёсцы праўдзівы гучны звон.

Па загаду пана звон той недзе ў далёкай краіне самыя славутыя ліцейшчыкі рыхтавалі з вельмі дарагіх металаў. Везлі яго на вялікіх санях надта ж доўга - ад Калядаў да самага Вялікадня. Урэшце звон паднялі на новую, спецыяльна дзеля гэтага ўзведзеную, званіцу. Святар урачыста пасвяціў яго ў прысутнасці ўсяго прыходу. Стары званар, ахінуўшы сябе тройчы знакам крыжа святога, дрыжачай рукою пусціў у рух сэрца звана, і той азваўся такім чароўным голасам, што сабраныя людзі аж застылі ад уражання, бо нідзе і ніколі не чулі такога звонавага грання.

З таго часу звон радасным спевам апавяшчаў святы і вяселлі, журботным стогнам праводзіў нябожчыкаў, а трывожным крыкам склікаў людзей на пажар. І так палюбілі яго парафіяне, што і старыя, і малыя спынялі свае заняткі, калі толькі чулі спеўны звон. Неаднойчы бывала, што за дваццаць вёрст чулі яго курашаўцы, сярод іншых званоў голас ягоны вылучалі і шчыра ім ганарыліся.

Жыхары ж іншых сёл не на жарт зайздросцілі ім. Але аж лопала ад зайздрасці адна з далёкіх вёсак, што ля самай ракі Нарвы знаходзілася. Яе жыхары захацелі любой цаной здабыць гэты незвычайны звон.

Дакладна невядома, як тое было: ці то яны падкупілі царкоўнага вартаўніка, ці мо праніклі ў царквупад покрывам снежнай завейкі. Але так ці інакш, нікім не прыкмечаныя, звон укралі. З вялікай паспешлівасцю ўхопленае ў сваю вёску перавезлі ды ўпотайку на званіцу ўцягнулі. Каб кража не была заўважана, загадалі званару аж да Вялікадня не толькі ва ўкрадзены звон не званіць, але нават нікому не паказваць. А каб адхіліць падазрэнні, распусцілі пагалоску, што заказалі выдатны звон за вялікія грошы.

Курашаўцы тым часам, пачуўшы вестку аб сваёй страце, ва ўсе бакі разбегліся, але на след зніклага звону не трапілі. Вялікі сум іх агарнуў, а стары званар на вачах усяе парафіі горкімі слязьмі плакаў.

І вось настаў Вялікдзень. Вакол званіцы, на якой крадзены звон вісеў, сабраўся ўвесь тамашні прыход. Кожны ж хацеў не толькі зблізку пачуць, але і сваімі вачыма пабачыць новы звон. Як толькі закончылася святочнае набажэнства, усе пахрыстосаваліся і бацюшка з дзяканам падаліся ў свае дамы, а званар падняўся на званіцу, расхіліў аканіцы, і ўсе ў захапленні пазіралі на незвычайны набытак. Званар ухапіўся за прыцягу і з усяе моцы пацягнуў яе – сэрца з імпэтам ударыла ў ззяючае пазалотай поле звана. Аднак замест чароўнага грання ці спеву сабраныя пачулі глухі стогн. Усе анямелі ад уражання. Званар яшчэ некалькі разоў спрабаваў дабыць са звону голас, але, апрача глухога хрыпу, нічога не было чуваць.

Людзі, панурыўшыся, разбрыліся па сваіх хатах, і свята ім было зусім не ў свята. Усе губляліся ў здагадках, калі ў зване паявілася трэшчына: ці пры паспешлівым сцягванні са званіцы і перавозе, ці мо ён сам па сабе трэснуў, каб спеўным граннем не цешыць злодзеяў? І хаця тыя са скуры вылузваліся, каб скрыць ганьбу, усё ж звестка пра анямелы звон хутка дайшла і да Курашава.

Ранейшыя гаспадары пачалі дабівацца свайго права. Злачынцам замест мілагучнага грання звону пачаў па начах сніцца скрыгат турэмных замкоў ды звон катаржных кандалоў. Таму ўпотайку яны сцягнулі са званіцы звон ды ўкінулі яго ў самы глыбокі вір у Нарве. Разышлася цяжкая хваля па рацэ, звон глыбока ў бяздонне зарыўся, і след па ім загінуў.

Засталася толькі легенда, што на першы дзень Вялікадня, калі над веснавым разводдзем Нарвы ўзыйдзе святочнае сонейка, тады чуваць чароўнае гранне казачнага звону, які чалавечая зайздрасць і злачынства загубілі.

# Схаваны скарб

Восенню 1655 г. у Нарві стаяла татарская арда. Татары падтрымлівалі караля Казіміра і ахоўвалі землі аж па Ялавецкае староства. Як сведчыць легенда, у 1660 годзе на гэтыя землі напалі шведскія войскі, якія, кіруючыся ўглыб краю, рабавалі гаспадаркі, палілі вёскі і гарады. Пакуль татары збіралі каралеўскую даніну з падкантрольных раёнаў, шведы спалілі Ялоўку і навакольныя вёскі. Раз'юшаныя татары зрабілі засаду на тракце ў напрамку Бандароў, чакалі на шведскія аддзелы, якія ішлі ў тым накірунку з нарабаваным дабром. Татары мелі перавагу, бо зналі наваколле. А была гэта глухая пушча. Татарская арда не пашкадавала нікога, учыніла шведам страшную разню. Аднак шведы паспелі закапаць найбольш каштоўныя рэчы недзе ва ўрочышчы, якое пазней назвалі шведскімі могілкамі. У гэтым месцы і праўда захаваліся тры шведскія магілы. Адну можна ўбачыць і цяпер, іншыя былі раскапаны – жыхары навакольных вёсак шукалі скарбаў.

Ёсць сціплыя звесткі, што ў 1939 г., перад самай II сусветнай вайной, скарб быў знойдзены ва ўрочышчы недзе ля вёскі Багнюкі. Падрабязнасці гэтай падзеі згубіліся ў часе, і розныя людзі гавораць аб гэтым па-рознаму.

Адно пэўна, што ў гэтым месцы блукаюць душы загінуўшых шведскіх салдат, чуюцца енкі, іржанне коней і водгукі падаючых цел. Вечаровай парой жыхары стараюцца абмінаць гэтае месца, нават калі трэба ісці даўжэйшай дарогай.

Пра гэту гісторыю гавораць і архіўныя матэрыялы, але апісаныя падзеі пацвярджаюцца толькі часткова.

# Прыгожая Кінга

Даўней, як панавалі каралі, у ваколіцах Нарвы, дзе цяпер цвітуць палі і сады, былі дрымучыя лясы. Высокія магутныя дрэвы гаманілі з нябёсамі, з сонцам, з месяцам. У такім лесе і днём і ноччу было цёмна. Светлыя сонечныя праменні не маглі прабіцца праз спляценне галінак ды маленькіх лясных раслін. У лесе вадзілася многа розных звяроў і птушак. Рыкалі мядзведзі, вылі ваўкі, крычалі птушкі – і ўсё гэта злівалася ў адзіны магутны голас, ад якога ўвесь лес дрыжаў, дрэвы хісталіся.

Праз лес працякала вялікая вірлівая рака Нарва. Яна бегла хутка, ірвучы берагі. Старыя дубы валіліся ў раку і разам з ёю плылі далёка-далёка.

У тым месцы, дзе рака ўлівалася ў другую раку, лес быў радзейшы, а за лесам цягнуліся зялёныя палі, сады і агароды, пасярод якіх на беразе Нарвы стаяў прыгожы палац каралевы Кінгі. У садах спявалі птушкі.

Каралева Кінга цэлымі днямі бывала ў садзе, у лесе, збірала грыбы і ягады.

Зусім рана, калі сонейка яшчэ не ўзышло, калі раса пакрывала расліны, выйдзе каралева Кінга з кошыкам у руцэ ў лес. Распусціць свае доўгія прыгожыя косы, сядзе на пянёк і слухае, як спяваюць птушкі. Яна не толькі цешылася спевам, але любіла і саміх птушак. Прыносіла ім яду - пшаніцу, авёс. І птушкі таксама любілі сваю каралеву, лятаі ўслед за ёю. Сядзе яна пад яблыняй – і яны тут, сядзе на лавачцы – і яны побач. І ўсё пяюць і пяюць. А спеў іх нясецца далёка-далёка.

Бывала, сяляне, якія працавалі ў двары, спыняцца, здымуць шапкі ды прыслухоўваюцца да той чароўнай музыкі. І так лёгка робіцца на душы!

Аднаго разу, калі каралева выйшла ў сад, затрэслася зямля - раз, другі, трэці. Вакол пацямнела, і палац разам з усім праваліўся пад зямлю. На тым месцы засталася толькі невялікая горка...

Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы

Але каралева Кінга не забывала сваіх дарагіх птушак. Апоўначы яна выходзіла з зямлі, распальвала агонь і садзілася на камень. Праязджаючы, побач людзі бачылі, як свяціўся агеньчык на гары, але баяліся туды ісці. А каралева Кінга кожную ноч выходзіла на гару. Яна чакала, каб які чалавек прыйшоў да яе і нарваў ёй букет кветак.

Аднойчы паўз горку на кані праязджаў стары разбойнік са сваім здабыткам. Раптам убачыў ён агеньчык на гары і падумаў, што гэта кавалак золата так свеціць. Пайшоў туды. На самым версе гары, на камяні, сядзела красуня-дзяўчына. Гэта і была каралева Кінга. Яе прыгожыя ільняныя валасы дакраналіся да самай зямлі, чорныя вочы свяцілі, як дзве зорачкі, а чырвоныя шчокі палалі агнём. Перад ёю стаяў адкрыты куфар, поўны золата. Брала яна гэтае золата ў жменю, паднімала руку ўгору і сыпала ізноў у куфар. А здалёк здавалася, што гарыць агонь. Стары разбойнік падышоў бліжэй да каралевы, але не мог вымавіць ні слова.

Кінга павярнулася да яго і ласкава сказала:

– Ідзі, добры чалавек, нарві кветак і прынясі іх мне, а я табе аддам усё золата.

У той момант стары разбойнік, як дзікі звер, кінуўся з нажом на каралеву.

Але што за дзіва? На месцы, дзе сядзела Кінга, нікога не было. Разбойнік махнуў нажом у паветры. Ізноў дзіва! Дзе стаяў разбойнік, ляжаў вялікі камень. Гэты камень і зараз ляжыць на гары.

# Войшыкі

Калісьці пры дарозе з вёскі Войшыкі ў вёску Заячкі стаяла векавая ліпа. Вяршаліна старадрэвіны даўно засохла, а ніжнія галіны кожную вясну кучаравіліся маладзенькай лістотай.

Людзі расказваюць, што ў даўніну тут сышліся ў зацятай бітве войскі. Біліся не на жыццё, а на смерць. Убачыўшы, што яго войска пабегла пад варожым націскам, генерал схапіў паўнюткі куфар золата, прызначанага на аплату салдацкай службы, і закапаў непадалёку ад ліпы.

Шмат салдат загінула ў той крывавай бітве. Сёння іх косці ляжаць побач з касцямі непрыяцеляў на старых могілках ва ўрочышчы Прыстань, што ля ракі Нарва. Яшчэ больш салдат трапіла ў палон і разам з генералам пайшло ў чужацкую няволю.

Мінулі гады. Тутэйшыя людзі не раз адпачывалі ў летнюю спякоту пад разлапістай прыгажуняй-ліпай, што расла на пагорку ля дарогі. І каб не генерал, які дажыў на чужыне да глыбокай старасці, ніхто б не даведаўся пра закапаны скарб. Перад смерцю генерал пакінуў завяшчанне, дзе ўспомніў пра куфар з золатам. Нават удакладніў, што закапаны ён там, дзе сягае цень ад прыдарожнай ліпы.

Генералавы спадчыннікі імгненна прыляцелі на месца колішняй бітвы. Адразу пачалі шукаць скарб. Якраз была раніца, і цень ад старога дрэва сягаў вельмі далёка. Вывернулі яміну ў чалавечы рост, а там нічагуткі няма. Сонца тым часам паднялося вышэй, і цень перасунуўся на іншае месца. Давай яны ізноў завіхацца з рыдлёўкамі. Не паспелі і па калена выкапаць, як цень перабраўся на новае месца...

Капалі спадчыннікі зямлю раніцай, капалі ў поўдзень і ўвечары, а цень кожны раз паказваў на новае месца. Капалі яны тыдзень, капалі месяц, а ніяк

не маглі натрапіць на скарб. І толькі тады, калі ад стомы ледзь валачылі ногі, уцямілі: ніколі не знайсці ім скарб, бо ў завяшчанні не сказана, у якую пару года і ў які час дня ён быў закапаны.

Сёння цень нікога не спакушае дакапацца да залатога скарба. Ад старасці ліпа зусім засохла і звалілася – не вядома нават, дзе яна расла.

# Грай, грай, грачу

Гэтай легенды, магчыма, і не было б, калі б колішні музыка-скрыпач з Войшкаў на развітанне з маладой парай не асушыў лішняй кварты. Вяселле гулялі ў карчме, што некалі стаяла на левым беразе ракі Нарвы, непадалёку затокі Калінаўка, якраз у тым самым месцы, дзе цяпер красуецца заезны дом „Заглоба". І падаўся тады скрыпач знаёмаю дарогаю праз усе тры масты цераз Нарву ў сваё сяло.

Ідзе-брыдзе ён так сабе: то спявае крыху, то па струнах смыкам урэжа – лёгка на сэрцы чалавеку, што і куды! Але ж адкуль ні вазьміся – на гасцінцы ладны паніч, перапыняе ён скрыпача ды і кажа:

– Надта ж увішна ў цябе смык па струнах гуляе, чалавеча. Зайграй і для мяне што-небудзь.

А той і прасіць доўга не даўся: як урэзаў польку-трасуху, то не толькі ў паніча ногі самі захадзілі, бы ў жарэбчыка на прывязі, але нават зоркі на чорным небе заскакалі ды ў розныя Вужы і Курачкі збягацца пачалі. Тут паніч і стаў прасіць:

– Граеш ты хвацка. Цаны тваёй ігры няма. Пайграеш нам у палацы на балі – чыстым золатам абсыплем.

Згалеламу войшкаўцу такога двойчы паўтараць не трэба было. Паніч размашыста пакрочыў некуды, а музыка следам за ім подбежкам падрыпаў.

Прыходзяць яны ў шыкоўны палац. Поўна там стройных панічаў ды разадзетых паненак прыгожых, а ўсё навокал аж зіхаціць ад крышталяў ды мармураў. Як толькі ў палацы ўбачылі музыку, паненкі адразу пасадзілі яго на самае ганаровае месца, а панічы падскокваюць ды кожны залатую папяросніцу яму пад нос тыцкае і пахучымі цыгаркамі частуе.

Курыць войшкавец дарагія цыгаркі ды такія вальчыкі і кадрылі смыкам са струн высцёбвае, што аж свечкі ў срэбных кандэлябрах вянуць. Панічы ж тыя з паненкамі, як віхор у лютаўскую завейку, у няспынным карагодзе круцяцца.

Граў так музыка, граў ды і прытаміўся. А як прытаміўся, то і падумаў: „Да танцаў то яны ўсе ахвочыя, але як жа ж з абяцанаю платаю будзе?" Падумаўшы так, спыніў сваё гранне.

Падбеглі да яго паненкі і панічы і давай упрошваць:

– Грай, шаноўны, грай! Ты так дзіўна граеш, што ў нас ногі проста самі ходзяць... Грай!.. А музыка ім на тое:

– Маё гранне вы, напэўна, пачулі і нават натанцаваліся дасыта, а я вашых грошыкаў на вочы не бачыў і ў руках сваіх не трымаў.

Зняў ён шапку і перад сабою на падлогу паклаў.

Падскочылі тут да яго распаленыя танцамі панічы, выхопліваюць са сваіх кішэняў кашалькі, сыплюць, не лічачы, залатыя чырвонцы ў музыкаву шапку ды просяць:

– Грай! Грай! Грай жа!..

Зарадаваўся войшкавец, такое багацце каля сваіх ног бачачы. Схапіў ён скрыпку ды смык і зноў хацеў урэзаць тую шалёную польку-трасуху. Ажно чуе – недзе певень закукарэкаў.

На той голас усё тут зашумела-загуло. Зніклі панічы з паненкамі. Расплыўся, бы ранішні туман, палац. Глядзіць скрыпач: сядзіць ён на купіне пасярод самай топкай багны, што непадалёк Нарвы прасціраецца. Побач у жарале тоне яго шапка. Кінуўся ён да яе, каб чырвонцы ратаваць, а там замест золата – поўна іржавай балотнай вады. Тут і хмель у яго з галавы выскачыў. Глянуў ён сумным вокам на дрыгву ды і давай хутчэй з яе выбірацца. Чаго добрага, яшчэ людзі ўбачаць, куды яго нячыстая сіла завалакла.

# Як паўстала вёска Хітра

Жыў калісь вельмі хітры чалавек. Быў ён млынаром. Млын яго стаяў у прыгожым лесе на беразе вялікай ракі. Млынар быў вельмі спрытны, прагны і да таго ж страшна скупы. Увесь час ашукваў людзей. Кожнаму аддаваў мукі намнога менш, чым належала за прывезенае збожжа. Не любілі яго людзі, але не мелі выйсця, бо гэта быў адзіны млын у ваколіцы.

Аднойчы млынар упіўся. Ідучы дамоў з карчмы, зваліўся з маста ў раку і ўтапіўся. Не вельмі смуткавалі над стратай мясцовыя жыхары, бо бачыўся ім на гэтай пасадзе чалавек сумленны і пачцівы. Вёску, у якой стаяў млын, назвалі Хітра.

У гонар млынара? Хутчэй, як перасцярогу для яго паслядоўнікаў

Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы

Некалі ў Ваневе расхадзілася такая жудасная пошасць, што не было тае хаты, каб не ляжалі покатам нябожчыкі. Як дачуліся пра такое тадышнія ўлады, адразу войску загадалі акружыць сяло. Уваходзіць туды і ўязджаць дазвалялі, але адтуль ніводнае жывое душы не выпускалі. Калі нехта з ванеўцаў спрабаваў вышмыгнуць праз шчыльны кардон, таго не абмінала смяротная стралецкая куля. І няма чаго дзівавацца; у тыя часы ніякіх лякарстваў ад пошасці не было, гэта быў адзіны спосаб затрымаць яе пашырэнне па ўсёй краіне. Ванева ўмірала і закопвала само сябе на пагорку за сялом.

Калі пошасць заціхла, у вёсцы засталася такая малеч людзей, што не было каму дагледзець магілы на пагорку. Хутка загусцеў там бярэзнік і сталі людзі зваць паморкавыя могілкі Бярэзінай.

Міналі гады, і па магілах нават следу не засталося. Там лес лесам пайшоў – сярод бяроз нават хваіна закучаравілася. І выбілася з яе ладная хвоя. Расла яна проста на вачах: гонкая і гладкая, на камлі яе ні сучочка, ні трэшчынкі. Хто ні ідзе, хто ні едзе - зблізку ці здалёку - кожны яе красою залюбуецца ды пра тых, што пад яе карэннямі спачываюць, успомніць і памяне.

Але ж нагледзеў гэтае дзівоснае дрэва адзін ванеўскі музыка. «З такога камля, маўляў, скрыпка адмысловая выйдзе»,– і сабраўся ссячы хвою. Суседзі яму на тое: «Не чапай, гэта ж яна на паморкавых могілках такая выгналася. Глядзі, яшчэ ліхое разбудзіш!..» Але музыка не зважаў на людскія ўгаворы. Зрубаў ён хвою, парэзаў яе на дошкі і з самых лепшых змайстраваў сабе скрыпку.

Інструмент выйшаў на славу. Даволі было смыкам крануць струны, як скрыпка не тое што іграла, але проста залівалася пявучым голасам. І, бывала, увесну ці ўлетку выйдзе святочным надвячоркам музыка на падворак, сядзе на прызбе і як пацягне смыкам – усё сяло да яго збяжыцца. І не тое, каб адно маладых цягнула паслухаць дзіўнае гранне, але нават старыя злазілі з печаў

і лаваў ды, абапіраючыся на рагуліну, паўзлі паслухаць тую музыку. І чым болей людзей навокал скрыпача збіралася, тым чароўнейшыя мелодыі з-пад смыка ліліся. А як услухаюцца ў іх людзі, то не столькі спевы з іх явяцца, колькі роспачнае галашэнне па нябожчыку. І ўспомняцца тады кожнаму памерлыя: дзяды, бацькі, браты, сёстры, дзеці і іншыя родзічы. Задумаюцца людзі над сваёй доляй горкай, над кароткацечным жыццём чалавечым, і самі слёзы на вочы набягаюць. І так ужо павялося: жаласліва грае скрыпка, а вакол яе наўзрыд плачуць людзі.

Доўга граў так той музыка. І абрыдла яму ўвесь час толькі людскія слёзы бачыць ды пахавальныя галашэнні слухаць. Узяўся ён весялейшыя мелодыі іграць. Але як толькі наважыцца музыка жвавую кадрылю ўрэзаць ці хвацкую польку закаціць, скрыпка раптам глохне або струны пад смыком, быццам павуцінне, рвуцца. І аднойчы, калі ён так вясёлую мелодыю зайграць намагаўся, а са скрыпкі ўсё сумнае гранне чутно было, узлаваўся ён не на жарт ды як шпарне інструментам аб вугал хаты, аж чалавечы натоўп войкнуў. Енкнула тая скрыпка і рассыпалася на драбнюсенькія трэскі.

Глянуў музыка на разбітую скрыпку, і яму шкада стала яе. Нагнуўся ён пазбіраць параскіданыя абломкі, ажно чуе, што рукі непаслухмянымі становяцца. Глянуў – яны быццам сухія голькі ад той хвоі! Так і застаўся музыка назаўсёды бязрукім.

У Бярэзіне на Ваневе ніколі больш такая нязвыклая хвоя не вырасла.

Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы

# Смаляны чорт

Калісьці ў лесе каля Пагарэльцаў з’явіўся смаляны чорт. Відаць, атрымаў загад збіраць у пекла смалу і пільнаваць, каб яе менш даставалася тутэйшым смалярам. Кажуць, даўней смаляры рабілі ўсё, каб улагодзіць чорта, і тады ён часам нават пасабляў у нялёгкай смалярскай рабоце. Толькі крый Божа сказаць, што можна абысціся без чорта! Не знаеш пасля, за што рукі зачапіць.

Аднойчы смаляр з Пагарэльцаў, каб дабрацца да смалянога кораня, доўга падкопваў старую хвойку. Нарэшце падкапаўся як след і паваліў старадрэвіну. Вядома, стаміўся. Прысеў пакурыць. Ажно бачыць – нейкі чалавек ідзе. Смаляр прызнаў у ім пасечніка з суседняй вёскі. Пасечнік спыніўся, паглядзеў на вялізны выварацень і кажа:

– Хапіла чорту работы, пакуль такі корч на белы свет вываліў!

– Мне чорт не памагаты! – засмяяўся смаляр. – Я з Богам у згодзе жыву.

І толькі сказаў так смаляр – закалаціўся пасечнік, быццам ліхаманка яго затрэсла.

– А што далей з карчом будзеш рабіць? – спытаўся ён у смаляра.

– Адрэжу сёння корань ад пня, а заўтра пакалю на лучыну...

– А калоду куды падзенеш? – усё дапытваецца пасечнік. – Не пакідаць жа яе караедам...

– Не пакіну, на дошкі парэжу...

– Паслухай, браце, лепш мяне,– давай раіць смаляру пасечнік. – Зрабі ты з калоды вулей. Сённяшні дзень вельмі спрыяе на пчолкі. Потым, калі рой прыляціць, дзякуй мне скажаш...

Падумаў-падумаў смаляр, а чаму і праўда не паласавацца сваім мядком? Мёд – не смала, кожны да яго ахвотнік. І калі пасечнік развітаўся, смаляр узяўся дзяўбці калоду пад вулей. Нават корань забыўся адрэзаць – так захапіўся работай. Калі вулей быў амаль гатовы, раптам пачуўся моцны трэск. Ад стара-

дрэвіны адлупілася даўжэзная шчэпка, папсавала ўсю работу, а пень разам з коранем падняўся і кульнуўся назад у яміну, адкуль яго ледзьве вывернуў смаляр. Ды яшчэ глыбей у зямлю закапаўся. А ўсё ад таго, што смаляр забыўся распалавініць галоўны, стырчавы корань. Калі гэта не зрабіць, дык смаляны чорт абавязкова нашкодзіць – яшчэ мацней закапае выварацень. Смаляр ведаў пра чортавы выбрыкі, але сёння быццам насланнё яго ачмурыла.

– Пасечнік ва ўсім вінаваты! – раззлаваўся ён на пчаляра. – Усё было б добра, каб не падказаў мне вулей рабіць...

І пабег у суседнюю вёску. Пасечнік якраз дома быў - вячэраў.

– Ах ты, сякі-такі! – напусціўся на яго смаляр. – Паслухаў цябе, дык цэлы дзень змарнаваў. І вулей не выдзеўб, і пень з коранем назад у зямлю зваліўся.

– Адчапіся ад мяне! – замахаў рукамі пасечнік. – Я сёння ў лес не хадзіў. Не верыш, дык у людзей папытайся.

Успомніў смаляр, як пасечнік закалаціўся, пачуўшы Божае імя, і адразу пра ўсё здагадаўся. Не абышлася гэтая прыгода без пярэваратня – смалянога чорта.

# Савіны Груд – Паедынакі

Недалёка ад Гайнаўкі, каля 2 км на поўнач, знаходзіцца вёсачка з дзіўнай назвай Sawiny Gród (Савіны Град). Абмінем незразумелае для многіх слова „Савіны", зацікавімся другой часткай назвы – град. Яна гаворыць аб тым, што калісь тут была крэпасць - месца абароны. На самой справе гэта проста паланізаваная беларуская назва – Савін Груд. Савін – значыць, належаў да мужчыны з імем Саўка, Сава, а „груд" – узгорак, узвышша. Вёска і сапраўды стаіць на ўзвышшы. Калі гэтую назву перакласці на польскую мову, то гэта быў бы Wzgórek Sawy – Узгорак Савы.

Але мясцовыя жыхары, асабліва старэйшыя, з даўніх часоў называюць вёску інакш: Паедынакі альбо Пойдэнакі. Гэтая назва мае сваю легенду.

Адзін панскі халоп, якога звалі Сава, збег ад пана і схаваўся ў лесе – на пагорку сярод багны. Пабудаваў хату. Жыў вольна, гаспадарыў сам-адзін. Месца гэтае назвалі Паедынакі. Паўстала тут вёска. Праз яе заходні край з поўдня на поўнач ідзе прамая дарога, якую называюць „трыбок", значыць малы трыб, паўтрыбак. Напэўна, калісь гэта была лясная прасека – трыба. След застаўся ў назве дарогі, цяпер ужо палявой. Дамы ў вёсцы стаяць уздоўж вуліцы, перпендыкулярнай да „трыбка", альбо згодна з напрамкам усходне-заходняй прасекі. Так і ёсць насамрэч.

Працягам вясковай вуліцы на даўжыні каля кіламетра з'яўляецца палявая дарога, якая ідзе да лесу і там становіцца Паедынацкай трыбай. У Белавежскай Пушчы ёсць шмат трыбаў (прасек), якія носяць назву мясцовасці, з якой пачынаюцца Гайнаўская, Ліпінская, Пасталоўская.

Перайначваючы слова „hrud" (груд) на „gród" (град), адабралі сэнс і іншым назвам на нашай тэрыторыі, напрыклад Juszków Gród (Juszkau Hrud) – Юшкаў Град.

Прыгожыя, шмат гаворачыя аб былым, назвы мясцовасцяў зменены загадам на абсалютна абстрактныя, нават смешныя. Так, ідучы на поўнач уздоўж краю Пушчы ад Гайнаўкі і Паедынакаў, Казіміры заменены на Скрыплёва, Ясі і Лукашы на Сарочую Ножку (!), Тадэвушы - на Звадзецкія, Аксенціі - на Пшэходы. У назве вёскі Галякова Шыя (Holakowa Szyja) замест „H” уведзена „G” (выйшла Golakowa Szyja). Але мясцовыя і так кажуць Holakowa (прыгожае гучнае „h”!), бо, хутчэй за ўсё, тая „шыя” абазначае нейкі доўгі крывы абшар (поплаў або поле), які належаў да нейкага Голі (Holi), альбо Holaka – напэўна, не да Goli.

Засталася не змененым Пасталова – напэўна ад „пастол” – лапаць, плецены з лыка ходак.

# Чаму Буды

Пачатак Будаў сягае да часоў Уладзіслава Ягайлы. На адной з палян Белавежскай пушчы пасялілі трох смаляроў, абавязкам якіх было выпальваць вугаль, вырабляць паташ, гнаць дзёгаць і вазіць усё гэта на патрэбы каралеўскага двара.

Доўга смаляры жылі ў першабытных умовах. Будавалі сабе зямлянкі або нейкія шалашы, прымітыўныя драўляныя будыначкі – не дамы, а буды.

Паводле другой версіі, паходжанне назвы вёскі звязана з будамі, якія былі месцам працы. Таму зразумела, што смаляроў у пушчы дагэтуль называюць буднікамі.

# Прыгожая дуброва

У Белавежскай пушчы ёсць урочышча, якое мясцовыя людзі называюць Прыгожая дуброва. Вось як узнікла гэтая назва.

У даўнія часы тут жыў адзін пастушок. Адкуль, з якой сям'і ён паходзіў – ніхто не ведаў. Наймаўся хлопчык пасвіць каровы. Спыняўся ў заможных гаспадароў, якія плацілі яму хлебам і адзеннем. Міналі гады. Вырас пастушок у ладнага дзецюка. Пачаў хадзіць на вячоркі. У скокі з дзяўчатамі не пускаўся, затое вельмі любіў слухаць байкі пра заклятыя і разбойніцкія скарбы. Надта ж хацелася маладому пастуху стаць багатым.

Аднойчы хтосьці падказаў яму, што разбагацець можна ў купальскую ноч, калі зацвітае папараць-кветка. Засела ў хлопцавай галаве гэтая падказка. Дзень і ноч ён думаў пра дзівосную папараць-кветку.

Ажно гаспадары пачалі наракаць, бо каровы штодня ўбіваліся ў шкоду.

„Як разбагацею,– суцяшаў сябе пастух,– дык адразу з усімі разлічуся...”

Людзі пасмейваліся з дзівака, ніхто з іх не верыў, што папараць сапраўды цвіце. А пастух усё роўна з раніцы і да вечара шукаў па лясных нетрах самы прыгожы папаратнік. І аднаго дня знайшоў-такі незвычайны папаратнікавы куст. Высокі, у чалавечы рост, з вялізнымі разлапістымі лістамі, што звісалі ўніз, быццам казачны зялёны вэлюм. Доўга, як зачараваны, стаяў пастух каля папаратніка. Апамятаўся – ужо хаваецца сонца. І тут ён успомніў, што сёння якраз купальская ноч.

Загнаў дзяцюк статак у вёску, а сам хуценька папраставаў назад у лес. Спяшаецца – ажно спатыкаецца. Не бачыць, што следам за ім увязаўся ляснік, які ў хлопцавай спешцы ўбачыў штосьці нядобрае. Няйнакш на звярыну пасткі паставіў!

Прыбег пастух да вялізнага папаратніка, прысеў непадалёку за вываратнем і чакае. Не ведае, што з другога боку вываратня прытаіўся ляснік са стрэльбай у руках.

Сядзеў-сядзеў хлопец, а потым давай ціхенька насвістваць. Раптам чуе – хтосьці адказвае. Здзіўлены пастух падумаў, што яму прымроілася. А ляснік тым часам яшчэ мацней сціснуў у руках стрэльбу: няйнакш пастух з кімсьці змовіўся! Зноў некалькі разоў свіснуў хлопец – і заняло ў яго дух. З папаратніка паказалася вялізная змяя. Выгнуўшыся на хвасце дугою, яна марудна сунулася да пастуха. Хлопец зусім спалохаўся, але ўбачыў у змяіных лапах паўнюткі гаршочак золата, што ажно зіхацела чырвоным агнём. Дзяцюк падняўся насустрач змяі, каб прыняць ад яе скарб. І тут з-за выратавання грымнуў стрэл... Гэта стрэліў спалоханы ляснік. Выпрасталася змяя на хвасце, абвілася вакол папаратніка, а потым як шугане ў агонь!

Калі агонь апаў, нічагуткі не засталося: ні папаратніка, ні змяі, ні пастуха з леснікам. А каля вываратня праз гады вырасла прыгожая дуброва. Людзі кажуць, што якраз тут рассыпалася багацце, якое змяя несла пастуху.

# Крыштапова

Даўным-даўно ў ваколіцах Белавежы існавала вёска Крыштапова. Дарэмна сёння шукаць яе ў спісах ці на картах.

Спакойна жылося пасяленцам. Хаткі – нізкія, драўляныя, – былі крытыя саламянымі стрэхамі. Працавітыя жыхары ўвіхаліся на сваіх гаспадарках, кармілі скаціну, насілі ваду з калодзежа. Прыгожы лес даваў ім ягады, грыбы, зёлкі, драўніну, мёд. Людзі жылі ў згодзе і спакоі.

Але аднаго дня здарылася непапраўнае. Малады вясковец выбраўся да лесу. Ішоў, нешта ціхенька напяваючы пад нос. Нечакана дагнаў яго мужчына на фурманцы. Незнаёмы запрапанаваў падвезці пешага. Хлопец усеўся на возе, а вазніца і кажа:

– Добры ты чалавек, таму паслухай, што табе скажу. Калі вернешся ў вёску, не пі вады з калодзежа, бо ў сваім мяху вязу заразу і выпусціў трохі тае заразы ў тваёй вёсцы. Калі хочаш жыць, паслухай маёй рады.

Крыштаповец, пачуўшы гэтыя словы, саскочыў з воза, схапіў кій і пачаў ім абхаджваць незнаёмага, а той развязаў свой мех і выпусціў на хлопца рэшткі заразы. Уражаны маладзён пабег у вёску і расказаў пра здарэнне.

Неўзабаве ў вёсцы разгулялася хвароба. Тыя, хто застаўся ў жывых, вырашылі спаліць свае гаспадаркі, каб такім чынам стрымаць распаўсюджванне хваробы. З болем глядзелі людзі на агонь, які нішчыў усё, што нажылі яны і іх продкі.

Пасяліліся крыштапоўцы на новым месцы – на левым беразе рэчкі Нараўкі. Цяпер гэта частка Белавежы – Крыжы.

Белавежская Пушча падзелена на часткі – аддзелы. Граніцамі з’яўляюцца ідэальна прамыя прасекі, якія ідуць з усходу на захад і перпендыкулярна – з поўдня на поўнач. На скрыжаваннях стаяць слупкі з нумарамі аддзелаў. Большасць прасек выкарыстоўваецца ў якасці дарог.

У вёсцы Альхоўка запісана гісторыя аб трагічных наступствах памылкі, зробленай падчас вызначэння прасекі.

Дзве брыгады пад кіраўніцтвам інжынераў вызначалі прасеку: адна ішла з поўдня на поўнач, другая - з поўначы на поўдзень. Абодва адрэзкі павінны былі сыйсціся ў палове дарогі. На жаль, сталася інакш. Адзін з інжынераў памыліўся, брыгады не сустрэліся, адрэзкі пайшлі паралельна на невялікай адлегласці адзін ад аднаго. Што рабіць? Як выправіць памылку? Спалучыць адрэзкі нельга – утвараецца „калена”, паварот, які ў прасецы недапушчальны. Праверылі вылічэнні. Кожны з інжынераў непакоіўся, баяўся за свой аўтарытэт. Калі высветлілася, каторы памыліўся, вінаваты не змог сцярпець ганьбы і застрэліўся. Самасуд учыніў на месцы сваёй памылкі.

У лясніцтве Альхоўка, ў аддзеле нумар 66, ёсць месца, якое называецца „Калена”.

# Валун

Аднойчы жылі-былі два паляўнічыя. Гаспадаркі добрыя мелі, але хлеб толькі ў вялікія святы елі. Вядома ж, хто са стрэльбай па лесе бадзяцца, таму загон мятліцу родзіць. І зайздросныя ж тыя паляўнічыя былі! Яны ніколі разам у пушчу не ўваходзілі, затое з пушчы з пустымі рукамі заўсёды разам вярталіся.

Аднаго дня ім асабліва не шанцавала. Хадзілі яны па лесе, хадзілі ўвесь дзень, але нават ніводзін аблезлы заяц ім дарогу не перабег. Сустрэліся на паляне і рашылі адпачыць. Убачылі пад кашлатай старой елкай вялікі камень і падыйшлі да яго прысесці. Толькі нахіліліся яны да каменя, ажно бачаць: гэта зусім не камень, а вялікая гула золата!

Уцешыліся паляўнічыя, аж ім вочы засвяціліся. Гэта ж падумаць: шчасце якое прываліла! Сталі меркаваць, як тую гулу дамоў завалачы. Думалі-думалі, ды старэйшы і кажа малодшаму:

– Ідзі дахаты, запражы ў воз каня ды хутчэй прыязджай сюды. Пакладзем мы золата на воз, завязём дамоў, а там і падзелімся. Скажы толькі маёй жонцы, каб мне есці прыслала, бо надта ж прагаладаўся я.

Пайшоў малодшы паляунічы дамоў, расказаў аб прыгодзе сваёй жонцы. Тая і кажа:

– Не ідзі ты да яго жонкі і нічога нікому не кажы. Напяку я яму затручаных блінцоў. Ты завязеш іх, узложыце золата на воз, ён паесць маіх блінцоў і памрэ. Усё золата нам дастанецца.

Так яны і зрабілі. Напякла жонка затручаных блінцоў. Загарнуў іх малодшы паляўнічы ў хусцінку, запрог каня і ў пушчу паехаў.

Тым часам старэйшы паляўнічы таксама дарма часу не траціў, на паляне седзячы. Думаў ён ды меркаваў, як бы тут супольніка пазбыцца ды самому

золата заграбастаць. І прыдумаў: прыедзе малодшы паляўнічы, зложаць яны разам золата на воз, малодшы возьме лейцы ў рукі і пойдзе наперадзе, а ён застанецца ззаду і застрэліць яго, а золата сабе забярэ.

Так яно і сталася.

Прыехаў малодшы паляўнічы на паляну і кажа старэйшаму:

– Прывёз я табе грэчневыя бліны, але з'ясі іх, як узвалім на воз золата.

– Добра, – кажа старэйшы паляўнічы.

Узяліся яны за работу. Палажылі золата на воз і рушылі. Малодшы пайшоў перад возам, а старэйшы ззаду. Зрабіў ён так, як раней абмеркаваў: зняў з пляча стрэльбу і застрэліў малодшага паляўнічага. Завалок забітага ў яму, дзе гула золата ляжала, і заваліў яго зямлёй. Узрадаваўся, што яму ўсё так гладка пайшло. Падышоў да воза, знайшоў хусцінку з блінцамі і пачаў іх прагна есці. Праглынуў адзін, другі, трэці блінец ды і ногі выцягнуў.

Стаяў конь з возам да ночы. Калі ж змяркацца пачало, прывалаклася на паляну зграя галодных ваўкоў і каня разарвала. Пасля каня і цела мёртвага старэйшага паляўнічага з'ела.

Доўга яшчэ ляжала тая гула на возе. З часам воз згніў, а гула на зямлю звалілася. Не была яна ўжо золатам, а, гледзячы, як людзі з-за яе адзін другога забіваюць, у звычайны камень абярнулася.

І па сённяшні дзень ляжыць той камень на адной з палян у глыбі Белавежскай пушчы.

# Месца Моцы

Па дарозе з Гайнаўкі ў Белавежу ёсць з’езд ўправа. Трэба пераехаць праз рэйкі, пасля пехатою пайсці направа і праз некалькі хвілін вандроўкі апынешся ў незвычайным месцы.

Легенда сведчыць, што гэта - Месца Моцы – святое месца язычнікаў. Агромністыя валуны, амаль цалкам залеглыя ў зямлю, утвараюць кола. Вакол растуць дзіўныя дубы, разгалінаваныя ад самай зямлі. Кожны з іх мае па пяць-шэсць ствалоў, што растуць з аднаго месца. Можна сабе ўявіць, як некалі збіраліся тут „лясныя людзі”, жыхары пушчы, праводзілі свае рытуалы, маліліся да свайго бога ці багоў. Толькі спачатку ім трэба было „пабудаваць” святыню, прывезці, прыцягнуць альбо прыкаціць аднекуль вялізныя валуны і паставіць іх у адпаведным парадку, які вызначыў, паказаў нейкі шаман, жрэц. Можа, некалі стаяў тут ідал – драўляны, гліняны або нават каменны?

Якія рытуалы праводзілі тут нашыя продкі – невядома. Можам толькі ўяўляць або здагадвацца, супастаўляючы свае здагадкі з вобразамі, вядомымі з гістарычнай ці мастацкай літаратуры.

У адным можам быць упэўнены: месца гэтае для язычніцкай (як мы цяпер можам сцвярджаць) святыні было абрана невыпадкова. Дзейнічаюць тут таямнічыя сілы, нейкія флюіды, выпраменьванне альбо іншыя моцы, якія ідуць з зямлі ці плывуць з космасу. Кажуць, што ўздзейнічаюць яны не толькі пазітыўна. Здараецца, што і наадварот. Ва ўсякім разе, месца гэта таямнічае, цікавае і незвычайнае.

У Белавежскай Пушчы, недалёка ад Гайнаўкі, ёсць месца, якое з векапомных часоў лічыцца цудадзейным, святым, маючым сілу аздараўлення. Гэта Крыначка. Калісь журчаў тут струменьчык Меднае. У гэтым месцы, асвечаным паяўленнем на дрэве іконы Божай Маці, вада мела лекавыя ўласцівасці. Бабка Нюра У. (памерла, бадай, у 1965г.) і Надзея Г. (нарадзілася у 1921г.) з вёскі Навасады расказвалі такую легенду.

З даўніх часоў людзі даведаліся аб пазбаўленні ад розных хвароб пасля купання ў „Крыначцы": да сляпых вяртаўся зрок, да паралізаваных – рухавасць, да людзей з хваробамі скуры – чыстае здаровае цела. Але ніхто не купаўся ў самой крынічцы. Ваду з яе чэрпалі чыстым посудам. Хворыя пілі яе, каб выздаравець, здаровыя – каб захаваць сілы. Мылі твар, асабліва вочы. Мачылі ў ёй белыя хустачкі і кавалачкі тканіны, каб абцерці хворыя месцы. Хустачкі пакідалі на галінках карчоў.

Аднаго разу багатая жанчына („пані") прыехала з сабакам, пакрытым язвамі. Памыла яго непасрэдна ў крынічцы. Так зганьбілася „жывая вада". Невядома, калі гэта сталася. Паводле аповесці, якая захавалася ў адной сям'і ў вёсцы Навасады, у 1847 годзе з крынічкі яшчэ цякла „жывая вада". Гэту сямейную легенду расказала Праскоўя П. (нар. у 1927г.) Яе бабка Яўфімія Вашчанка цудам вылечылася ў Крыначцы, калі там яшчэ не было царквы, а гэта значыць да 1848 года.

Была яна маладой жонкай. Жыла разам з мужам і ягонымі бацькамі ў вёсцы Навасады. Захварэла перад Піліпавым пастом, незадоўга да Раства Хрыстова. Рабілася ўсё слабейшая, ужо і з ложка не ўставала. Кожную нядзелю адведвала яе адна з васьмі сясцёр. Прывозілі пірог і... гарэлку. Хворая толькі гэта магла есці. Прайшоў пост, Раство, Тры Каралі. Маладая жанчына была ўжо настолькі слабая, што пачалі баяцца за яе жыццё. І прыснілася ёй, што

дапамагчы можа мыцце вадой з Крыначкі. Пачала яна прасіць мужа адвезці яе туды. На гэта, аднак, не згаджаўся свёкар, які ў сям'і меў рашаючае слова, бо зіма ў гэтым годзе была выключна марозная і снежная. Але ўрэшце, бачачы трагедыю маладых, згадзіўся. Запрэглі валоў у сані. Хворую захуталі ў кажухі і накрылі пярынаю. Цераз гурбы, у траскучы мароз прыехаў свёкар з нявесткай да святога месца. Крыначка не замёрзла, біла „жывой вадой". Хворая зняла кажух, усю адзежу, нават бялізну. Абмылася хусткай, намочанай у Крыначцы. Апранула чыстую сарочку, старую – „хворую" – пакінула ў лесе. Рушылі дамоў. У вёсцы Ліпіны свёкар мусіў спыніцца і папрасіць у людзей хлеба для хворай нявесткі, бо тая пачула нястрымны апетыт акурат на хлеб. Пакуль даехалі дадому, з'ела вялікі кавалак. Праз некалькі дзён зусім акрыяла. Пасля ўжо ніколі не хварэла. А жыла доўга. Яе праўнучка Праскоўя П. памятае, што прабабка Хімка (памяншэнне ад Яўфіміі) была шчуплай, выпраставанай, хадзіла ў чапцы. У нядзелю апранала прыгожа вышываную сарочку, якую нікому не дазваляла мыць. Бялізну паласкала заўсёды пры калодзежы - нават зімой. Да самай смерці ўсе зубы ў яе былі здаровыя, толькі вельмі з'еліся, зрабіліся маленькія. Захварэла яна толькі за два тыдні да смерці. Памерла ў 1935 годзе, маючы 105 год, а, можа, і больш.

Магіла вылечанай цудам у Крыначцы Яўфіміі Вашчанка знаходзіцца на епархіяльных могілках у Дубінах, у другім радзе ад агароджы злева ад варот.

У 1848 годзе у Крыначцы пабудавалі царкву. Калі знікла крыніца, ніхто не ведае. Цяпер ваду бяруць з калодзежа непадалёку ад царквы. Штогод эпідэміялагічныя службы кантралююць яе і пацвярджаюць прыгоднасць да піцця без гатавання.

З надзеяй на дапамогу да Крыначкі ўвесь час прыходзіць не толькі праваслаўны люд. Пасля трохдзённых вельмі ўрачыстых абходзін так званага „Клечання" – Святой Троіцы – на карчах і агароджы бела ад хустачак.

Некалі адзін бедны чалавек блукаў ад вёскі да вёскі. Быў увесь у шрамах, кульгаў, глядзеў на ўсіх з-пад ілба. Людзі смяяліся з яго, але і баяліся панурага выгляду. Ён таксама стараніўся людзей. Урэшце асеў недзе ў лясной глушы, пабудаваў сабе хатку. Тады аказалася, што ўсім не хапае яго спрытных рук, бо быў ён добрым цесляй і сталярам, умеў лячыць людзей і жывёлу.

Мясцовыя жыхары пачалі захаджваць да ягонай маленькай хаткі, якую называлі „будай”, і ён нікому не адмаўляў – дапамагаў кожнаму. Зноў пачалі запрошваць яго будаваць і рамантаваць дамы. Многаму навучыліся людзі ад гаспадара „будкі”.

Праз нейкі час пачалі сяліцца побач з той „будкай”. Вось ужо і вёска вырасла „пры будцы” – Прыбудкі.

# Чаму наша сяло называецца Скупава

Аднойчы прыйшоў да нас дзед Раманчук. Гэта быў стары чалавек, якому, як казалі людзі, было сто гадоў. Мы, маладыя хлапчукі, абступілі дзеда і сталі пытацца:

– Дзедку, колькі вам год? Сядайце і раскажыце, як то даўней было? Чаму наша сяло называецца Скупава?

Дзедка паставіў сваю кульбачку ў куточку, сеў на лаўку каля стала і стаў гаварыць:

– Дзеткі мае, у мяне за плячыма больш за дзевяноста гадоў. Як сон, прайшло жыццё маё. А мне здаецца, што я толькі ўчора нарадзіўся на свет... Цяжкае маё жыццё, але жыць хочацца. Просіце расказаць вам пра Скупава. Яго так называюць не таму, што тут жывуць скупыя людзі. Даўным-даўно тут быў двор. Стаяў ён на ўзгорку па скоснай дарозе, што ідзе на Сухадолы: паміж Смольным і Бондаравым Кутом. Пад узгоркам біла крыніца, працякала рэчка, быў там рыбны стаў. Двор згарэў. Тады зямлю распрадалі людзям. Вось, можа, таму наша сяло і назвалі Скупава, бо зямлю скуплялі людзі з розных старон... Спярша Скупава было адно, а пасля пажару раздзялілася на Старое і Новае.

Калі тут лес быў высечаны пад поле, таго ніхто не памятае, то было даўным-даўно. Толькі чуў я ад старых людзей, што руская царыца Кацярына падарыла Скупава свайму палкаводцу Сувораву. Ён быў генерал над усімі генераламі і называўся генералісімус.

# Два свінары

Даўно гэта было, памятаюць толькі найстарэйшыя людзі з Буд. Ішлі па дарозе з Гайнаўшчыны на Татаркі і далей да Чуравай Даліны два мужыкі. Апранутыя ў ільняныя штаны і гэткія ж кашулі, крочылі дзёрзкім крокам, не аглядаючыся, уткнуўшы пахмурныя, дзікія вочы ў зямлю перад сабой. Людзі, што збіралі галлё ў лесе, перахрысціўшыся, адыходзілі перапалоханыя. Ад аднаго выгляду чужынцаў станавілася жудасна на душы.

Хоць ясна свяціла майскае сонейка і ўся зямліца спявала і радавалася жыццю, побач са страшнымі вандроўнікамі адразу рабілася неяк на дзіва ціха. Калі-некалі то адзін, то другі з іх кідаў вокам у адзін ці другі бок, і нібы д'ябальская ўсмешка блукала тады па іх тварах. Іх зрок найчасцей падаў на дубы, якіх у тыя часы было яшчэ мноства. Чужынцы зіркалі на наймажнейшыя з велічных раслін.

Мікалай з Ліпін кажа, што перад тым, як выйсці на Тамашову дарогу, зайшлі тыя падарожнікі на двор да яго кума, папрасілі халодненькай вады папіць. Але замест таго, каб піць, паплявалі па тры разы ў калодзеж. Ну, людзі адразу ж калодзеж той закапалі, каб бяды не было. Але на гэтым усё не скончылася, бо паблізу пачалі знаходзіцца розныя дзіўныя рэчы, нікому не патрэбныя. Пакуль была зіма, і снег пакрываў усё наваколле, не відаць было бруду і смецця, але вясной, калі сыходзіў снег, людзі пачыналі наракаць на тое, што рабілася. У хаце Мікалаевага кума пасля адыходу тых вандроўнікаў міскі па хаце лятаць пачалі, сякеры падскоквалі. Стала зразумела, што мужыкі тыя дзіўныя знаюцца-братаюцца з нячыстай сілай. Доўга чакаць не прыйшлося... Ад тае пары хто б ні пайшоў па слядах тых нячысцікаў, сустракаў усюды замест вялікіх дубоў адно пянькі. Нават грыбы там не раслі.

Яшчэ і цяпер кажуць, што часам сустракаюць у пушчы двух мужыкоў, што вельмі шпарка крочаць па дарозе, гледзячы перад сабою, і толькі час ад часу зіркаюць наўкол нядобрым вокам. Кажуць, што лес пасля іх застаецца нібы выпалены, як бы д’ябал сваю пячатку паставіў.

А яшчэ ў гэтых мясцінах бачылі дзіўнага дзіка: свіння – не свіння, нешта малое, круглае, не падобнае на божае стварэнне, з закручаным у колца хвосцікам, чорнае, бы дзёгаць. Бегае гэтая нечысць па пушчы і падскоквае ў сатанінскім танцы. Ад свінні гэтай і назва пайшла – Свіная Гара, бо ў д’ябла ж усё наадварот, і дол гарой называцца можа, і назва - Свінаройскі трыб.

# Ляды

У вёсцы Ляды жыў сляпы чалавек. Быў ён глыбока веруючым, меў мноства святых абразоў (ікон) і вельмі часта маліўся. Лічыў, што малітва – найважнейшае у жыцці. Жыхары дзівіліся, гледзячы на яго, не разумелі, як знайсці столькі часу на маленне, столькі сіл. Іх час паглыналі іншыя зямныя абавязкі.

Аднойчы прысніўся сляпому нязвыклы сон. Прыйшлі да яго ўсе святыя і папрасілі пабудаваць капліцу непадалёку ад вёскі - ля ракі. Святыя параілі, каб прасіў радню, сяброў і знаёмых дапамагчы. Божая Маці наказала пачаць будову каплічкі ў той самы год, бо пазней можа не хапіць сіл. Святыя вызначылі месца для каплічкі і прасілі, каб сляпы асабіста пакіраваў будовай.

Прачнуўшыся, сляпец расказаў пра свой сон і пачаў шукаць людзей на дапамогу. Нягледзячы на сумненні, жадаючыя знайшліся. Праз некалькі месяцаў, у дзень св. Братоў Макавеяў, капліца была асвячана.

Непадалёку ад капліцы працякае рэчка, з якой дагэтуль людзі бяруць лекавую ваду.

Сляпы, які пабудаваў капліцу, стаў відушчым.

# Шастакова

Калі Польшча была ў „разбёры”, у Лядскай Пушчы ўкрываліся партызанскія атрады. Быў там і VI аддзел кавалерыі. Кавалерыстаў называлі „шастакамі”. Пасля паражэння партызан шастакі ўцяклі да багатага землеўладальніка, які схаваў іх. Пяцёра з тых уцекачоў вырашылі застацца і пасяліцца на гэтым месцы. Яны выкупілі надзелы і заснавалі вёску Шастакова.

Другая легенда кажа, што назва вёскі паходзіць ад шасці гаспадароў, якія жылі тут вельмі даўно.

Праз палі у Шастакове і Асаўцы некалі праходзіў царскі тракт. Дарога была выбрукавана вялікімі камянямі. Брук той не ўдалося выараць, таму яго проста засыпалі зямлёй.

Некалі Лядскі Лес сягаў да гміны Чыжы, паўднёвай часткі гміны Нараў і паўночнай часткі гміны Орля, аж да самага Бельска Падляшскага.

Там у раннім сярэднявеччы на тэрыторыі сучаснай гміны Чыжы жыло племя Яцьвягаў. Згодна са сваёй традыцыяй яны спальвалі целы памерлых супляменнікаў у лесе на вялізным камяні, які ляжаў на ўзгорку. Пасля збіралі прах у урны і закопвалі ў зямлю, паблізу таго каменя, на глыбіню амаль 2 метры. Дагэтуль тут выкопваюць урны. Частка племені працівілася гэтаму абраду і пачала кідаць прах у ваду глыбокай крынічкі, што знаходзілася непадалёк ад узгорка. Племя знікла, і традыцыя згасла на многа-многа год. Каля 1840 года аднаму сляпому, вельмі веруючаму чалавеку, які жыў у адлегласці 200 м ад узгорка, прысніўся прарочы сон. Аднойчы ўначы, калі яму споўніўся 21 год, убачыў ён у сне племя Яцьвягаў і іх рытуалы, звязаныя з памерлымі. Таксама ў сне пачуў ён загад, каб збудаваць на пагорку капліцу, пад падлогай якой павінен знаходзіцца сімвалічны камень, а занядбаную крынічку, у якую клалі прах пакойнікаў, перарабіць у калодзеж са святой вадой. Пасля гэтага дзіўнага сну сляпец з дапамогай мясцовых хлопцаў пабудаваў капліцу і калодзеж, гаючая вада якога прыцягвала сотні людзей з наваколля. Як кажа легенда, сляпы таксама стаў відушчым.

Каля 1600 года (альбо раней) у Лядскім Лесе, у 5 км на ўсход ад рытуальнага пагорка, мясцовыя жыхары залажылі могілкі. Бо на старых ужо не было месца для пахавання. Выцесалі каменны крыж, большая частка якога захавалася да нашых дзён. У тыя часы на навакольных абшарах праходзіла шмат войнаў. Усіх забітых хавалі на новых могілках. На вечны спачын леглі тут польскія, турэцкія, украінскія, шведскія і татарскія салдаты. Калі войны скончыліся, людзі засыпалі могілкі пяском, утварыўшы курган. Прайшлі гады, гэтыя падзеі адыйшлі ў небыццё аж да 50-х год мінулага стагоддзя. Мясцовыя

жыхары ў рамках грамадскіх работ пачалі папраўляць дарогу да вёскі Ляды. Пясок для будоўлі бралі са згаданага ўзгорка. З зямлі паказаліся людскія косці, крышталёвыя шклянкі і чаркі.

Назва мясцовасці, як відаць, пайшла ад назвы Лядскага Лесу. Як вынікае з іншых крыніц, назва Ляды пайшла ад слова „ляда” – прыстасаванне для падняцця цяжкіх кавалкаў дрэва, бярвенняў і ўкладання іх на воз. За сваю доўгую гісторыю мясцовасць шмат разоў мяняла назву.

Сталася тое ў ваколіцы, дзе пушча Лядская сутыкаецца з Белавежскай пушчай.

Аднойчы старажытным гасцінцам, што злучае Нараўку з Нарваю, вярталася з кірмашу грамада гаспадароў. Торг у Нараўцы выдаўся ненайгоршы: тое-сёе прадалі, нешта прыкупілі, ну і, вядома, карчму таксама не абмінулі. Таму весялосць то лёгкімі жарцікамі, то дабрадушнымі кепікамі з фурманкі на фурманку пераскоквала. А калі гасцінец у Лядскую пушчу заглыбіўся, хлопцы з такім запалам урэзалі родную песеньку пра ўдалага малайца і яго вернага варанога каня, аж з елак кастрыца пасыпалася. Потым другую, трэцюю – не злічыць жа ўсіх песень, якія ў вясёлай грамадзе ў тых баках спяваюцца.

Вясёлы абоз да гушчавіны пры Бярнацкім Мосце якраз пад’язджаў, калі людзі звочылі, што якісьці пеўнік каля конскіх ног круціцца. Як на яго ні кышкалі, як бічамі ні стралялі, але аніяк ад вазоў адагнаць не маглі.

Адзін з забаўнікаў і кажа:

– Відаць, нехта па дарозе на кірмаш згубіў птушку. Што ж, згаладнела ў лесе дык да людзей ціснецца.

Саскочыў ён з фурманкі і давай лавіць пеўніка. Вось-вось птушка амаль у руках, а ён аніяк схапіць яе не можа.

– Ну і недарэка! – насміхаліся з яго. Самыя зухаватыя саскочылі з фурманак і таксама ўзяліся лавіць пеўня. Але той, хаця ля самых рук круціцца, аднак схапіць не даецца і ўсё далей ды далей углыб пушчы падаецца, а хлопцы за ім: „Ціп! Ціп! Ціп!” – клічуць.

Тым часам птушка ў малады ельнік ускочыла. Тыя ж маладняк акружылі, а тут раптам з-пад елачак парася выскоквае! Задзіваваліся не на жарт хлопцы, але ж пабеглі за ўцякаючай жывінкаю. Парася ім каля ног мільгае, але ў рукі не даецца. Не дапамагло нават ласкавае заклікание: „Куц! Куц! Куц!”. Свінчо

ў сцірту галля ўбілася. Лаўцы забеглі спераду, а з-пад галін магутны зубр падымаецца!.. Ад яго выгляду ўсім зухам у горле перасохла ды ногі ў зямлю паўрасталі. А тут зубр чмыхнуў, капытам зямлю грабнуў, пагрозліва галаў апусціў і на знямелых жартаўнікоў рушыў. Вядома, з іх усю адвагу быццам вецер здзьмухнуў: заверашчалі яны нямымі галасамі ды паскакалі, быццам зайцы, да дрэваў.

Як здолелі высока ўскараскаліся ды ў крык:

– Ратуйце! Зубр! Зубр напаў!..

Але ўжо не было каму іх ратаваць. На гасцінцы стала пуста, бо коні, нюхам пачуўшы звера, захраплі, ударылі ў хамуты і віхрам панесліся па гасцінцы. Тыя ж, хто на фурманках сядзеў, з усяе моцы ўхапіліся абедзвюма рукамі за кланіцы ды драбіны, каб іх з фураў не вытрасла, калі калёсы свой шалёны танец на карэннях ды калдобінах танцавалі. Коні толькі ў чыстым полі, далёка за пушчаю, спыніліся.

Вось і сядзелі тыя малайцы на дрэвах, быццам вароны, ды на зубра з жахам пазіралі. А звер адыходзіць нават і не думаў: то капытамі дрэвы падкопваў, то лобам вываліць з карэннем іх спрабаваў. А калі на пушчу апусціўся змрок, стаў ён сабе воддаль у маладняку і пільна за седзячымі на дрэвах сачыў. Тыя ж featurespeнымі спосабамі адагнаць яго спрабавалі: шышкамі ды галінамі шпурлялі, крэсівам снапы іскраў дабывалі, але ўсё дарма – зубр стаяў як укопаны. Так вось цалюсенькую ноч, быццам цецерукі, на дрэвах яны прасядзелі, а са страху ды холаду ніхто з іх і вока не сплюшчыў.

Толькі раніцай, калі ўжо цалкам развіднела, яны заўважылі, што ў ельніку зусім не зубр затаіўся, а вялікі вываратень ляжыць!

Сёння ўжо цяжка дайсці, як тое было на самай справе і каму такое надарылася. Аднак старыя насельнікі тых ваколіц мяркуюць, што дзецюкі, празмерна свае горлы распусціўшы, самога духа пушчы ўгнявілі. І гэта ён такія кепікі з іх учыніў.

У Белавежскай Пушчы, у лясніцтве Ланчына, у аддзеле нумар 28, ёсць нязвыклае месца. Легенда гаворыць, што даўным-даўно, шмат вякоў таму, мясцовы люд вельмі пакутаваў ад татарскіх набегаў. Татары палілі сядзібы, а людзей забіралі ў палон. Уся ваколіца жыла ў штодзённым страху. Жыхары, жадаючы вызваліцца ад прыгнёту, сабраліся на Раство ў сваёй царкве і гарачай малітвай прасілі Бога аб дапамозе. Бог прыслухаўся да іх. Калі людзі выйшлі з храма з працэсіяй (Хрэсным ходам), то ўбачылі, што над іх галовамі няма зорак і зусім іншае неба. Зразумелі, што вызваліліся ад мук, перанесліся ў іншы свет. Царква разам з людзьмі апусцілася глыбока пад зямлю.

Цяпер у гэтым месцы ёсць паглыбленне. У варонцы не растуць дрэвы, хаця вакол шуміць лес. Калі прылажыць вуха да зямлі, можна пачуць гук царкоўных званоў і спевы. Некаторым дадзена бачыць працэсію, некаторым – бярозавы крыж, якога на самай справе няма. На зробленых там фотаздымках пасля праяўлення відаць нейкія празрыстыя постаці. Месца гэтае даследавалі з дапамогай маятнікаў і пруткоў. Доследы паказалі, што гэтае месца выпраменьвае агромністую энергію.

# Забрады

На ўсходняй ускраіне Белавежскай пушчы, на шляху Альхоўка-Семяноўка, ляжыць невялічкая вёска Забрады.

Там, дзе сёння знаходзіцца меліярацыйны канал, быў некалі брод. У гэтым месцы людзі пераходзілі праз раку, пераязджалі калёсамі, ганялі на лугі жывёлу.

Гавораць, што адзін з жыхароў Альхоўкі, нейкі Скепка (гэта вельмі папулярнае ў Альхоўцы прозвішча) ажаніўся з маладой дзяўчынай і пасяліўся „за бродам”. Ад таго часу і месца паўстала назва вёскі – Забрады. Сям’я дала пачатак жыхарам, якія да 80-х гадоў амаль усе мелі прозвішча Скепка.

# Масева

Даўным-даўно за вёскай Масева стаяла царква. Аднак людзі не вельмі хіліліся да яе. Рэдка хадзілі на службы, у час посту ладзілі забавы, пілі, гулялі, сварыліся, хлусілі. Жылі супраць запаветам, не шанавалі ні Бога, ні адзін аднаго. За гэта напаткала іх кара. Калі аднойчы з нейкай нагоды сабраліся ў царкве, храм разам з прысутнымі праваліўся пад зямлю. Магчыма, што нават у царкве дрэнна паводзілі сябе, таму і заслужылі такое пакаранне.

Цяпер за Масевам ёсць глыбокая ўпадзіна. Кажуць, што якраз там і стаяла царква. А калі прылажыць вуха да зямлі, чуваць песнапенні і біццё званоў. Асабліва ў святы.

# Туркава Гара (Турэцкая Гара)

Звёскі Навіны вузкая лясная сцежка вядзе да жвіровай дарогі, якая спалучае Міхноўку з Бандарамі. Побач з дарогай знаходзіцца горка, якая называецца Туркавай Гарой.

Старыя людзі расказваюць, што падчас руска-турэцкай вайны тут разыгралася адна з бітваў. Кажуць, што менавіта у гэтым месцы рускія разбілі турэцкую армію. Дакладна невядома, ці то рускія салдаты былі на вяршыні гары, а туркі ля яе падножжа, ці наадварот. Але вядома напэўна, што руская армія перамагла. Турэцкія войскі былі знішчаны дашчэнту. Забітыя ляжалі так густа, што не было дзе паставіць нагу, каб не даткнуцца ляжачага цела. Уся гара была заліта крывёю. Дарога, якая бегла побач, зрабілася такой гразкай, што колы вазоў круціліся на месцы, як у вадзе. Людзі казалі, што зямля тут зрабілася пясчанай і неўрадлівай, бо была заліта крывёю захопнікаў.

Цяпер гэта ўжо не гара, а толькі невысокі пагорак, парослы лесам.

Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы

Шмат гадоў таму ў ваколіцах вёскі Лазавое „панавалі” балоты. Людзям цяжка было перабірацца на другі бок макрэчы. Насыпалі зямлю. Так утварылася цвёрдая грэбля, па якой маглі хадзіць і ездзіць. Грэбля служыла доўгія гады. Ішоў 1864 год, лютавала студзеньскае паўстанне. Паўстанцы мелі намер па грэблі адыйсці ў вёску Ляўкова. Вестка аб іх планах дайшла да штаба царскіх войск. На грэблю выслалі атрад салдат, каб перакрыць дарогу ўцекачам. Зрабілі засаду. Паўстанцы трапілі ў пастку. Пачалася крывавая бітва. Усе паўстанцы загінулі. Грэбля была заліта крывёю. Ад тае пары гэтае месца называюць „Краснай Гробляй” або „Грэбляй” („красны” па-беларуску значыць „чырвоны”, чырвоны, як кроў).

Старыя людзі кажуць, што дагэтуль у ваколіцах Краснай Грэблі, асабліва ў апошні дзень поўні, можна пачуць лязгат зброі і дзіўныя гукі, якія выходзяць з-пад зямлі. Кажуць таксама, што ў гэтым месцы можна сустрэць дух таго, хто здрадзіў паўстанцам. Мясцовыя называюць яго Ўрэдным, або”мяцежнікам”. Кажуць, што дух блукае тут у пошуках паўстанцаў, і будзе блукаць датуль, пакуль не дачакаецца прабачэння. Сустрэча з пакутнікам – кепская прыкмета.

З часам грэблю пашырылі, узмацнілі. Цяпер гэта асфальтавая дарога. Але мясцовыя жыхары і сёння называюць яе „Краснай Гробляй” („Грэбляй”).

# Урочышча нязвыклай сілы

У гміне Нараўка ёсць вёска Старое Ляўкова. Непадалёку ад вёскі расце густы лес. Людзі кажуць, што ў гэтым лесе ёсць урочышча - месца нязвыклае і страшнае. Нейкая таямнічая сіла прыцягвае ўсіх, хто апынецца паблізу, і пачынае „засмоктваць". Ахвярамі ўрочышча бываюць дзікія звяры, птушкі і нават людзі. Мясцовыя жыхары стараюцца не рызыкаваць, абыходзяць згубнае месца стараной. Сочаць таксама, каб хатняя жывёла своечасова вярнулася з пашы.

Здарылася аднойчы, што нейкі прыезджы, не ведаючы пра ўрочышча, пайшоў у лес. Раптам адчуў, што дзіўная сіла цягне яго ўбок. Чалавек ішоў на захад, а няведамая моц валакла яго на поўнач. Каб не паддацца таямнічаму прыцягненню, падарожны ўхапіўся рукамі за вялікую сасну ды яшчэ прывязаўся рамянём. І так уратаваўся. Калі выйшаў з лесу, рукі яго выцягнуліся да кален.

Дагэтуль ходзяць легенды пра вялікую моц урочышча.

Праехаўшы два кіламетры дарогі з Ляшукоў у напрамку вёскі Лука, трапляем у балота Яна. Яшчэ да цара, кажуць старэйшыя людзі, позна ўначы на гэтым месцы нешта страшыла выключна п'яніц. Калі п'яны чалавек ехаў гэтай дарогай, каля балота Яна штосьці скіроўвала каня з дарогі і вадзіла па балоце некалькі гадзін кругам, а потым адпускала. Ізноў чалавек трапляў на дарогу і кругамі ехаў, куды яму трэба. Сяляне гаварылі, што там пасяліўся чорт, і які людзей зводзіць.

Праз балота працякаў невялікі ручай. Людзі задумалі на гэтым ручаі паставіць святога Яна. Так і зрабілі. Сярод ручая паставілі невялікую каплічку, а ў ёй на лаўцы – выструганага святога Яна. І хто там ехаў ці ішоў, заходзіў да каплічкі і клаў грошы. Сяляне думалі, што забірае іх для сябе Ян, бо грошы клалі, а іх не было. Гэтыя грошы забіралі некаторыя падарожнікі і пастухі, што пасвілі кароў. Ад таго часу і перастала там страшыць - да сённяшняга дня.

Цяпер няма ўжо святога Яна, бо згінуў, але балота каля таго месца і цяпер завуць балотам Яна.

# Жыватворная крыніца

Як сведчыць легенда, у Белавежскай Пушчы ў 1400 метрах на паўночны захад ад Новай Волі біла крыніца, побач з якой часта бачылі старога чалавека з доўгай сівой барадой. Здарылася гэта гісторыя ў пачатку XVIII ст. Прыгожым веснавым днём з вёскі Новая Воля выйшаў пятнаццацігадовы хлопец Юрка. Ад нараджэння быў ён сляпы. Бацькі паўміралі, і Юрка з малых гадоў застаўся сіратою. Ішоў ён дарогаю, ішоў, ды і заблудзіў. Калі зразумеў, што знаходзіцца ў лесе і не ведае, у якім напрамку ісці, пачаў клікаць на дапамогу. Яго крыкі пачуў стары, што сядзеў ля крыніцы. Дзядок падняўся і пайшоў на голас. Выйшаўшы на ўскраіну, убачыў хлопца, які, ціха плачучы, шукаў кіем сцежку. Стары зразумеў, што хлопец сляпы, падышоў да яго і ціха сказаў:

– Не плач, недалёка адсюль ёсць крыніца. Калі хочаш, пойдзем туды, абмыем твае хворыя вочы, і вернешся дадому здаровы.

Хлопец кіўнуў галавой у знак згоды і папрасіў падаць руку. Пры крынічцы прыселі, стары нахіліўся, зачэрпнуў рукой вады і прамыў хлопцу вочы. Прыкрыўшы іх далоняй, прытуліў хлопца і кажа:

Праз хвіліну пакіне цябе ноч, убачыш прыгожы свет, бацькоўскую хату, сясцёр і братоў. Калі запытаюць, як стаўся цуд, скажы, што выратавала цябе гаючая вада гэтай крыніцы.

І асцярожна адкрыў Юрку вочы. Уражаны хлопец закрычаў:

– Я бачу!.. Я бачу!..

Хацеў падзякаваць старому за цуд, ды таго нідзе не было.

Вярнуўшыся дамоў, Юрка расказаў аб цудзе. Вестка аб тым, што Юрка Сірата стаў відушчым, у хуткім часе разыйшлася далёка па наваколлі. Праз некалькі дзён па адным і групамі пачалі ісці да крыніцы людзі са слабым зрокам або і цалкам сляпыя.

Кожны, хто прамыў вочы гаючай вадой, пачынаў бачыць.

Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы

Жыхары Новай Волі, баючыся, што паломнікі затопчуць крыніцу, паглыбілі яе, абнеслі дубовым зрубам і прыкрылі дашком. Пад дахам павесілі ікону Божай Маці, вакол паставілі лаўкі..

Да крыніцы ішлі і ішлі людзі. Аж да І сусветнай вайны. Месца, дзе яна была, пазначана на карце 1892 г. Сёння тае крыніцы няма. Як і калі знікла – ніхто не ведае...

# Мацейкава Гара

На ўскраіне Пушчы, там, дзе цяпер знаходзіцца вёска Мацейкава Гара, наглядаў за пушчанскім абшарам асочнік і пчаляр Мацей. Апрача таго, быў ён праважатым для купецкіх караванаў, што па гандлёвым шляху ішлі на ўсход, на Літву і Русь. Ішоў 1350 год, калі тут ўпершыню з’явіліся рыцары-крыжаносцы ў бліскучых даспехах. Убачыўшы іх, Мацей прыгадаў дзіцячыя гады, калі марыў стаць рыцарам, мець даспехі і рыцарскі меч. Праз нейкі час мара Мацея споўнілася. На паляне, непадалёку ад цяперашняй вёскі Плянта, убачыў ён рыцара - змучанага, з апухлым тварам - які дажываў свае апошнія хвіліны. Учуўшы некалькі слоў на незнаёмай мове, Мацей здагадаўся, што перад ім чужаземец з далёкай краіны. Рыцар не дажыў да рання, памёр. Зняў Мацей з пакойнага даспехі і пахаваў няшчаснага ў глыбокай яме. Даспехі, пра якія марыў столькі часу, забраў з сабой. Аднойчы надумаў іх апрануць. Ды вось бяда: Мацей быў мужыком рослым, з моцным целам, таму ледзь нацягнуў на сябе зброю з чужога пляча. Грозна і адмыслова выглядаў у даспехах, як сапраўдны рыцар. Ды толькі радасць Мацея была кароткай. Мабыць, Бог пакараў яго за непатрэбную зухаватасць, бо ніяк не зніmaліся злашчасныя даспехі. Мучыўся, бедны, пацеў, і так круціўся, і гэтак. На розныя спосабы спрабаваў сцягнуць з сябе латы, ды толькі зброя нібы прырасла да цела. І вырашыў Мацей прасіць дапамогі. Узышоў на вяршыню гары, каб, убачыўшы каго, паклікаць. Але дарэмна ўглядаўся Мацей удалячынь. Ніхто не ішоў, не ехаў дарогаю, што вілася ля падножжа гары. Заціснуты ў даспехах, з дня ў дзень губляў сілы, і ўрэшце знясілеў зусім і адыйшоў на вечны спачын. Жыхары Мацейкавай Гары пазней часта бачылі мажную постаць Мацея ў бліскучых даспехах. Дух рыцара паказваўся ноччу і днём, чуваць былі моцныя ўдары і зычныя рыданні.

Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы

Даўным-даўно, шмат гадоў таму, было тут неглыбокае і невялікае возера, пасярэдзіне якога знаходзіліся дзве выспы. Да іх вяла грэбля. Адна з легенд гаворыць, што на гэтых выспах былі жанчыны са сваімі дзецьмі. Калі мужчыны ішлі на паляванне, жанчыны і дзеці хаваліся на выспах. Вада аберагала іх ад небяспекі. Каб на востраў не прайшлі дзікія звяры, перад грэбляй распальвалі вогнішча.

Зараз у месцы, дзе было возера, засталіся толькі тоўстыя, на некалькі метраў, пласты торфу. Побач стаяць хаты баб'ягорцаў.

Спытаецеся, пэўна, чаму Баб'я Гара?.. Ведаеце, калі рака Нараў плыла вось тут, дзе цяпер нашыя лугі, а вакол рос непралазны лес, на пусты і глухі бераг вада выкінула нейкую бабу. Абтрахнулася яна, узабралася на пагорак, што высіўся недалёка ад берага, ды і вырашыла там жыць. Так вось і паявілася наша Баб'я Гара.

# Баб'ягорац і пошасць

Калісьці для людзей найвялікшым няшчасцем быў не пажар, не голад і нават не вайна, хоць яны здараліся вельмі часта, а пошасць або зараза, ці, як цяпер кажуць, эпідэмія. Пошасці розных хвароб вынішчалі цэлыя вёскі, гарады, акругі, нават краіны.

У вёсцы Баб'я Гара, што знаходзіцца на высокім пагорку паміж ракою Нарвай і паўночнай ускраінай Белавежскай пушчы, мне расказвалі: „Калі даходзіла чутка да вёскі, што недзе непадалёк паявілася пошасць, мужчыны запрагалі ў ярмо сівага вала і абворвалі сахою навокал вёску, каб хвароба не перайшла цераз баразну. У той жа час жанчыны і дзяўчаты збіраліся разам і за адну ноч напрадалі з ільну нітак і вытыкалі з іх ручнік-ахвяру, які перад узыходам сонца павязвалі на крыжы, што стаяў на канцы вёскі. Зразумела, што ўсё гэта не магло перашкодзіць пошасці. І яна, быццам бы, калі ўварвалася ў вёску, імчалася па вуліцы ды касцянымі сваімі пальцамі стукала ў вокны хат, крычала: «Была бяда, была бяда, а цяпер будзе вам ліха!»

І вось аднойчы, калі так бегла пошасць па вуліцы Баб'яй Гары і стукала па вокнах, адзін баб'ягорац сядзеў на прызбе сваёй хаты ды пакурваў люльку. Пыхнуў цэлую хмару дыму раз, пыхнуў другі, а калі пыхнуў трэці, бачыць – мара нейкая белая каля акна яго хаты стаіць ды касцяным пальцам у шыбіну стукоча. Баб'ягорац, доўга не думаючы, – цап яе за касцяную руку ды і кажа:

– Дзеці і жонка паснулі, перастань барабаніць!

– Ах, дык ты асмеліўся мяне за рукі чапаць! – узлавалася мара. – Ці ты не ведаеш, хто я?! – ускрыкнула яна.

– Адкуль жа мне ведаць, панечка?.. – атрупянеў са страху баб'ягорац ды задам да дзвярэй свае хаты пачаў падавацца.

– Ну, дык ведай: я – сама халера! – выкрыкнула яна ды так дзіка зарагатала, што ў баб'ягорца ад жаху аж мову адняло ды з заляскацеўшых зубоў люлька выпала.

– Чаго затросся? – накінулася на яго халера. – Пакуль я цябе ўмару, ты мне яшчэ патрэбны да іншага. Бач, я ўжо зусім прыстала, пехатою па свеце бегаючы. Бяры мяне на свае плечы ды насі па свеце. Толькі не абмінай ніводнага ні сяла, ні горада. Калі пастараешся, дык пажывеш яшчэ крышку.

Сказала яна так баб'ягорцу ды на плечы яму ўзабралася.

Паправіў той жудасную ношу на плячах і адчувае, што яна не толькі лёгкая, але зусім, бы тое паветра, вагі не мае. Падумаў ён сабе: «Вядома, мара ж яна» – ды павалокся да бліжэйшага сяла.

У тым сяле якраз мужчыны пад яравое поле аралі, жанкі ў градах гародніну садзілі, а дзеткі-малалеткі на вуліцы, каля хат сваіх, забаўляліся. Убачыла гэта мара, скрыганула са злосці зубамі ды махнула сваёй белай плахтаю, што ахутвала яе касцістае цела. Пайшоў ад плахты смяротны павеў, і ад яго пачалі мерці мужчыны, жанчыны і дзеці - там, дзе хто ў тую пару знаходзіўся. Як прайшоў баб'ягорац з мараю па тым сяле – адны пустыя сцены хатаў асталіся.

Пабрыў баб'ягорац адтуль у мястэчка. А там па карчмах балі, спевы ды весялосць на кожным твары. Але як толькі ён затрымаўся на рынку ды мара ўзмахнула сваёй плахтаю – спынілася адразу музыка, змоўклі песні, боль пакарэжыў людскія твары. Куды ні глянь – усюды вуліцы ды панадворкі трупы ўсцілаюць, труна за трунoю на могілкі плывуць, а там ужо і месца не хапае памёрлых хаваць".

Наглядзеўся баб'ягорац не гэтую жудасць, абамлелі ў яго рукі ды ногі і сэрца крывёй аблілося ад жаласці да людзей. Прысеў ён на прыдарожны камень і цяжка ўздыхнуў, а мара яму на тое:

– Што, жыццё табе надаела?!

Воляй-няволяй падняўся ён ды пасунуўся куды вочы глядзяць. Але ўсё так меркаваў, каб па лясах, пустэчах ды багнах хадзіць, дзе меней людзей сустракаецца. Заўважыла яго хітрыкі мара ды кажа:

– Ты глядзі, каб я цябе мёртвым на якой-небудзь пустэчы не пакінула!

І давялося баб'ягорцу насіць мару па вёсках ды гарадах. Насіў ён яе, насіў, доўга ці коратка, ажно і ў свае родныя бакі прыблукаў. Бачыць: за рэчкаю на пагорку яго родная вёска стаіць. Усплылі ў яго перад вачыма родныя дзеткі-малалеткі, старыя бацька ды маці і любая сэрцу жонка. Зашчымела ягонае сэрца ад болю, а мара тым часам падганяе:

– Чаго стаў? Ці ж табе даражэй жыццё тваіх родных, чым сваё ўласнае?!

Выбраў тады баб'ягорац месца ў Нарве найглыбейшае ды ўброд у раку пайшоў. Ішоў і з кожным крокам усё глыбей у ваду акунаўся. Моцна-моцна ўхапіў ён за касцістыя ногі мару ды цалкам пад ваду пайшоў. Але мара, як паветра, усплыла над вадою. Баб'ягорац жа так і застаўся на дне віру.

Перапужалася мара такой настойлівасці баб'ягорца, які свайго жыцця не пашкадаваў, каб толькі ўратаваць ад смерці родных дзяцей, бацьку, маці, жонку ды сяло. Пабегла яна спачатку ў Белавежскую пушчу. Паблукала па ёй некалькі дзён, а потым цалкам з гэтых бакоў у іншыя краі падалася.

Так вось і выратаваў баб'ягорац ад смерці не толькі сваю сям'ю, радню ды вёску, але і ўсё наваколле.

Жыў калісьці на Беларусі асілак Радар. Спярша ён быў звычайным кавалём, а потым людзі выбралі яго сваім князем. А ў суседнім з нашай зямлёй Ляцкім каралеўстве правіў кароль Лях, у каторага быў на службе цмок Крагавей. Панадзіўся ненажэрны Крагавей лётаць на Беларусь. Прыляціць – людзей жывымі глытае, а каго не праглыне,– дык заб’е. Доўга думаў Радар, як аднадзіць паганага цмока. І прыдумаў. Узяўся ён рабіць вялізную-вялізную саху. Векавыя, ажно пад воблакі, белавежскія дубы, каб зрабіць тую саху, спілаваў, усё жалеза з княства, каб акаваць яе, сабраў. Нарэшце зрабіў саху. Зацягнуў у поле, кінуў непадалёку ад лесу, а сам з дружынаю пачаў камяні насіць ды вежу мураваць.

Потым замураваўся ў каменнай вежы і замкнуўся на трое жалезных дзвярэй. Ды не адзін, а з дружынаю. Прылятае Крагавей, а Радар яму кажа:

– Пачакай, цмок, не губі людзей. Калі ты пралізнеш трое жалезных дзвярэй, я табе сам на язык сяду і ты мяне з’ясі. Пасля рабі што хочаш у маім княстве.

– Добра,– пагадзіўся Крагавей,– хай будзе па-твойму!

І раз ён лізнуў, і другі раз лізнуў – і пралізаў трое жалезных дзвярэй! Але князь Радар не разгубіўся – цапель за цмокаў язык кавальскімі кляшчамі! Ды як узяўся малаціць паганца па галаве кавальскім молатам! А дружына тым часам запрэгла ашаломленага ненажэру ў саху.

Круціўся-круціўся Крагавей, але ўрэшце мусіў скарыцца:

– Давай,– просіцца,– будзем мірыцца.

– Добра,– усміхнуўся Радар,– давай мірыцца. А каб нам назаўсёды ведаць, дзе чыя зямля, дык валачы саху – правядзем векавечную граніцу.

Першы дзень аралі яны поле. Другі дзень аралі яны лес. Трэці дзень аралі яны луг і, нарэшце, даараліся да вялікай ракі. Радар, кіруючы цмока ў ваду, крыкнуў:

– Гайда! Бух!..

Маўляў, скачы ў раку.

Скочыў Крагавей з высокага берага. Ды проста ў вір галавою! Ледзь не ўтапіўся паганец, але пашанцавала: не надта глыбокая яма была. Нават сахі пазбыўся – яна засталася ў вадзе. Рады цмок, што застаўся жывы. Ляціць – не азіраецца. Хутчэй, хутчэй у нару пад гарой, дзе жыве кароль Лях. А ўбачыўшы свайго гаспадара, Крагавей яшчэ здалёку закрычаў яму:

– Помні, Ляша, па Бух наша!

І знік у глыбокай нары, каб ужо ніколі не паказвацца на белы свет.

З таго часу след ад сахі,названы людзьмі Бухам, ці Бугам, на векі вечныя стаў граніцай паміж нашым і ляшскім краем. А вежа, якую пабудаваў тады князь Радар, і да сённяшняга дня стаіць у гарадку, што называецца Камянец. Вы можаце з’ездзіць туды і ўпэўніцца ў праўдзівасці гэтай легенды.

У час панавання літоўскіх князёў надарылася адной маладой князёўне праязджаць цераз ручай, што ўпадае ў Рось. Пры пераездзе коні і каляска, на якой ехала жанчына, заселі ў твані. Убачыўшы такое, ліцвіны-рыбаловы, жыўшыя ў той час на беразе, узялі вяроўкі, прыбеглі і выцягнулі каляску з коньмі. Князёўна зацікавілася, чым яе выратавалі, паказваючы на вяроўкі.

Ёй сказалі:

– Паўроз.

Дык князёўна назвала і сам ручай, у якім засела разам з каляскай і коньмі, Паўрозай і загадала пабудаваць мястэчка з той жа назвай.

# Свіслач

Дзе цяпер гэтае возера, некалі расла вялікая альшына. Возера не было, быў толькі канал, агароджаны парканам. У ім было шмат рыбы. Пасярэдзіне канала была выспа, абсаджаная вольхамі. Адна альха зламалася на палавіне, а з надлому вырасла другая.

Падчас кірмашу да Свіслачы з'язджалася шмат багатых купцоў. Граф Тышкевіч вельмі цешыўся такой колькасцю гасцей. Ён заўсёды запрашаў купцоў на абед. Калі прыходзіў час сілкавацца, у адным з вокнаў палаца вывешвалі белую хусціну. Хусціна тая была знакам для купцоў, што пара сядаць за стол.

Быў тут некалі і звярынец. Зараз усе дрэвы спілавалі на дровы. Звярынец таксама быў агароджаны парканам. Звяроў у звярынцы было вельмі многа, розных відаў. За імі наглядаў звярыннік.

Ад палаца ішоў мост – праз звярынец да самага касцёла, што стаіць на Брэсцкай вуліцы.

# Ружа колеру сонечных промняў

Яны рушылі праз лес. Іх было пяцёра. Стары Крук, ідучы наперадзе, расхінаў галіны дрэў і злёгку прытрымліваў іх, каб ні адна не ўдарыла дзесяцігадовага хлопчыка, што ішоў побач з ім. У некалькіх кроках за імі ступаў старэйшы брат хлопчыка, ладны, з прыгожым, як у дзяўчыны, тварам. Справа ад юнака, абсякаючы на хаду цяжкапраходнае калючае кустоўе, рушыў мужны, моцны мужчына. Нягледзячы на спёку, ён быў у даспехах і са зброяй. Апошнім цягнуўся босы чалавек у доўгім чорным адзенні, месцамі ўжо разарваным галінамі. Ён ішоў за ўсімі, быццам у сне, амаль не звяртаючы ўвагі ні на яловую ігліцу, што блыталася ў яго доўгіх нечасаных валасах, ні на камяні і калючкі, што скрывавілі яго ногі. Ён штосьці ціха мармытаў, толькі зрэдку кідаючы на сваіх спадарожнікаў шалёны позірк вар'ята. Усе яны ратаваліся ад смерці. У спіну кожнага горача дыхала страшная таямніца.

Гэта быў ужо сёмы дзень небяспечнай вандроўкі, сёмы дзень іх знаёмства, бо спачатку кожны ішоў самастойна. Потым у вёсцы, што амаль вымерла ад чумы, стары Крук падабраў двух братоў, Шэравока і Траццяка, слабых і галодных, і ўгаварыў іх ісці з ім. Яшчэ пазней вандроўнікам сустрэўся літоўскі воін Крыштупас, які ратаваўся ад уласнага князя. Апошнім прыстаў беглы манах Даміян.

Ніхто не ведаў дакладна, куды ідуць, але ўсе марылі аб новым, ціхім, багатым месцы, дзе б можна было схавацца і пачаць новае жыццё.

Раптам хлопчык Траццяк спыніўся і пацягнуў носам: «Ці чуеце?» Прынюхаліся і іншыя. Ледзь чутны водар, празрысты, дурманлівы, даносіўся да іх.

– Што гэта можа быць? – спытаў Крыштупас, а Даміян спалохана жагнуўся.

Стары Крук рашуча рушыў скрозь зараснік хмызняку і... выйшаў з лесу. За ім, жмурачыся на яркае сонца, яшчэ чатыры постаці.

Гэта было дзіўнае месца - светлае, духмянае. Удалечыні „смяялася „маленькая, незвычайна чыстая рачулка, вялікія цяністыя дрэвы пачціва схілялі перад ёй галовы. І нельга было зрабіць і кроку, каб не наступіць на кветку. Дзікія ружы, здавалася, аплялі ўсю зямлю, і яна стала адзіным квітнеючым кустом. Белыя і жоўтыя, ружовыя і цёмна-чырвоныя, колеру вінаграднага віна і колеру чалавечага румянцу,– усе яны складалі адзін дзівосны дыван.

– Гэй, як тут хораша! – хлопчык з радаснымі клічамі кінуўся бегчы па ружовым полі. Зрабіў некалькі крокаў і апусціўся на зямлю перад адной з самых вялікіх і прыгожых ружаў. Прысеў і стары Крук, выцягнуўшы хворыя ногі на сонцы. Крыштупас жа, падазрона агледзеўшы прыгожую паляну, пайшоў да вады, ні на хвіліну не выпускаючы свой меч.

Праз некаторы час Шэравок узняў вочы і са здзіўленнем агледзеў сваіх спадарожнікаў.

– Стары, а дзе Даміян? – спытаўся ён.

Сапраўды, Даміяна нідзе не было. Крук у пошуках яго нават зайшоў у лес, але потым цвярозы розум вярнуў яго ў ружавую даліну.

– А, Пярун з ім! – сказаў стары. – Хіба гэта першы ці апошні раз? І хіба мы пастухі яму?

Але прыкрасць не пакідала Крука. Яму сапраўды надакучылі за гэтыя сем дзён таямнічыя знікненні звар’яцелага манаха. Аднойчы той зайшоў у багну, пачаў тануць, але на дапамогу не клікаў і толькі ціха маліўся. Стары выпадкова заўважыў яго. Другі раз ён заснуў проста перад мядзведжай бярлогай. З кароткіх адрывістых расказаў Даміяна стары зразумеў, што быў ён спачатку селянінам, потым прыняў хрышчэнне, надта паверыў у новага Бога, пастрыгся ў манахі

і разам з княжымі дружыннікамі стаў хадзіць па паселішчах, абарочваць паганцаў у хрысціянства. У яго роднай вёсцы людзі адмовіліся хрысціцца, і іх усіх пасеклі ў яго на вачах. Пасля гэтага ён збег з манастыра і пазбавіўся розуму. Былі моманты, калі да Даміяна вяртаўся ваяўнічы запал, тады ён чапляўся да сваіх спадарожнікаў з патрабаваннем неадкладна прыняць хрысціянства. Але звычайна ён быў вельмі ціхім.

Раптоўна вярнуўся Крыштупас, і ўсе здзівіліся, як ціха і асцярожна, амаль нячутна, ступае ён.

– Там, ля ракі, хтосьці ёсць,– паведаміў воін.

– Ты лічыш, нам лепш пайсці адсюль? – спытаў Крук.

– Не ведаю. Там – жанчына, і яна спіць. Хадзем, я пакажу яе вам.

Каля ракі, у цені дрэў, ляжала жанчына. Цела яе, прыгожае і гнуткае, не было прыкрыта адзеннем. Доўгія светлыя валасы хвалямі падалі на высокія пругкія грудзі. Белае ільнянае пакрывала, якое яна падаслала пад сябе на зямлю, ахоўвала ад ружавых калючак. Жанчына спала і ўсміхалася ў сне. Чацвёра вандроўнікаў міжволі залюбаваліся ёю.

– Якая прыгажуня! – прашаптаў у захапленні Шэравок.

– Зусім маладая... – паківаў галавой стары. – Ёй не больш, як пятнаццаць гадоў.

– Яна не можа быць тут адна,– насцярожана прагаварыў Крыштупас. – Хто ж тут - сябры ці ворагі?

І раптам жанчына расплюшчыла вочы. Здаецца, яна не здзівілася невядомым людзям, бо нават не кінулася адразу прыкрываць сваю галізну. Рухі яе былі раскаванымі і ўпэўненымі.

– Я рада бачыць вас,– сказала яна. – Гэта добры знак, бо ўжо вельмі даўно сюды ніхто не прыходзіць - не мае патрэбы.

– Хто ты? Як тваё імя? – спытаў Шэравок у захапленні.

– Хто тут ёсць яшчэ? Чым займаюцца гэтыя людзі? – імкнучыся быць ветлівым, запытаўся Крыштупас.

Яна не паспела адказаць, бо тут раздаўся жахлівы крык.

– Гэта Даміян! – са страхам прашаптаў Траццяк.

І ўсе, не згаворваючыся, кінуліся ў той бок, адкуль даляцеў да іх вар'яцкі крык.

Яны ніколі не думалі, што бегчы па ружах так цяжка. Тыя кветкі, што былі трохі вышэйшыя, абдзіралі ім рукі і ногі, чапляліся за адзенне. Іншыя, трапляючы пад цяжкі абутак, ператвараліся ў слізкае месіва, і мужчыны ледзь не падалі. Хутка яны заўважылі сутулую постаць Даміяна. Ён стаяў сярод дрэў, з жахам глядзеў кудысьці і час ад часу крычаў. Убачыўшы, што спалохала спадарожніка, і ўсе астатнія спыніліся і нават пасунуліся трохі назад. Паміж дзвюх старых бяроз, упрыгожанае белымі і чырвонымі ружамі, было капішча.

– Багіня Лада!–ускрыкнуў Шэравок.

Першы схіліўся перад багіняй кахання і прыгажосці стары Крук. Ён памятаў яшчэ той дзень сваёй маладосці, калі маці прывяла яго да такога ж капішча, дзе чакала нявеста - добрая, працавітая дзяўчына-суседка. Лада аб'яднала іх лёсы, і яны былі шчаслівыя. Гэта потым, калі жонка памерла і гаспадыняю ў хаце зраблася нявестка, яму стала пагражаць смерць. Нявестка падбухторыла супраць старога яго сына, і напрыканцы зімы, асабліва галоднай, той адвёз Крука ў лес. Добра хаця не прывязаў, толькі папярэдзіў, каб той не вяртаўся дамоў – усё роўна карміць яго няма чым. Стары ж аказаўся больш дужым і трывалым, чым здавалася. Ён выжыў у лесе, і калі снег сышоў – пакінуў назаўсёды гэтыя мясціны. Так, ён паважаў Ладу, і яму было крыўдна, што ў апошні час людзі амаль забыліся пра гэтую багіню, даверыўшыся ва ўсім Перуну. Ён бачыў у гэтым здраду каханню на карысць воінскай славе...

Стары Крук не адразу заўважыў, як побач з драўляным ідалам – Ладай -з’явілася іх прыгажуня. Зараз на ёй было адзенне – доўгая ільняная кашуля, вышытая ружовымі, барвовымі і зялёнымі ніткамі. Вышыўка – кветкі ружы. Вянок з ружаў на галаве. І гэтае адзенне, якое падказвала, што перад імі вяшчуння, жрыца багіні Лады, адразу ўзнесла яе на недасягальную вышыню, і на імгненне вандроўнікі перасталі бачыць у ёй проста прыгожую жанчыну.

– Я рада бачыць вас тут,– зноў паўтарыла свае словы жрыца. – Багіня слухае вас з увагай. Што прывяло вас да Лады?

– Мы просім заступніцтва багіні, мы жадаем, каб яна схавала нас ад нашых ворагаў,– сказаў Крыштупас.

– Мы жадаем пасяліцца тут назаўсёды,– падтрымаў яго стары Крук.

Жрыца запаліла агонь ля ног Лады і кінула туды высахлых чаранкоў ружы. Язык полымя рэзка ўскінуўся да неба, і ў паветры залунаў нейкі прыемны пах.

– Хай будзе так, як вы жадаеце, – сказала вяшчуння. – Лада дазваляе вам застацца.

Надта ж дзіўнымі былі першыя дні іх жыцця на новым месцы. П’янкі ружавы водар вельмі хутка стаў раздражняць іх. Раніцай, набіраючы вады з ракі, Крыштупас гучна лаяўся:

– Немагчыма піць! У язык упіваюцца ружавыя калючкі!

Стары скардзіўся, што ў яго свярбіць усё цела ад ружавых драпін. І нават хлопчык Траццяк ужо не бегаў па ружавай даліне. Адзін Шэравок, здавалася, быў шчаслівы. Яго рэдка бачылі ля сяброўскага вогнішча – ён усё больш шукаў магчымасці застацца адзін на адзін з прыгажуняй-жрыцай, і яна не вельмі супраціўлялася гэтаму. Іх часта можна было сустрэць ля вогнішча багіні, і гэта чамусьці вельмі злавала Крыштупаса і Даміяна, да якога апошнім часам, здаецца, вярнуўся розум.

Аднойчы жанчына адвяла Крыштупаса ўбок ад сяброў і папрасіла ў воіна быць яе абаронцам. Аказалася, Даміян некалькі разоў ужо спрабаваў напасці на яе ў лесе, калі яна збірала грыбы і ягады. Яна баіцца яго, бо манах – шалёны. Крыштупас абяцаў сваю дапамогу, калі жрыца пакіне сустракацца з Шэравокам. Нічога не адказала вяшчуння, толькі звонка рассмяялася.

Крыштупас быў добры воін, сам князь заўважыў яго і ўзяў у дружыну сотнікам. І потым ніколі не забываў яго пры раздзеле баявой здабычы, на пірах і ў час палявання. Але аднойчы Крыштупас угнявіў князя, і ўдача адвярнулася ад яго. Трэба было расправіцца з ворагам – смелым ваяводам суседняга князя. Гэта было даручана Крыштупасавай сотні. Але князь настойваў яшчэ і на знішчэнні сям’і ваяводы: жонкі і трох маленькіх дзяцей. І Крыштупас не выканаў загад. Ён забіў у двубоі ваяводу, але сам дапамог яго сям’і выратавацца. Пасля гэтага Крыштупас адчуў, што яму ўжо не варта вяртацца на службу, дзе нічога, акрамя смерці, больш не чакала яго. І ён уцёк. Аднойчы раніцай літоўскі воін адчуў, што побач з ім ля вогнішча зноў няма Даміяна. Ён імгненна ўскочыў і рушыў на пошукі манаха, бо быў упэўнены, што той пайшоў на капішча да жрыцы.

Сапраўды, каля ідала Крыштупас убачыў дзве постаці - мужчынскую і жаночую. Але гэта быў не Даміян. Ён схаваўся і прыслухаўся.

– З таго часу, як мы даведаліся, што ты – жрыца, нікому і ў галаву не прыходзіць спытаць тваё імя,– гаварыў Шэравок. – Але кожны хоча ведаць, як завецца тое, што любіш.

– У мяне няма імя,– адказала прыгажуня. – Яно мне не патрэбна. Калі я толькі нарадзілася, бацькі аддалі мяне старому вешчуну, каб я дапамагала яму служыць Ладзе. Ведаеш, Шэравок, багіня сама выбрала мяне. Раней тут было паселішча – шмат людзей. Але аднойчы, вясной, невядома адкуль з’явіліся ружы. Імі пакрылася ўся зямля. Людзі спалохаліся, а вяшчун сказаў, што гэта

Лада патрабуе зрабіць тут капішча, а служыць ёй будзе той, хто народзіцца першы пасля гэтага добрага знака. Нарадзілася я. Хутка людзі пакінулі гэтыя мясціны, бо ружы забівалі хлебныя каласы, а рваць іх вяшчун забараніў. Зусім нядаўна памёр вяшчун. Перад смерцю перадаў ён мне волю Лады – служыць ёй да тых часоў, пакуль не ўзыйдзе дзіўная ружа колеру сонечных промняў. Тады я змагу пайсці адсюль і выбраць сабе мужа.

І тут сонца, раптам выглянуўшы з-за дрэў, заблыталася промнямі сваімі ў доўгіх валасах жанчыны. І Крыштупас пачуў усхваляваны голас Шэравока:

– Ты сама – сонечная ружа! Вось твае лісты (ён дакрануўся да адзення жрыцы). А гэта дзівосныя пялёсткі (ён правёў па валасах, што іскрыліся на сонцы, далонню). Я даю табе імя – Ружа. А Лада дае табе волю, бо даўно ўжо ўзышла ў гэтай даліне Ружа колеру сонечных промняў!

Крыштупас пайшоў да сяброў. Але каля вогнішча таксама было неспакойна.

– Нельга так больш! – крычаў Даміян. – Мы павінны знішчыць гэтыя праклятыя ружы, калі хочам застацца тут. Нам трэба расчысціць раку, паставіць хату, не, некалькі хат, каб кожны быў гаспадаром. А мне патрэбна царква, альбо хоць каплічка для майго Бога.

– А ты не баішся Лады? – запытаў хлопчык Траццяк.

– Чаго мне баяцца? Драўлянага ідала?

– Ты чуў, Крыштупас? – спытаў Крук.

– Так, і лічу - Даміян на гэты раз мае рацыю.

– Я таксама згодзен з ім,– падтрымаў стары. – Але трэба ўміласцівіць багіню Ладу. А гэта можа толькі яе жрыца.

Тут жа было вырашана прасіць Ружу ўступіцца за іх перад багіняй. І ўжо раніцай першы ружавы куст быў выкарчаваны. Калі сонца стаяла ўжо вельмі

высока, з’явілася Ружа з весткай, што Лада не прымае яе ахвяр і вельмі гневаецца на людзей. Мала таго, багіня не адпускае яе ад сябе. Сказаўшы гэта, прыгажуня расплакалася. І тады да яе падышоў Шэравок і папрасіў яе кінуць Ладу і працаваць разам з імі. Вось Даміян гаворыць, што Лада – толькі драўляны ідал, а сапраўдны Бог – іншы. Можа, так яно і ёсць? А ўжо калі Ружа вырашыць быць з ім, ён, Шэравок, возьме яе за жонку.

І Ружа згадзілася. Цэлы дзень людзі ваявалі з кветкамі. Яны лічылі, што чалавек, каб выжыць, павінен змагацца з прыродай. Але яны не ведалі, што іншы раз прырода помсціць сваім гвалтаўнікам, адбіраючы ў іх самае дарагое. У тым, што адбылося потым, не была вінавата Лада: гэта была помста самой прыроды - пакрыўджанай, парушанай...

Увечары Ружа заўважыла глыбокую стрэмку-калючку ў руцэ. Яна з цяжкасцю выцягнула яе. Але боль не праходзіў. Рука распухла і пачырванела. Стары Крук спрабаваў лячыць яе адварам з зёлак, але гэта не дапамагло. На другі дзень пачалася ліхаманка. Ружа, страціўшы прытомнасць, ляжала ля вогнішча і трызніла. Яшчэ праз дзень рука налілася злавеснай чарнатою, і Ружа памерла...

Яе хавалі раніцай, не саромеючыся слёз.

– Няхай паселішча, што калісьці абавязкова тут будзе, называецца Ружай,– прашаптаў Шэравок.

– Грэх называць мястэчка імем грэшніцы,– сказаў Даміян, які бачыў сябе святаром тутэйшых мясцін.

– А хто гаворыць, што трэба называць яе імем? – прагаварыў стары Крук. – Ружаны, бо ружаў тут шмат мы загубілі. Ніколі не будзе больш гэтая даліна такой прыгожай, дык хаця б як успамін пра былое – Ружаны.

Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы

Шмат кветак у садах і кветніках жыхароў Ружан. Але самыя любімыя па-ранейшаму – ружы - рознакаляровыя, пяшчотныя. І кожны гаспадар спадзяецца, што аднойчы побач з яго домам расквітнее тая - адзіная, незвычайная. Ружа колеру сонечных промняў, якая, магчыма, прыносіць шчасце.

# Ружаны

Часта даводзілася чытаць пра замураваныя ў сценах скарбы. У Ружанах легенды пра багацце Сапегаў пацвердзіліся, сталі явай.

Дзесяткі год таму ноччу ў палацы чуўся грукат, быццам нехта разбівае цагляную сцяну. Раніцай жыхары горада сталі сведкамі незвычайнай з’явы. Злева ад уваходнай брамы, на вышыні чалавечага росту, разабраная па цаглінах тонкая перагародка, за якой – ніша, тайнік. Схрон быў пусты.

Успомнілі, што напярэдадні на вуліцах горада бачылі машыну з незнаёмцамі, на якіх не засяродзілі асаблівую ўвагу. Больш машына не з’яўлялася. Жыхары ўпэўнены, што гэта нашчадкі Сапегаў прыязджалі за скарбам.

Цікаўныя з мясцовых доўга яшчэ спадзяваліся на ўдачу, руйнуючы сцены брамы, але дарэмна. Таямніцы Ружанскага палаца больш не існуюць? А, можа, чакаюць свайго часу.

Бывае іншы раз такое: грэшная чалавечая душа, азірнуўшыся на мінулае, прыходзіць у жах ад мноства чорных учынкаў і з усіх сіл пачынае ірвацца да дабра, святла, прыгажосці. Тады людзі кажуць: прачнулася сумленне.

Відаць, гэткае ж здарылася аднойчы з вядомым князем Аляксандрам Сапегам. Ніколі раней не бачыў Сапега такіх дзіўных, незразумелых сноў: пачаў з'яўляцца да яго ўначы таямнічы старац. Ціха гаварыў ён кожны раз адно і тое ж: «Грэх на табе, княжа, вялікі грэх. Але не страчвай надзею, бо жыццё тваё яшчэ доўгае, і грэх можна выкупіць. Я веру ў цябе, я паручыўся за цябе».

Пасля такіх начэй змрочны і задуменны хадзіў Аляксандр Сапега па сваім раскошным палацы, час ад часу кідаючыся ў малітоўню і прыпадаючы да святых абразоў. Палахліва разыходзіліся ў розныя бакі слугі і князева чэлядзь, саступаючы з яго шляху, і ніхто, нават сама княгіня, не мог вывесці яго з гэтага стану, бо хаця Сапегава цела было тут, яго душа знаходзілася вельмі далёка.

Пераносілася яна ў дзяцінства вялікага князя, калі ён здзейсніў першае сваё злачынства – застрэліў хлопчыка-жабрака, таму што жаласлівая песня, з якой ён прасіў міласціну, сапсавала маленькаму панічу настрой.

Альбо блукала душа па юнацтве - паміж тых ціхіх і няшчасных сялянскіх дзяўчат, якіх гвалціў малады Сапега.

І ныла душа ад зусім нядаўніх успамінаў, калі ў час збору падаткаў нават у палацы былі чутны гучны плач і праклёны людзей, у якіх забіралі сапегавы слугі апошняе...

– Так, я вялікі грэшнік,– шаптаў Сапега. – Але як магу я выкупіць свае грахі, і ці хопіць на ўсё гэта майго жыцця?

І тады, нячутны для іншых, гучаў голас таямнічага госця яго сноў:

– Калі ты раскаяўся сапраўды, то вытрымаеш дасланае табе лёсам выпрабаванне, і ў гэтым будзе тваё выбаўленне. Чакай і рыхтуйся.

Ніколі яшчэ жыхары Ружан і навакольных вёсак не бачылі свайго гаспадара такім чулым, спагадлівым, справядлівым. Цяпер ён амаль увесь час быў сярод падданых. Ён дапамагаў ім у горы, прымаў іх крыўду, праўдзіва вырашаў спрэчкі, дзяліў іх радасць. Аляксандр Сапега чакаў абяцанага выпрабавання і страшыўся яго. Але час праходзіў, і нічога на здаралася, урэшце зніклі і таямнічыя сны. Князь пачынаў супакойвацца.

Менавіта тады Сапега саступіў настойлівым просьбам княгіні, якая з-за мужавых дзівацтваў апошнім часам зусім не мела забаў. Гордая Сапегава пані любіла пышныя балі, гасцей, натоўпы паклоннікаў, што ўхваляюць яе прыгажосць. Але вось ужо некалькі месяцаў князь не прымае гасцей, адмовіўся ад паляванняў, якія былі калісьці яго любімым заняткам. А хутка ж яе імяніны. Няўжо ў цішы манастырскай давядзецца сустрэць свята?

Паддаўся Аляксандр Сапега на жончыны ўгаворы, і вось ужо з’язджаецца да палаца шыкоўна разадзетая шляхта. Пяшчотным пані – баль, высакародным панам – паляванне,– так вырашыў Сапега адсвяткаваць дзень нараджэння княгіні.

Паляванне! Шалёная скачка, вецер, што б’е ў твар, яловая ігліца ў валасах людзей і конскіх грывах, разгарачаны азарт, прызыўны брэх сабак, якія загналі звера... У адчуванні гэтага іржэ любімы жарабец Аляксандра Сапегі, раздуваючы ноздры ў адказ на ласку гаспадара, і сам князь шчасліва смяецца, як дзіця. Паляванне!

Усемагутны магнат, пакінуўшы гасцей, вырываецца наперад, водар прыроды дурманіць, п'яніць яго. І вось ужо адыходзяць удалечыню ночы, поўныя тугі і страху, прыкры пах ладану і пылу са старонак святых кніг, пасты, малітвы, дабрачынныя дзеянні. Ён зноў шчаслівы, ён зноў свабодны!

Сапега не зразумеў, як трапіў на зямлю. Толькі адчуў моцны штуршок. Конь раптам устаў на дыбкі і выбіў яго з сядла. Але сюды ўжо беглі спалоханыя егеры. Нехта чужы, раптоўна з'явіўшыся на князевым шляху, спалохаў яго каня. Гнеў, пякучы і сляпы, затуманьвае Сапегаў розум. Ён сам не чуе, што крычыць, але яго словы – страшныя. Ён загадвае пакараць смерцю вінаватага. І вось паслухмяныя егеры злосна збіваюць кагосьці арапнікамі.

Чалавек памірае хутка, бо і так не вельмі моцна трымалася душа ў целе няшчаснага старога, які на бяду сваю перайшоў шлях Сапегу. Але князь яшчэ не нацешыўся помстай. Ён падыходзіць да закатаванага, каб насмяяцца над мёртвым целам. І раптам спыняецца з жахам у вачах. Збялелыя Сапегавы вусны не могуць вымавіць нават слова... Перад ім, скрываўлены, ляжыць стары з яго сноў.

Страшэнны крык вылятае ўрэшце з горла Сапегі. Дык вось якое выпрабаванне было яму паслана! Ён не справіўся з ім, не выкупіў сваіх грахоў, а толькі далучыў да іх яшчэ адзін, самы страшны, бо і дабрыня, і справядлівасць яго былі выкліканы толькі страхам перад словамі гэтага старога. І зразумеў Сапега, што загубіў ён назаўсёды сваю душу.

Старога пахавалі па-хрысціянску, а на месцы, дзе адбылося забойства, князь загадаў пабудаваць каплічку, як робяць звычайна ў гонар святых пакутнікаў.

– Днём і ўначы хай ідзе там служба,– наказаў князь. – Хай адпяваюць маю грэшную душу, бо няма ўжо ёй ратавання. Хай моляць святары за мяне Усявышняга...

Што ж было з Сапегам далей? Адны кажуць: убачыўшы, што ўсе спробы выкуплення былых грахоў дарэмныя, князь Аляксандр стаў грашыць яшчэ

больш. Іншыя, наадварот, схіляюцца да думкі, што ўсё астатняе жыццё не расставаўся Сапега з тугой і сумам, што цэлымі днямі сядзеў ён у любімым пакоі сваім ля акна, назіраючы ў падзорную трубу за тым, як ідзе служба ў каплічцы, і нават памёр там жа, ля акна.

Хто яго ведае, што тут праўда, а што – выдумка? Адзіныя сведкі – паўразбураныя сцены Ружанскага палаца ды каплічкі. Але яны маўчаць, бо не дадзены каменю дар слова.

Вёска Варанілаўцы афіцыйна называецца Варанілавічы. Але ніхто ў той мясцовасці не называе яе інакш, як Варанілаўцы...

Па расказах старажылаў, якім, у сваю чаргу, апавядалі старыя, калісьці ў гэтых месцах быў дрымучы лес, што зліваўся ў адно цэлае з Белавежскай пушчай. Спачатку лес адступаў перад невялікімі палянкамі, а пазней яны злучыліся ў шырокія палі і лугі. Але лес канчаткова не здаўся, ён глыбока пусціў сваё карэнне ў тарфяніківі, яры, берагі рэчак і сыпучыя пяскі... Многія вёскі яшчэ і цяпер размешчаны на ўзлеску ці на палянах вакол яго...

У тутэйшых лясах калісьці хаваўся з атрадам атаман Ніл. Ці выступаў ён супраць польскіх захопнікаў, літоўскіх князёў, рускіх памешчыкаў - цяпер цяжка сказаць. Відаць, супраць тых і другіх. Улады называлі Ніла зладзеем, як і ўсіх, хто выступаў супраць паноў. Пазней, калі Ніл загінуў, яго атрад стаў рассяляцца па вёсках. Частка былых нілаўцаў пасялілася ў даволі глухім месцы - на правым беразе маленькай рэчкі Паплаўкі. Пабудавалі яны невялікую вёсачку. Пасля яе назвалі Нілаўцы-Воры, а яшчэ пазней – Вара-Нілаўцы.

# Нашчадак

Чаму ты думаеш, Ніл, што мы пойдзем за табою? – маладога селяніна з грубымі, вялікімі, як у сапраўднага аратага, рукамі і ўпартым высокім ілбом акружылі з усіх бакоў аднавяскоўцы.

– Вы не можаце кінуць мяне зараз, калі я, урэшце, даведаўся, хто адзіны сапраўдны нашчадак князя Сапегі.

– Мы не верым табе. Ці зможаш даказаць, што ты князеў сын?

– Так кажа мая маці - Марына. А кожны з вас ведае, што няма ў нашым сяле больш сумленнага чалавека.

Шум спрэчкі перапыняе голас саракагадовай, яшчэ вельмі прыгожай жанчыны:

– Браты, чаму вы не верыце майму сыну? Успомніце, як аднойчы позняй восенню ў нашы мясціны заблукалі двое паляўнічых. Я тады была яшчэ зусім маладзенькай, і маці марыла аддаць мяне замуж за багатага. А тыя двое казалі, што яны – княжацкія лоўчыя, і маці запрасіла іх пераначаваць у нашай хаце. Замуж мяне не ўзялі, не роўняй аказалася маладому госцю, бо ён быў не лоўчы, а князь. Але вось сына падараваў мне вялікі Сапега. Ніл – Сапегаў нашчадак, і таму мае, напэўна, права на спадчыну.

– Марына, скажы, калі ласка,– выходзіць наперад сівы селянін з добрымі вачыма,– ці ведаў князь пра сына?

– Я хацела паведаміць яму пра гэта яшчэ дваццаць гадоў назад, але мяне нават не пусцілі ў палац,– уздыхае жанчына.

Сціхаюць людзі. Яны ўражаны і разгублены.

– Цяпер вельмі цяжка даказаць штосьці,– кажа сівы селянін. – Князь памёр, і ніхто не пацвердзіць правы твайго сына.

Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы

– Наадварот, толькі зараз і трэба пачынаць дзейнічаць,– гарачыцца хтосьці. – Сам Сапега ніколі б не згадзіўся прызнаць Ніла сваім нашчадкам. Але ён памёр, і няма нікога больш вартага прыняць яго спадчыну, чым Ніл.

– Правільна! – чуюцца крыкі. – Хай Ніл будзе нашым панам!

– Хто пасмее пярэчыць нам з-за таго, што Марына не мела шлюбу з князем? Затое Ніл – старэйшы з усіх Сапегавых дзяцей!

– Няхай прызнаюць яго правы, а не то мы пакажам ім, як могуць простыя людзі змагацца!

– Хопіць крыўды! Ніл, абяцай, што будзеш шкадаваць сялян, і мы – твае!

Шум усё большае. Цяпер ужо крычаць і жанкі:

– Колькі цярпець нам прыніжэнні ад паноў? Кожны з іх толькі і глядзіць, каб пакрыўдзіць безабаронную жанчыну. Дабівайся, Марына, справядлівасці! Ужо калі ты выгадавала княжацкага сына, то павінна за гэта хаця б штосьці мець!

– Я даб'юся сваіх правоў,– ціха кажа Ніл, і Марына з гонарам і пяшчотай глядзіць на яго.

У Ружанах было неспакойна. Пранесліся чуткі аб з'яўленні князя-самазванца. У цэрквах святары ўжо пелі яму анафему. А ў сваім пышным пакоі зачыніўся раз'юшаны малады Сапега, не жадаючы бачыць нават уласную маці і братоў. Сяляне былі гатовы прызнаць Ніла сваім гаспадаром, бо, пражыўшы дваццаць гадоў у сялянскай сям'і, не мог ён, па іх разуменні, забыць пра беды і крыўды простых людзей. Іншыя маладыя мужыкі далучыліся да Ніла, астатнія з цікаўнасцю чакалі, чым усё скончыцца.

Калі стала зразумела, што мірам Нілу ніколі не дабіцца прызнання сваіх правоў, у Ружанскай пушчы з'явіўся новы гаспадар. І з таго часу Сапегі пачалі сапраўдную вайну супраць бунтаўшчыкоў-сялян. Год трымаліся нілаўцы, але сілы былі няроўныя...

Сумнай была гэтая апошняя вячэра. Ніл сядзеў моўчкі і здаваўся значна старэйшым, чым быў на самой справе. Ніхто не сумняваўся, што заўтра прыме смерць, бо з усіх бакоў іх лагер быў акружаны войскамі, выклíканымі Сапегам для знішчэння небяспечнага саперніка.

– Няўжо нам не застаецца нічога, акрамя таго, каб як мага даражэй прадаць сваё жыццё? – спытаў нехта.

– Ёсць выйсце,– хмура адказаў Ніл. – Учора на плошчы каля царквы быў абвешчаны ўказ: «Сапегі згодны дараваць усім ашуканым людзям, калі яны выдадуць яго, звязанага, у рукі сапраўднага князя». Гэтую вестку прынесла мая маці, Марына. Салдаты прапусцілі яе да нас дзеля гэтага.

Узнімаецца шум абурэння:

– Як дрэнна ты думаеш пра нас, Ніл!

– Хіба мы заслугоўваем гэтага?

– Мы не здраднікі!

– Ты сапраўдны князь, мы прызнаём толькі цябе! Ніл з хваляваннем і падзякай аглядае твары людзей, што засталіся верныя яму, нягледзячы ні на што.

– Тады – смерць, слаўная смерць дзеля праўды. Мы загінем разам, падтрымліваючы адзін аднаго ў цяжкі час, засланяючы адзін аднаго ўласным целам, як брата. І нам не будзе нічога шкада, і нам не будзе страшна.

Некалькі чалавек ускокваюць, каб моцным мужчынскім абдымкам прыціснуць да сябе Ніла. Не, не панам, не ўладаром над сабою адчувалі яны яго ўвесь гэты час. Быў Ніл для іх братам, сынам. Быў Ніл жывым увасабленнем справядлівасці, якой пакуль не змаглі яны дабіцца. І ніхто не заўважыў, як збоку за імі назіралі жаночыя вочы, поўныя тугі і адчаю. Марына не думала зараз пра сына. Яна ведала, што не існуе сродка, каб захаваць яго жыццё. Але разам з ім павінны былі прыняць смерць і ўсе гэтыя добрыя, прыгожыя, праца-

вітыя людзі, што паверылі ёй і заступіліся за яе гонар. Яна думала пра іх сем'і, пра жанчын, якіх ведала і любіла, сваіх сябровак, дзяцей, якім давядзецца з маленства даведацца пра сіроцкую долю.

І Марына выйшла наперад - маленькая, слабая. І ўпала на калені:

– Даруйце мне, землякі! Зманіла я вам. Не Сапегаў сын мой Ніл. Селянінам быў яго бацька, звычайным, як і ўсе мы. Славы хацела, багацця хацела для Ніла – толькі смерць здабыла і яму, і вам. Ратуйце ж сябе дзеля родных вашых. Выдайце сына майго Сапегам!

І цішыня павісла над лесам. І маўчалі людзі доўга, як у той час, калі паведаміла ім Марына, што яе сын – нашчадак князя.

– Не трэба было табе казаць нам пра гэта зараз,– павольна прагаварыў хтосьці. – Лепей было б для нас, не ведаючы, смерць прыняць. Таму што ніхто ўсё роўна не здрадзіць нашаму атаману. Не дазволіць зрабіць нам гэта ўласнае сумленне. Бог даруе табе за хлусню, Марына, як даруем зараз мы ўсе.

– Але не я! – крыкнуў раптам Ніл, кідаючыся да жанчыны. – Маці, што нарабіла ты? Навошта? Аднавяскоўцы! Няма маёй віны ў тым, што здарылася. Не ведаў я нічога. Але калі ёсць у вас сумленне, дык і ў Ніла яно маецца. Сам аддамся ў рукі сваім ворагам. Няхай шыбеніца – я заслужыў яе, затое ўсе вы будзеце жыць. Дараванне...

– Даравання не будзе,– хрыплым голасам, непадобным на свой звычайны, вымавіла Марына. – Каб атрымаць дараванне, сыне, яны павінны выдаць цябе. Яны, а не ты сам.

– Вяжыце мяне, людзі!–ціха казаў Ніл. –Не трэба лішняй крыві...

Шыбеніцу паставілі на плошчы. Паглядзець на пакаранне прыйшоў увесь горад, былі тут і людзі з навакольных вёсак. Асобна ад усіх стаялі былыя разбойнікі-нілаўцы, якія атрымалі дараванне цаной жыцця свайго атамана. На іх глядзелі з недаверам, амаль з нянавісцю. І нілаўцы, адчуваючы гэта, нізка схілялі галовы і хавалі вочы.

З вялікай годнасцю і высакароднасцю, як мог бы зрабіць толькі нашчадак князя, узышоў на памост, насустрач сваёй смерці, Ніл. І калі няўмольна зацягнулася вакол яго моцнай шыі пятля, міласэрная смерць закрыла вочы Марыны. Без крыку, без стогну ўпала маці на рукі аднавяскоўцаў мёртвай...

Доўга не пакідалі страшэннага месца нілаўцы. Яны апусціліся на калені проста на брук, вусны іх ледзь чутна варушыліся. Што шапталі яны? Маленне альбо проста апошняе «даруй»?

На другі дзень нілаўцаў пад аховай прывялі на пустэчу, дзе было дазволена ім жыць. І хутка ўзнікла невялічкае паселішча адрынутых. І пэўны час нікому не дазвалялася мець справы з яго жыхарамі. Гасцям з іншых мясцін сяляне звычайна тлумачылі гэтую забарону словамі: «Тут жывуць вары-нілаўцы». Хутка вёска пачала называцца Варанілаўцы, а потым і Варанілавічы.

Да гэтага часу захавала яна сваю назву.

Ранішнюю цішу прарэзаў пранізлівы крык цёткі Юзафіны:

– Ды людцы мае добрыя! Што гэта такое на свеце белым робіцца? Як праўды няма, навошта ж жыць?!

З хат пачалі выглядаць заспаныя твары лоўчых, конюхаў, кавалёў, сабакароў, кухараў, віначэрпаў – усіх тых, хто быў перасѐлены ў гэтыя мясціны па загаду князя, каб у час доўгіх асенніх паляванняў у навакольных лясах мець пад рукою ўсё неабходнае.

– Ну і чаго ты раскрычалася зноў? – незадаволена спытаўся майстар-збройнік Чамота, змрочны, аброслы дрымучай рудой барадой.

– Клічу ліха на галаву праклятага Курылы! – адазвалася тоўстая Юзафіна з магутнымі рукамі прачкі. – Паслухайце толькі, людзі добрыя, ён жа, ліхадзей, кветачку маю майскую, Анэлечку маю бедненькую зганьбіў, пакрыўдзіў дзяўчыну, на ўвесь свет зняславіў!

Бразгаючы дзвярыма, на хаду апранаючы кашулі, збіваліся ля Юзафіны людзі.

– Не румзай, кажы ўсё як было! – уладна звярнуўся самы старэйшы і паважаны ў гэтым паселішчы чалавек - каваль Вусеня.

– Што расказваць,– ацёрла далонню слёзы цётка. – Панадзіўся, пракляты, да нас у хату хадзіць, каб яму ўсе ногі пераламала! Прыйдзе, ціхенькі такі, пасядзіць у куточку ды пойдзе. Са мною ўсё размаўляе, а на Анэльку толькі зрэдку вока кіне. Ну, я, дурніца, і радуюся: паважае госць старэйшых, добры, разважлівы. Аднойчы кажа: «Я, цётка, мабыць, вашу Анэлю сватаць буду». А мне, удаве, і няўцям, што словамі такімі жартаваць можна. Дазволіла я ім як жаніху з нявестай адзін на адзін сустракацца. А ўчора прыходзіць дамоў Анэлька ўся ў слязах. Сілай узяў дзяўчо слабое, паскуднік. Потым жа і пасмяяўся. Кажа: «Разбэшчаная ты дзеўка, Анэля. Перадумаў я жаніцца»...

Загаманілі людзі, заспрачаліся. Шмат каму ў жыцці шкоды нарабіў самаўпэўнены Курыла. Быў ён лепшым сабакаром у князя. Ведаючы, як яго цэніць гаспадар, канчаткова зазнаўся Курыла. Нагаворваць пачаў на сваіх сяброў: той, маўляў, дрэнна пра князя казаў, іншы замест княжай службы п'янствуе ды пяе непрыстойныя песнІ, трэці крадзе з княжых сілкоў здабычу. Доўга не разумелі людзі, чаму на іх сыплюцца пакаранні. Потым даведаліся. Спрабавалі былі апраўдацца перад князем, адкрыць вочы на ўчынкі яго любімца. Але дарэмна...

– На сваёй зямлі я сам суджу сваіх людзей, і законна тут толькі тое, што я лічу законным. А я лічу вінаватымі вас,– ганарліва адказаў ім князь.

Вытрымалі несправядлівасць і крыўду людзі, але пасля гэтага кожны перастаў размаўляць з Курылам. Ды яму гэтага і не трэба было: хадзіў па паселішчы, як вялікі пан, і толькі высочваў, пра што яшчэ можна данесці князю?

Хутка з існаваннем Курылы звыкліся, як з існаваннем клапа ў хаце, прывучыліся размаўляць адзін з адным намёкамі ды сціхаць пры набліжэнні княжацкага даносчыка.

Але новае зло, здзейсненае Курылам, было да таго брыдкім і незразумелым, што ўжо ніхто не здолеў змаўчаць. Ціхая, працавітая Юзафініна дачка была адзінай нявестай у паселішчы (калі не лічыць крывой рымаравай дачкі), і таму вочы многіх маладых мужчын былі звернуты да яе. Ніхто з іх ніколі не адважыўся б не тое што пакрыўдзіць Анэлю, але нават сказаць пры ёй грубае слова. Курыла пасмяяўся не толькі над безабароннай дзяўчынай, але і над пачуццямі ўсіх мужчын паселішча.

– Гайда, хлопцы, да Курылы! Паб'ём яго ўсёй грамадой, паскудніка!– –крычалі адны.

– Вылегчыць распусніка! – лемантавалі іншыя.

– Усё дрэнна! Трэба яго прымусіць ажаніцца з Анэляю,– супакойвалі сяброў самыя разважлівыя.

– А навошта ёй такі муж? – горача пярэчылі самыя нецярплівыя.

– Ціха! – крыкнуў Вусеня. – Слухайце мяне ўважліва. Якое б рашэнне мы ні прынялі наконт даносчыка і паскудніка Курылы, яно павінна быць зроблена праз справядлівы суд. Мы ж не разбойнікі, а сумленныя людзі.

– Прабач, Вусеня,– адклікнуўся збройнік Чамота. – Пра які суд ты кажаш? Хіба князь дазволіць судзіць свайго лепшага сабакара? Хіба не ўпэўнілі нас усіх у тым, што нашы пачуцці, нашы словы і нашы жаданні тут не значаць нічога? Княжы суд...

– А хіба я казаў пра княжы суд, Чамота? – перабіў стары каваль. –Мы самі будзем судзіць ліхадзея, і не толькі за гэты ўчынак, але і за ўсе нашы крыўды.

– На князевай зямлі мы не маем права нікога судзіць без дазволу гаспадара,– уздыхнула цётка Юзафіна.

– Так, але мы можам судзіць яго на сваёй зямлі.

– Якая ў нас зямля? Пра што ты кажаш?! Хіба мы – князі? – пачуліся пытанні.

– Слухайце мяне ўважліва,– сказаў Вусеня. – Князь наш неаднойчы гаварыў нам, што, акрамя зямлі, на якой трымаюцца куты нашых хат, нам нічога не належыць. Няхай жа гэтай ноччу кожны прынясе па поўным вядры зямлі з-пад уласнай хаты. Мы ссыплем яе пасярод лясной ракі, з якой бярэм ваду. І калі атрымаецца невялічкі астравок, то ён будзе належаць не князю, а нам. Кожнаму з нас у аднолькавай меры. На астраўку гэтым я прапаную склікаць наша веча, калі ўзнікне ў гэтым патрэба. Там разбяромся мы з Курылам, і ніхто не пасмее сказаць, што суд наш над ім быў незаконны...

Усю ноч пры святле паходняў пасяляне насілі вёдрамі зямлю на сярэдзіну ракі. І яшчэ да раніцы ўзнік востраў Веча. Але Курыла, адчуўшы небяспеку, кінуўся бегчы. Яго дагналі ўжо амаль на ўскрайку лесу. Адбылася сутычка, у якой смяротна быў паранены збройнік Чамота. Рашэнне першага збора на востраве Веча было суровым - пакаранне смерцю.

Калі князю данеслі аб расправе над сабакаром Курылам, спакой пакінуў яго. Ён зразумеў: тыя, каго ён прывык лічыць не нашмат разумнейшымі за жывёл, перасталі быць такімі. І яшчэ ён зразумеў: нарадзілася вялікая сіла – прага да волі, якая, калі ён будзе супрацьстаяць ёй, знясе яго са свайго шляху, як вада па вясне зносіць дамы і вывернутыя з карэннем дрэвы. Таму ён не мог забараніць людзям чыніць суд на востраве Веча. З вострава Веча пачаўся вольны горад Пружаны з яго Магдэбургскім правам. Ад вострава Веча атрымала сваю назву маленькая рака Вец, якая, злучаючыся з такой жа маленькай Мухай, утварае блакітны Мухавец.

## Пра горад Пружаны і раку Мухавец

Калісьці, яшчэ за даўнім часам, расказваюць палешукі, задумала каралева Бона залажыць свой горад на рацэ Мухавец. Села яна ў карэту, узяла з сабой сваё дзіця і адправілася з ім у далёкую дарогу. Доўга ехалі яны ці мала - хто ведае, аднак пад'язджаюць да ракі Мухавец. Хоць і не надта шырокай ды глыбокай была тая рака, ды ўсё ж праз яе быў пракладзены такі-сякі мост.

Не вытрымаўшы карэты з чацвёркаю коней, ён раптам пачаў трашчаць. Карэта разам з усімі апынулася на дне ракі, дзе вадзіўся, казалі людзі, нейкі змей-вадзянік. Ён хапануў тое дзіця ў адзін момант і знік, толькі яго і бачылі. Паспелі выхапіць адтуль перапалоханую каралеву. Ледзь жывую, з крыкам і енкам, выцягнулі з вады яе слугі. А калі апрытомнела ды даведалася, што сталася з яе дзіцем, яна закляла тое месца:

– Каб гэты Мухавец зышоў на мізінны канец.

Так з таго часу і пайшло: улетку, калі моцна прыпякала сонца, рака ў тым месцы перасыхала і заставалася ў ёй вады вельмі мала. Людзі кажуць - на мізінны палец.

А пасля каралева Бона залажыла на гэтым месцы горад і назвала яго Пружаны.

# Вандроўка каралевы

Ніколі яшчэ рака Муха не была такой прыгожай: расквечаная гірляндамі з аксамітных кветак (жывыя ўжо паспелі адцвісці) і тысячай рознакаляровых агнёў, яна падобна на нейкую райскую дарогу, па якой, мабыць, маюць права хадзіць толькі бессмяротныя душы праведнікаў.

Натоўп апранутых па-святочнаму мужчын і жанчын шуміць па абодвух берагах. Іх сагнаў сюды суровы наказ, але, нават, калі б не было яго, сустракаць каралеву выйшла б усё наваколле. Усе з нецярпеннем углядаюцца ўдалечыню: вось-вось павінна бліснуць там у промнях заходзячага восеньскага сонца залачоная ладдзя.

На самым высокім месцы размясціліся музыкі. Здаецца, веі іх зараз звядзе адчайная сутарга – ім першым належыць убачыць каралеву, каб пяшчотнай музыкай вітаць яе з’яўленне. Усё павінна быць весела і бесклапотна, як у роднай краіне Боны – Італіі. Такое рашэнне намесніка каралеўскай улады ў горадзе Дабучыне. Занадта ўжо сумная, кажуць, апошні час пані каралева, усё часцей павяртаецца ў час малітвы не да алтара, а ў той бок, адкуль была яна прывезена ў гэты дажджлівы, ветраны край. Няўжо ж не ўзрадуе яе такі прыём?

Вось празвінелі над ракой ціхія гукі лютні; уразлівую, распешчаную мелодыю, якая так не пасуе да беларускіх палёў і халодных водаў Мухі, падхапілі іншыя інструменты. Картэж каралевы паказаўся ўдалечыні...

А вось і сама Бона – журботная, худая жанчына з вялікімі сумнымі вачыма. Быццам нейкая таемная хвароба сушыць усё яе цела, выядае румянец, утрымаць які марна імкнецца яна заморскімі румянамі. Здаецца, нічога не вабіць тут яе, і сама яна не тут, а ў сваіх нікому не адкрытых думках. І тыя, хто знаходзіцца побач з ёй у ладдзі, адчуваюць сваю непатрэбнасць ёй і збянтэжана маўчаць.

Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы

І толькі адна істота шчаслівa і шчыра захапляецца і бляскам агнёў, і гукамі лютні. Гэта маленькі паж каралевы - цудоўнае залатавалосае дзіця год дзесяці. Толькі пазіраючы на яго раз-пораз, каралева як быццам вяртаецца ў гэты свет, што напоўнены гукамі і фарбамі, сумная маска знікае з яе твару – яна ажывае.

Паўгода назад гэтага хлопчыка прывёў да каралевы нейкі мужчына з радаснай, адкрытай усяму свету, усмешкай і блакітнымі, як неба ў летні дзень, вачыма, знатны, але збяднелы беларускі шляхціц з цяжкім для італьянскай мовы імем. Ён сказаў: «Глянь, сынок, якая прыгожая ў цябе пані. Пакляніся ж стаць сапраўдным мужчынам і абараняць яе, пакуль хопіць жыцця». І хлопчык усміхнуўся таксама шырока і шчыра.

Злыя языкі, якія схільныя да плётак, кажуць, быццам пасля часта іх бачылі разам - Бону і яснавокага мужчыну, і быццам у час сустрэч бянтэжылася і чырванела каралева як дзяўчынка (што толькі не ўбачаць людзі!).

А потым ён знік, і хлопчык застаўся пры двары. Сёй-той пагаворваў, што са шляхціцам расправіўся, прыраўнаваўшы жонку, кароль, але гэта не было праўдай. Ён прыняў смерць у сумленным паядынку ад рук свайго суседа.

Залачоная ладдзя ўплывае ў горад – тут рака становіцца найбольш глыбокай і небяспечнай, і таму весляры замаруджваюць ход. Радасныя дабучынцы бягуць за картэжам каралевы і нешта крычаць. Ужо прывыкшае да варварскай гаворкі вуха Боны распазнае пажаданні шчасця і здароўя. Звычайныя словы – як часта даводзіцца чуць іх ёй!

Ці не значаць для яе шчасце і здароўе адно і тое ж? Было б здароўе, каб была яна шчаслівай. І пякучая туга не паслала б яе ў гэтую вандроўку. І, хто ведае, можа, у гэтага маленькага пажа быў бы брат...

Каралева абрывае свае думкі – ёсць нешта, аб чым нават яна не мае права марыць. Але трэба адказаць як-небудзь на прывітанні. Бона ўзнімае руку, каб блаславіць падданых. І раптам пярсцёнак, вялікі залаты пярсцёнак – шлюбны

падарунак караля – злятае з яе пальца і падае ў ваду. Не адразу зразумелі слугі, а, усё зразумеўшы, недаравальна замарудзіліся. Таму што тут жа за пярсцёнкам у раку паляцела маленькае цельца пажа. Натоўп уздыхнуў, каралева ўскрыкнула. І вось ужо некалькі моцных успляскаў сведчаць пра тое, што за хлопчыкам кінулася адразу некалькі воінаў Боны.

Тое, што доўжылася некалькі хвілін, здалося вечнасцю... Потым хтосьці дужы, ухапіўшыся за край ладдзі, перавальвае нешта мокрае, маленькае, але цяжкое. Бона кідаецца да дзіцяці. Ён – мёртвы, і ў руцэ сваёй сціскае пярсцёнак. Плывец тлумачыць нешта пра сутаргі ў халоднай вадзе, пра хуткасць плыні. Яго ніхто не слухае. Усе глядзяць на каралеву, якая, забыўшыся на ўсё, галосіць над маленькім тапельцам. І нічым не адрозніваецца яна ў гэты час ад некаранаванай жанчыны.

Нельга зразумець, што крычыць Бона ў непрытомнасці. Чуецца толькі адно слова, настойліва паўтарае яна:

«Пружна!.. Пружна!..»

Каралева праклінае раку, загадвае ёй высахнуць, зрабіцца пустой, «пружнай».

Кажуць: менавіта з таго часу і стала мялець рака Муха, а горад Дабучын атрымаў другую назву – Пружаны

# Жаночы суд

Раз у год, у той час, калі снег яшчэ толькі пачынае сыходзіць з палёў, а абуджаныя вясною дрэвы яшчэ стаяць голыя, уздрыгваючы пад халодным ветрам, паміж дзвюма высокімі хваінамі, што знаходзяцца на шляху ад Пружан да Ражковічаў, з'яўляецца страшэнны прывід – Балотная Княгіня. Як узнятая з бярлогі ранняй вясной галодная мядзведзіца, пачынае шукаць яна сваю ахвяру. І менавіта ў гэты час у тыя мясціны трапляе мужчына, які за сваё жыццё ўчыніў шмат грахоў у адносінах да жанчын. Яго чакае Балотная Княгіня на справядлівы суд...

Так гаворыць старое паданне. Зараз мала хто верыць у яго, але і да нашага часу іншы раз можна пачуць у гэтых мясцінах дзіўную гісторыю, якая, па сцвярджэнні некаторых старажылаў, адбылася не так ужо і даўно – у мінулым стагоддзі.

Язэп быў прыгожы статны малады чалавек. Такія падабаліся дзяўчатам. І, адчуваючы гэта, высока трымаў галаву Язэп у час святаў ды гулянак, калі абступалі яго з усіх бакоў мясцовыя красуні.

Аднойчы вечарам вяртаўся Язэп з горада дадому. Стомленая кабылка ледзь цягнула даверху нагружаны пакупкамі воз. Хутка цямнела, заставалася яшчэ праехаць значны кавалак шляху. Язэп пачаў хвалявацца: у такі час нярэдка падарожных спынялі рабаўнікі. Раптам кабылка рванулася ад страху і заіржала. Усяго за тры крокі ад яе на шляху ўзнікла чалавечая постаць. Уздрыгнуў і Язэп, але амаль адразу супакоіўся. Гэта была ўсяго толькі маладзенькая дзяўчына ў вясковым кажуху і квяцістай хустцы.

– Дзядзечка! Падкіньце да Ражковічаў,– тоненькім галаскам папрасіла яна.

– Які я табе дзядзечка! – буркліва адказаў Язэп і прыпыніў кабылу, каб нечаканая папутчыца ўзабралася на воз.

Пэўны час яны ехалі моўчкі. Потым разгаварыліся. Дзяўчына паведаміла, што яе клічуць Любкай і што бацька яе – каваль з Ражковічаў. Затрымалася яна ў гасцях у замужняй сястры, забылася зусім, што строгія бацькі наказалі ёй быць дома яшчэ да прыцемкаў. Весела смяялася румяная, бы яблык, Любка, і заўважыў Язэп, што вельмі прыгожая кавалёва дачка. Страх жа яго начны зусім прайшоў, бо недалёка цяпер былі Ражковічы, і ўжо даносіўся да іх скрозь цемру цёплы пах чалавечага жытла. І Язэп нечакана спыніў кабылу, сціснуў у абдымках харошанькую папутчыцу і паваліў яе на клункі з набытым у горадзе дабром. Далёка разнёсся крык спалоху і адчаю. Здалося, што ўскалыхнуў ён нават абыякавае да ўсяго лясное балота.

І тады нечая халодная вільготная рука апусцілася на Язэпава плячо. Ён узняў галаву і моўчкі вызваліў сваю ахвяру. Нібыта ўсё цела яго працяла наскрозь нервовая сутарга. Проста над ім схіліўся чыйсьці белы, бы маска, страшэнны твар з бяскроўнымі вуснамі і велічэзнымі зялёнымі вачыма. Доўгія белыя валасы пасмамі падалі на плечы. Адзенне было таксама белае і доўгае. Язэп не мог адвесці вачэй ад здані. Ён нават не заўважыў, як кавалёва дачка скочыла з воза і, размазваючы па шчаках слёзы крыўды, кінулася бегчы ў бок сяла. Ён быццам аслупянеў.

– Няўжо табе мала таго зла, што ты ўжо нарабіў, Язэп? – пачуўся рыпучы гук, так непадобны на голас жывога чалавека. – Навошта ты хацеў пакрыўдзіць гэтае дзяўчо? – спытала здань, і Язэп не мог знайсці ў сабе сілы, каб што-небудзь адказаць.

Тады прывід стаў расці, пакуль галава яго не апынулася на ўзроўні вершалін дзвюх высокіх магутных хваін.

– Ідзі за мною, Язэп, бо я – Балотная Княгіня,– прагрымела, нібы гром з неба,– цябе чакае справядлівы суд!

Ногі самі панеслі няшчаснага Язэпа ў самы гушчар лесу. Ён ішоў, і перад вачыма яго ўзнікалі дзіўныя міражы: доўгія і шырокія рэкі, велізарныя палі

і лугі, гарады, акружаныя высокімі драўлянымі сценамі і рвамі. Ён ужо стаміўся здзіўляцца, калі яго страшэнная спадарожніца раптам спынілася на ўтульнай лясной палянцы, якая, нягледзячы на яшчэ халодную пару, была падобна на яркі дыван з жывых кветак.

– Ты – вялікі грэшнік,– казала Балотная Княгіня, якая зноў паменшылася да чалавечага памеру. – Але не мне судзіць цябе. Хай гэта робяць тыя, хто мае на гэта больш правоў.

І толькі тут заўважыў маладзён, што вакол яго, амаль нябачныя, быццам сатканыя з туману, мітусяцца няясныя постаці. Яго здзівіла, што ўсе яны – жаночыя. Але ён не паспеў нават нічога сказаць, бо наперад выйшла адна з іх, у рысах якой ён убачыў дзіўнае падабенства з нябожчыцай Марылькай – вясёлай сяброўкай яго дзяцінства. Яны раслі разам, разам гулялі ў свае дзіцячыя гульні, і не было дня, каб не ўспомнілі адно пра аднаго. Аднойчы, роўна дзесяць гадоў таму, яны пабеглі на возера катацца на санках. Лёд быў слабы, Марылька раптам праваліласа і пачала тануць. Была хвіліна, калі Язэп мог падаць ёй руку, але спалохаўся, што дзяўчынка ўцягне яго за сабой у ваду, і пабег з крыкам аб дапамозе.

Марылька патанула... Назаўсёды запамятаў Язэп яе мёртвы тварык з застылым на ім страхам і дакорам, калі вясковыя мужыкі выцягнулі маленькую тапельніцу з вады. Зараз Марыльчын твар узнік перад ім.

Марылька ледзь чутна прашаптала:

– Я абвінавачваю цябе ў злачыннай баязлівасці, Язэп. Ты заслугоўваеш смерці.

Прамовіла і адышла. На яе месцы з'явіўся другі цень. Язэп адразу пазнаў сваю сястру Зосю, якую пахаваў два гады таму. Зосі не пашанцавала з мужам, бо ім аказаўся стары раўнівец. Язэп аддаў за яго сястру на правах адзінага мужчыны ў сям'і, пакваліўшыся на вялікае багацце. На вяселлі нявеста горка плакала. Але ці варта звяртаць увагу на капрызы шаснаццацігадовай дзяўчыны?

Гэтай жа думкі прытрымліваўся Язэп і тады, калі аднойчы ўначы Зося ў адной сарочцы прыбегла да брата з мальбой выратаваць яе, схаваць ад раз’юшанага мужа. Язэп не толькі не схаваў сястру, але сам перадаў мужу ў рукі, які той жа ноччу забіў Зосю, прыраўнаваўшы да кагосьці з вясковых хлопцаў.

Зося цвёрда вымавіла, гледзячы з нянавісцю прама ў Язэпавы вочы:

– Я абвінавачваю цябе ў чэрствасці і асуджаю на смерць.

І ад слоў гэтых пахаладзела ўсё ўнутры ў Язэпа. За спінай Зосінага ценю з’явіўся яшчэ адзін, надзвычай худзенькі, з хваравітым тварам.

– Янка... – аднымі вуснамі прашаптаў Язэп. Янка была звычайнай вясковай дзяўчынай, не вельмі прыгожай, не вельмі разумнай, але ласкавай і добрай. Не аднойчы Язэп лавіў на сабе яе захоплены пагляд, і гэта падабалася яму. У іх было шмат агульных начэй і ранкаў. Аднойчы Янка прызналася свайму каханаму, што марыць быць яго жонкай і мець ад яго шмат дзяцей. І, можа, Язэп не кінуў бы гэтую сціплую працавітую дзяўчыну, калі б на шляху яго не ўзнікла Вераніка... Казалі потым, што Янка ў адчаі пайшла да вясковай знахаркі, каб пазбавіцца ад Язэпавага дзіцяці, якое хутка павінна было ў яе нарадзіцца, і ад гэтага памерла...

Нават не чуючы яе прысуду, Язэп ужо здагадаўся, што ён такі ж, як Марылін і Зосін. Янка вінаваціць яго ў абыякавасці, а ён ужо глядзіць у другі бок, адкуль набліжаецца да яго, як лёс, цень Веранікі.

Ах, Вераніка-Вераніка... Што зрабіла ты з хлопцам! Навошта былі ў цябе такія сінія вочы, такія доўгія залацістыя валасы? Навошта ты была, як духмяная лугавая кветка?

Язэп вельмі кахаў яе, мабыць, таму ніяк не мог прызнацца ў сваіх пачуццях красуні. Баяўся, што яна адмовіць, і не хацеў заўважаць, як успыхвае нечаканай радасцю Веранічын твар пры сустрэчы з ім... Ён спазніўся са сваім прызнаннем. Вераніка стала жонкаю другога, і муж звёз яе ў чужую вёску. Там

яна, ціхая, гаротная, і памерла праз год, хаця, казалі, кахаў яе муж і ніколі не крыўдзіў. Памерла ад суму па тым адзіным, які не паспеў сказаць самыя важныя словы...

З надзеяй углядаецца Язэп у Веранічын твар. Няўжо яна не абароніць яго? Але самотны твар у каханай:

– Я абвінавачваю цябе ў нерашучасці. Ты павінен памерці...

І калі ў пятым ценю пазнае Язэп маці, рукі і ногі яго так слабеюць, што ён ледзь не падае. Сваю віну перад маці ён так добра ведае, што іншага прысуду, чым смерць, яму не варта і чакаць.

Але маці, доўга гледзячы на сына, раптам кажа:

– Ты ні ў чым не вінаваты.

Тут узнімаецца вялікі крык нязгоды.

– Хіба быў ён паслухмяным сынам табе, старая? – пытаецца Балотная Княгіня. – Хіба не зносіў у шынок апошнія твае грошы?

– Але тады ён яшчэ не зарабляў сам і не ведаў кошт грашам,– адказвае маці.

– Хіба ў той дзень, калі ты памерла, не весяліўся твой сын у карчме з сябрамі?

– Ён не ведаў, што я паміраю.

– Але нават калі даведаўся, што маці перад смерцю кліча яго, каб даць апошняе блаславенне, ён не прыйшоў да цябе.

– Тады ён ужо не трымаўся на нагах ад выпітага. Маё ж блаславенне я даслала яму з апошнім уздыхам, і яно павінна было знайсці яго, дзе б ён ні быў у той час.

Кожнае слова маці нібы ўваскрашала Язэпа з нежывых. Але Балотная Княгіня як сякерай па галаве сячэ:

– Ну, усё роўна. Большасць суддзяў патрабавала ягонай смерці. Ён памрэ.

Язэп адчувае, як некуды павольна падае. У твар яму заглядаюць няўмольныя зялёныя вочы Балотнай Княгіні. І раптам матчын цень робіць амаль няўлоўны рух, і нешта вялікае, яркае вылятае ў яе з-пад фартуха.

– Певень! Певень! – у жаху паўтараюць начныя прывіды. – Яна выпусціла пеўня, чый крык будзіць раніцу! Знікаем, сёстры, наш час скончыўся. Яна выратавала яго!

У прадранішнім холадзе звонка прагучаў крык пеўня, і ўсё паплыло перад вачыма Язэпа...

Яго выпадкова знайшлі вяскоўцы ляжачым амаль на краі балотнага акна. Кабылка ж Язэпава сама прыйшла дамоў і прывезла ўсе пакупкі – нічога не знікла. Але з таго часу сумны і маўклівы стаў Язэп. Доўга не казаў ён нікому пра свае начныя прыгоды і толькі ў глыбокай старасці, перад самай смерцю, прызнаўся ва ўсім людзям, павініўся перад імі.

Многія, можа, думаюць, што ўсё было зусім не так, і Балотную Княгіню Язэп проста прысніў, калі п'яны, не даехаўшы дамоў, зваліўся ноччу з воза? Хто яго ведае, што тут праўда, а што – хлусня. Але ўсім вядома: паданні проста так, без падстаў, не ўзнікаюць у народзе...

У пісьмовых помніках 1473 года (некаторыя называюць 1463) упамінаецца мясцовасць пад назвай Дабучын. З „Рэвізіі Кобрынскай эканоміі", складзенай у 1563 годзе, даведваемся, што гэты горад займаў значную плошчу (ў ім было 6 вуліц, рынак, 2 царквы).

Назва Пружана (сучасн. Пружаны) замацавалася з 1588 года, калі горад атрымаў магдэбургскае права.

Згодна з народным паданнем, Пружаны названы так у гонар дачкі ўладальніцы горада Прузэны. Гуляючы ля рэчкі, карміліца выраніла дзіця ў раку Мухавец, і яго ўхапіў змей. У памяць дзяўчынкі горад назвалі Прузана (Пружана). Гэта легенда, але яна ўвасоблена ў гербе, што дала Пружанам Ганна Гелонка ў 1588 годзе: блакітны змей, які трымае ў пашчы дзіця.

# Легенда пра недабудаваны касцёл

Амаль на ўскраіне Пружан стаіць маленькі акуратны дамок. Кажуць, якраз тут і жыла Барбара. Старая памерла ўжо, і новыя гаспадары паспяшаліся высечы старыя яблыні, якія яна так пяшчотна даглядала. Знікла кудысьці і ўсё хатняе начынне, што заставалася ад яе. Ды, мабыць, па часе ніхто б і не ўспомніў сівенькую гасцінную гаспадыню, каб не было яе жыццё звязана з таямнічай гісторыяй пра недабудаваны касцёл. Вось яна.

Барбара не памятала сваіх бацькоў – яны памерлі яшчэ маладыя. Дзяўчынку ўзяў на выхаванне стары садоўнік графа Швыкоўскага. Так яна апынулася ў Пружанскім маёнтку графа.

Вялікім дзіваком быў гэты самы Швыкоўскі. Вечарамі збіраючыся на кухні, у тоўстай кухаркі Тэрэзы, слугі са смехам расказвалі бясконцыя забаўныя гісторыі, галоўным героем якіх быў сам пан. Тэрэза, якая была і аканомкай, услых падлічвала, колькі грошай каштавала «старому дурню», каб разбіць вакол свайго жытла шыкоўны парк. Лёкай Яўхім крыўляўся, паказваючы, як пан іграе на скрыпцы. Хтосьці замагільным голасам паведамляў, што бачыў гаспадара маёнтка ў поўнач на скрыжаванні трох дарог, адна з якіх вяла на могілкі. Там ён кагосьці, быццам, чакаў. Жанчыны спалохана ўскрыквалі: «Матка Боска, не можа быць, каб Швыкоўскі знаўся з д'яблам!»

Мабыць, менавіта з-за гэтых вячэрніх гутарак у Барбары з'явілася вялікая цікавасць да гаспадаровай асобы. Усё часцей стала яна, прыбіраючы пакоі, затрымлівацца ў бібліятэцы і разглядаць тоўстыя фаліянты на паліцах. Барбара трохі ведала польскую мову. Але кнігі былі не толькі польскія. Потым ад самога пана Швыкоўскага даведалася яна, што сярод іх былі і стараславянскія, і рускія, і лацінскія, і грэчаскія, і французскія, і нават старажытнаяўрэйскія. Пан выпісваў шмат літаратуры па пошце і вечарамі, калі звычайна слугі збіраліся ў Тэрэзы, паглыбляўся ў чытанне. Калі Барбары даводзілася бачыць яго за гэтым

заняткам, яна замірала каля дзвярэй і доўга стаяла так, імкнучыся зразумець па гаспадаровым твары, пра што кніга, над якой ён схіліўся. Аднойчы, рэзка адкінуўшы чытанне, Швыкоўскі пачаў хутка маляваць штосьці на вялікім аркушы паперы. І Барбара не вытрымала, падышла бліжэй. Быццам загадзя ведаючы, што так адбудзецца, граф пачаў услых, як мага больш зразумела, тлумачыць Барбары свой занятак:

– Ці бачыш, мілая, я збіраюся пачаць пабудову касцёла. А гэта праект. Храм павінен быць прасторны і прыгожы, з ляпнінай, з арганам. Я ўжо ведаю, дзе можна дастаць цудоўную выяву Маткі Боскай. Гэта даволі старая скульптура. У яе вялікія самотныя вочы, як у маці, што сумуе аб лёсе сваіх няшчасных дзяцей. Хай плача дзева Марыя аб нашай долі, бо горкая яна...

Яго вочы раптам сталі суровыя і халодныя. У той вечар Барбара нічога больш не пачула ад гаспадара. Маўчаў ён і потым, але Барбара ведала ўжо: думка пра касцёл не пакідае пана ні ўдзень, ні ўночы. Ён разарваў некалькі аркушаў з планамі будаўніцтва, пакуль, урэшце, не зрабіў той, што задавальняў яго. Потым пачаліся ліхаманкавыя пошукі месца для пабудовы, потым – да графскай сядзібы пачалі з’язджацца майстры-будаўнікі. Швыкоўскі цяпер з’яўляўся позна, нават не павячэраўшы, кідаўся на ложак і засынаў.

Праходзячы непадалёку ад будоўлі, Барбара часта спынялася, каб паглядзець, што адбываецца. Адбывалася дзіва. Узыходзілі над зямлёй стройныя, беласнежныя сцены, быццам крылы анёлаў, распласталіся па баках аркі; строгім і мужным харалам гучала песня камення, што атрымала жыццё з чалавечых рук...

Мясцовы ксёндз з замілаваннем назіраў за нараджэннем «дома пана Езуса». Ён ужо бачыў сябе ў цэнтры ўзнёслага велічнага храма, чуў свой голас, які чытаў пропаведзь.

– Пан Швыкоўскі робіць вялікую справу,– часта гаварыў ксёндз, ліслівa зазіраючы ў вочы графа. – Пан Швыкоўскі – сапраўдны сын каталіцкай царквы...

Граф моршчыўся. Ён не вельмі шанаваў лянівага і няшчырага ксяндза і не дзеля яго ўдзячнасці ўзводзіў зараз касцёл.

Пра сапраўдную прычыну пазней даведалася Барбара з доўгіх начных размоў, што граф вёў з нейкімі дзіўнымі, чужымі людзьмі.

Гэта адбылося амаль адразу ж пасля таго, як у храме пачаліся ўнутраныя работы.

Уначы ў браму пастукаўся чалавек у чорным, падобным на крылы д’ябла, плашчы і такім жа чорным капелюшы з шырокімі палямі. Барбара правяла яго да гаспадара і крыху затрымалася ля дзвярэй. Яна чула здзіўлены голас гаспадара, ціхія, ледзь чутныя, словы госця.

Яны прагаварылі амаль усю ноч. Раніцай госць знік. У той дзень граф ужо не хадзіў на будоўлю, ён прасядзеў у сябе, робячы нейкія складаныя разлікі ў кнізе фінансавых выдаткаў.

Праз два тыдні госць з’явіўся зноў. Гэтым разам – не адзін. З ім быў малады хлапец з вялікімі, вельмі выразнымі шэрымі вачыма. Правая рука была ўкручана ў белае палатно і бездапаможна вісела на рамяні, перакінутым праз шыю. Барбара пачула ўсю размову з пачатку да канца.

– Вы смелыя людзі,– гаварыў гаспадар. – На вашым месцы я б не рызыкнуў з’яўляцца тут.

– У нас не было выбару,– адказаў чалавек у чорным,– за нашым братам сочаць. А ў Ружанскай пушчы яму пакуль нельга быць. Тыдзень-два, не больш, ён прабудзе ў вас. Добрая ежа і медыцынская дапамога – вось усё, што яму патрэбна.

У мяне няма чалавека, якому б я мог даручыць яго жыццё,– памарудзіўшы, сказаў Швыкоўскі.

Вы хочаце сказаць, што мы памыліліся, выбраўшы менавіта вас? – спытаў госць.

Доўгае маўчанне перарваў высокі юнацкі голас:

Музей і Асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы

– Кастусь перадае вам словы падзякі, пан Швыкоўскі. Ён папрасіў мяне сказаць вам, што зброя, набытая за вашы грошы, ужо страляе па ворагу.

Граф ад нечаканасці скінуў на падлогу мармуровую чарнільніцу, якую да гэтага нервова матузіў па стале.

– Ён сам сказаў так? Ён ведае пра мяне?

– На жаль, не так ужо багата ў нас сяброў, каб не ведаць іх прозвішчы.

Барбара ўжо здагадалася, што за госці з'явіліся ў яе пана. Разбойнікі самага лютага з лясных галаварэзаў – Каліноўскага! Яна неаднаразова чула пра тое, як гэтыя людзі спынялі на лясной дарозе купецкія абозы, наляталі на мястэчкі, дзе распраўляліся з чыноўнікамі, салдатамі, жандарамі і заклікалі простых сялян ісці ў лясы, далучацца да іх хеўры. Толькі Барбара ўяўляла іх падобнымі на казачных ліхадзееў: з густымі барадамі, у лахманах, з нажамі і пісталетамі за поясам. Гэты ж прыгожы юнак быў зусім не падобны на бандыта.

Пакуль Барбара раздумвала, дзверы шырока расчыніліся, і ўсе субяседнікі выйшлі. І тут граф заўважыў яе. Барбара нават не спрабавала ўцячы.

– Ты падслухоўвала нас? – спытаў Швыкоўскі. Яна моўчкі кіўнула. Цямнейшы за хмару зрабіўся твар графа, і невядома, што сказаў бы ён. Але паранены юнак паспеў раней:

– Ці можаш ты захаваць таямніцу? Я буду тваёй таямніцай, прыгажуня.

І не змагла адмовіць Барбара шчырай усмешцы яго шэрых вачэй.

Штодзень насіла ежу маладому паўстанцу. Рука яго хутка загойвалася, і ўсё часцей ён бываў у добрым гуморы, усё часцей размаўляў з дзяўчынай пра чыстае і светлае пачуцце, якое з'явілася амаль адразу, як убачыў яе. Барбара была шчаслівая. Цяпер ёй часта даводзілася прысутнічаць і пры размовах графа з шэравокім хлопцам. І ўсё больш і больш даведвалася яна пра таямніцу касцёла.

– Усю моц і прыгажосць духу чалавечага, усё імкненне наша да волі, незалежнасці, увесь агонь сэрца нашага хачу я ўславіць у камені. Касцёл будзе гімнам нашаму народу, які змагаецца зараз супраць прыгнёту чужынцаў, супраць іх веры,– гаварыў ён.

– Для многіх беларусаў родная вера – праваслаўе,– задуменна адказаў аднойчы юнак.

– Пасля таго, як папы сталі ў цэрквах заклікаць да пакорнасці тым, хто робіць замах на нашу волю і жыццё, да прыняцця чужых звычаяў, мовы, культуры, я лічу, беларус не можа называць праваслаўе сваёй верай. Магчыма, я памыляюся ў гэтым, але хто ў наш час можа быць упэўнены ў сабе?

Граф свята верыў у перамогу паўстання.

– Тады,– гаварыў ён,– касцёл мой стане трыумфальнай аркай для пераможцаў. І першым, каго мы абвянчаем у ім, будзеш ты,– ён паказаў на свайго госця,– альбо Барбара. А можа, адразу абое.

І ён усміхаўся, таямніча падміргваючы пачырванелай парачцы.

– А калі мы прайграем? – спытаў аднойчы юнак.

– Гэта немагчыма... Тады касцёл будзе рэквіемам па нашай справе. І не будзе ў свеце больш гаротнай мясціны...

Час ішоў. Шэравокаму паўстанцу трэба было вяртацца да сяброў. На развітанне ён пяшчотна пацалаваў Барбару. І гэта быў першы ў жыцці пацалунак, падораны ёй мужчынам. Калі б магла яна ведаць, што будзе ён апошні...

Праз некалькі тыдняў сярод ночы апошні раз з’явіліся ў доме Швыкоўскага паўстанцы. Сярод іх быў ужо вядомы Барбары чалавек у чорным плашчы.

Збірайцеся, пане Швыкоўскі,– сказаў ён. – Вам належыць пакінуць гэтыя мясціны. Мы разбіты. Многіх схапілі. І сярод іх трапіўся здраднік. Заўтра за вамі прыйдуць.

Граф моўчкі апрануўся, кінуў у камін некалькі лістоў дакументаў і клікнуў Барбару.

– Я адʼязджаю. Не ведаю, ці вярнуся. Але пра гэта не трэба нікому казаць. Ты хочаш спытаць штосьці?

– Так,–адказала яна ледзь чутна. –А што з тым маладым панам, які жыў у нас?

– Ён застаўся ў Ружанскай пушчы,– ціха адказаў граф.

– Ён вернецца?

– Не, бедная мая дзяўчынка. І ніколі не абвянчаюць вас у нашым касцёле, бо ўжо абвянчаны ён з куляй... Даруй яму, мілая, даруй нам...

Граф больш не вярнуўся да сваёй сядзібы. Лёс яго і па сёння таямніца.

Маладая графіня – спадчынніца, што зʼявілася пасля яго, дазволіла ксяндзу рабіць з недабудаваным касцёлам што ён захоча. На завяршэнне будаўніцтва даць грошы яна адмовілася. Хітры ксёндз палічыў больш выгадным прадаць амаль гатовы будынак праваслаўнай абшчыне, а на атрыманыя грошы паставіць маленькі, няўтульны, непрыгожы «Дом пана Езуса».

Але нядоўга служыў касцёл Швыкоўскага іншай веры. Пажар, што раптоўна ўспыхнуў, знішчыў яго. Прычыну не ўдалося знайсці.

Барбара сцвярджала, што падчас пажару бачыла сярод натоўпу кагосьці ў чорным плашчы. Але ці варта занадта давярацца яе аповедам?

# «Святы» Шэраш

Шарашоўскі кірмаш. Яркімі фарбамі расквечаны купецкія крамкі, блішчаць на сонцы золатам велізарныя яблыкі ў кошыках, спалохана квохчуць куры ў руках гандлярак, весела гучаць заклікі: «А вось гліняныя гаршкі!», «Каму, каму спелых сліў? Падыходзь! Хапай!», «Стужкі! Стужкі красуням у косы!». У самым цэнтры базарнай плошчы размясціўся батлеечнік. Дзесяткі разявакаў стоўпіліся вакол яго і са смехам назіраюць за пацешнымі прыгодамі мужыка, што спачатку лупіць кіем пана, потым – папа і, урэшце, самога чорта. Усім падабаецца вясёлы паказ. І толькі стары з вялікай калматай барадой, здаецца, не раздзяляе агульнага настрою. Ён пражыў ужо не адзін дзесятак гадоў на свеце і не ўпершыню прысутнічае на батлеечным спектаклі. Заўсёды паказваюць адзін і той жа сюжэт, толькі зрэдку штосьці мяняючы ў ім. Але ж вось гэтак, праз вясёлых лялек, можна расказаць людзям шмат пра што. Хаця б гісторыю Шэраша - таго легендарнага заснавальніка іх мястэчка. Гэта было б не толькі цікава. Гэта дапамагло б людзям захаваць памяць аб продках, якую яны ўсё больш і больш страчваюць. Вырашана: пасля спектакля стары падыдзе да батлеечніка і прапануе для яго лялек новы сюжэт...

***

Калісьці даўно на месцы Шарашова быў толькі лес. Не было нідзе паблізу чалавечага жытла, калі не лічыць маленькай бруднай карчмы, што стаяла на ўскрайку гандлёвага шляху, які праходзіў за некалькі вёрстаў адсюль. Хадзіла пра карчму дурная слава, быццам яе гаспадар водзіць сяброўства з ляснымі ліхадзеямі. З-за гэтага апусцела карчма, і даўно ўжо багатыя вандроўнікі не спыняліся ў ёй. Але аднойчы позным вечарам тут з’явіўся малады чалавек, багата апрануты, па ўсім відаць, шляхціц.

– Гэй, гаспадар! – гукнуў ён. – Вось табе залатоўка – за вячэру для мяне і авёс для майго каня. Я спынюся ў цябе на ноч.

Убачыўшы золата, неяк дзіўна блiснулi карчмаровы вочы. Кінуўся ён да нечаканага госця, кланяецца яму, усміхаецца, налівае самае лепшае віно, саджае на самае лепшае месца, адганяючы ад яго п’яных пастаяльцаў у лахманах, што ўжо былі абступілі з усіх бакоў маладога шляхціца. Тыя моўчкі адыходзяць і рассаджваюцца па кутках, змрочна аглядаючы адтуль госця. I доўга ў цішыні чуваць толькі ліслівы карчмароў голас, які прапануе маладому вандроўніку стравы. Але вось і ён сціхае і пакідае пастаяльца, каб паклапаціцца пра каня. Тады за стол да шляхціца падсаджваецца невядомы, хутчэй падобны на жабрака, чым на чалавека, які здольны заплаціць за ноч у карчме.

– Ты хто такі?–пытаецца ён у маладога чалавека пасля некалькіх хвілін маўчання.

– Гэтае пытанне павінен задаць я,– з гонарам вымаўляе шляхціц.

– Я магу адказаць табе, але баюся, што маё імя нічога табе не скажа. А даведаўшыся пра тое, хто ты, я мог бы дапамагчы табе,– гаворыць жабрак.

– Мне не патрэбна нічыя дапамога,– усміхаецца шляхціц,– пры мне мой гонар і шабля.

– Што ж, шкада, што ты адмаўляешся ад сяброўства са мною,–уздыхае незнаёмы і знікае.

Сярод ночы нешта прымусіла маладога госця прачнуцца і сціснуць дзяржак шаблі, якая знаходзілася заўсёды побач з ім. Рыпелі прыступкі, што вялі ў пакой, прапанаваны карчмаром для начлегу. Імгненне - і дзверы расчыніліся. У іх з’явіўся сам карчмар, які трымаў у адной руцэ свечку, а ў другой – вялікі нож. Свечка добра асвятляла яго бледны, перакрыўлены грымасай твар. Ён зрабіў некалькі крокаў у бок пастаяльца і спыніўся.

– А, вы не спіце?–прамовіў ён. –Што ж, тым горш...

Карчмар свіснуў, і ў пакой уляцела адразу шэсць чалавек.

Прытуліўшыся спінай да сцяны, шляхціц зграбна адбіваў удары, якія сыпаліся на яго. Некалькі разоў яго шабля трапляла ў нешта мяккае, і тады ў цемры чуліся лаянка і глухія стогны. Але і сам ён быў ужо ўвесь у крыві. І тады нечакана прыйшла дапамога. Нехта моцны і спрытны скочыў праз акно ў пакой, і ў галовы нападаючых паляцелі лава, шандалы, збан з вадой, што стаяў у кутку пакоя. Перавернуты дагары нагамі стол прыдушыў некага, цяжкая дубінка прайшлася па чыіхсьці рэбрах. І тады з ровам начныя забойцы кінуліся прэч з пакоя.

– Як мне аддзякаваць вам, мой заступнік? – цяжка дыхаючы, спытаўся шляхціц.

– Твой конь пад акном,– адказалі яму з цемры.

Пасля доўгай і хуткай скачкі два коннікі спыніліся, і шляхціц, які змог, урэшце, добра разгледзець свайго спадарожніка, са здзіўленнем пазнаў у ім учарашняга жабрака, які прапанаваў яму сяброўства.

– Можа, цябе здзіўляе, што ў мяне таксама конь? – адазваўся жабрак. – Дык гэта не мой, я вывеў яго з канюшні карчмара.

– За што яны хацелі забіць мяне? – спытаўся шляхціц.

– За твае грошы. Хіба ты не ведаеш, што такім людзям, як гэты карчмар, нельга паказваць золата?

– Але ж той залаты, якім я расплаціўся за начлег, быў у мяне апошні.

Хвіліну спадарожнік маладога чалавека здзіўлена глядзеў яму ў твар, а потым пачаў рагатаць. Ён споўз з сядла на зямлю і пачаў качацца па ёй.

– Вой, дурні, дурні! – чуецца праз смех. – Каб жа яны ведалі! Вось ужо сапраўды, па знешнім выглядзе яблыка ніколі не разгадаеш, ці не чарвівы ён! Глядзі, каго яны павінны былі рабаваць,– на далоні жабрака з’яўляецца незвычайнай велічыні дыямент, і вочы субяседніка становяцца здзіўлена-вялікімі.

Так нечакана пачалося сяброўства шляхціца з-пад Кракава Яна Красоўскага і вольнага чалавека Шэраша. Незвычайным быў лёс кожнага з іх. Збяднелы

Ян Красоўскі меў шчасце спадабацца адной з самых знатных дам пры двары караля. На жаль, у каханкі маладога прыгажуна быў раўнівы муж, які намогся і канчаткова давёў да галечы свайго саперніка. Пастаяннымі праследаваннямі ён прымусіў яго пакінуць Польшчу і бегчы ў суседняе Вялікае княства Літоўскае.

Шэраш жа за сваё жыццё паспеў памяняць шмат гаспадароў і набыў упэўненасць, што лепей за ўсё ні ад каго не залежаць. У час сваіх прыгод ён атрымаў мноства сечаных і колатых адмецін, якія сведчылі аб нераўнадушных адносінах да яго многіх людзей. Але больш за ўсё Шэраш ганарыўся глыбокім шрамам праз увесь твар, па якім пазнавалі яго і сябры, і ворагі. Што датычыцца алмаза-дыямента, дык з'яўленне яго ў дзіравых Шэрашавых кішэнях толькі пацвярджала: не заўсёды дзейнасць гэтага чалавека была бездакорнай у стаўленні да закона.

Як бы там ні было, Шэраш прапанаваў свайму новаму сябру дагавор: яны аб'яднаюць знатнае імя Красоўскага і патаемнае багацце Шэраша, каб дабіцца ад караля дазволу пабудаваць невялічкае паселішча, якое насіла б імя Шэраша і фармальна належала Красоўскаму. Гэта было выгадна аднолькава і беспрытульнаму двараніну, і бадзягу з цёмным мінулым.

Так узнікла Шарашова. І першымі жыхарамі яго былі сябры Шэраша па яго небяспечных вандроўках. Суровыя, моцныя, гордыя, яны прыходзілі сюды, каб знайсці часовы прытулак ад шматлікіх ворагаў, і заставаліся назаўсёды. У новае паселішча перабраліся таксама сяляне, якім абрыдлі прыцясненні мясцовых уладальнікаў. У Шарашове пасяліліся рамеснікі, купцы, стары святар. Душой усіх быў дзейсны, вясёлы, справядлівы Шэраш. Ён назіраў за жыццём і працай мястэчка, разбіраў скаргі жыхароў, іх спрэчкі, благаслаўляў шлюбы, разам з узброеным атрадам бліжэйшых сяброў абараняў паселішча ад ворагаў. Яго знатны таварыш толькі здзіўляўся энергічнасці і сардэчнай шчодрасці, якія праяўляліся ва ўсім: ад падзелу паміж жыхарамі Шарашова адбітага ў шматлікіх

ворагаў багацця, ды кахання, якое ён шчодра дараваў кожнай ахвотніцы. Шэраш не абраў сабе жонку, але шмат хто з дзяцей новага паселішча горда насіў прозвішча Шарашовіч, Шаршуновіч, Шарашовец, утворанае ад імя іх бацькі...

Аднойчы Яна Красоўскага знайшлі ў лесе. У яго грудзях тырчаў дарагі кінжал з вензелямі. Стары раўнівец адшукаў, нарэшце, свайго саперніка. Змрочны цень лёг на Шэрашаў твар...

Ноччу, пасля пахавання сябра, ён сабраўся ў дарогу, узяўшы з сабою кінжал, якім быў забіты Красоўскі. Прайшло няшмат часу, і нават да гэтых глухіх мясцін даляцела жудасная вестка пра страшную Шэрашаву помсту і пра тое, што кароль пакляўся злавіць і пакараць мсціўца. І гэта было адзінае, пра што дакладна даведаліся жыхары Шарашова. Шмат гадоў яны чакалі Шэрашавага вяртання, але дарэмна. Хадзілі чуткі, што ён загінуў у сутычцы з атрадам каралеўскіх стралкоў. Але ніхто не хацеў верыць у гэта. Бо доўга яшчэ іншыя маладыя маці паселішча ўпарта называлі бацькам сваіх нованароджаных дзяцей Шэраша, які быццам хаваецца ў лесе разам з найбольш смелымі і адважнымі сваімі паплечнікамі. Як бы там ні было, праўды аб лёсе Шэраша і да гэтых часоў ніхто не ведае...

Стары завяршае свой аповед, працягваючы руку ў бок ратушы, на якой красуецца герб Шарашова: чалавек, апрануты ў рыззё, са ззяннем вакол галавы.

– Не глядзі, што на ім німб,– даверальна шэпча сівы апавядальнік свайму субяседніку. – Гэта – зусім іншы святы, не той, пра якога ты думаеш. Каралева Бона, даючы Шарашову магдэбургскае права, наказала майстрам выбіць на нашым гербе аднаго са сваіх святых. Ну, яны і выбілі постаць «святога» Шэраша, якому кароль так і не дараваў яго ўчынку. Усе пра гэта ведаюць, але ніводзін з гараджан ніколі не выдасць майстроў. Гэта – самая свяшчэнная таямніца Шарашова.

# Божая Маці-заступніца

На ўскраіне Белавежскай пушчы, па абодва бакі дарогі Брэст – Камянюкі, раскінулася вялікае сяло Дзмітровічы. Побач з дарогай стаіць Свята-Прэабражэнская царква, пабудаваная ў 1786 годзе.

Гарачым летам 1938 года жыхароў Дзмітровіч абудзіў набат – гарэла ўсходняя частка сяла. Бяда аб’яднала людзей, якія дапамагалі адзін аднаму справіцца са стыхыяй. У калодзежах скончылася вада, абмялела сажалка, а агонь не здаваўся, захапляючы ўсё новыя і новыя плошчы.

І тады мая бабуля, Марыя Палікарпаўна Елінецкая (роду Лявіцкіх), жанчына цвёрдай веры, вынесла з дому трохсотгадовай даўніны ікону Божай Маці „Неапалімая купіна” і, стаўшы на калені на шляху агню, падняла над сабой ікону. Вусны яе шапталі малітву да Маці Божай.

Гарачыя, гатовыя заняцца полымем, сцены пабудоў не загарэліся. Быццам стаміўшыся ад жахлівай „працы”, агонь сціх, не дайшоўшы да царквы, якая стаяла побач з нашай хатай. Ацалела царква, ацалела і рэштка вёскі. Дагэтуль храм цешыць вока і дае духоўнае заспакаенне прыхаджанам.

Сапраўднае здарэнне з тых часоў зараз расказваюць як легенду.

## Будавалі башню Веліканы?

Са старажытных часоў у Камянцы існуе паданне пра тое, што Камянецкую вежу будавалі веліканы. Звычайным людзям такая работа была не пад сілу.

Высачэзныя асілкі, каб не нахіляцца да зямлі па цэглу, стаялі на каленях. Так было зручней, а таму рабілі хутка і спраўна. Праз паўтара гады будаўніцтва было завершана. Падняўшыся з кален, веліканы вырашылі прагуляцца па пушчы, якая пачыналася за ракой з прыгожай назвай Лясная.

Пераступіўшы сямімільнымі крокамі праз водную гладзь, яны пакінулі свае сляды ўздоўж берага, на якім вырашылі пабудаваць сяло. Далі яму назву Ступічава. Стаіць яно і дагэтуль.

Даўней камяні лічылі жывымі істотамі. Нашы прашчуры думалі, што яны так, як і людзі, здольныя жыць і размнажацца, і таму камяням ніколі нічога благога не рабілі. Болей таго, тым, што вылучаліся сваёй велізарнасцю, незвычайнай формай ці адбіткамі слядоў, пакланяліся. Такія камяні абагаўлялі, шанавалі, прыносілі ім ахвяры, з імі звязваліся прыгожыя самабытныя легенды і паданні.

Адзін з такіх камянёў ляжаў там, у межах сённяшняга горада Камянца. Людзі з навакольных вёсак заўсёды прыходзілі да яго, калі трэба было аб нечым параіцца, папрасіць дапамогі, але найчасцей звярталіся, калі не хапала хлеба, галадалі. Многа камень не даваў, а бохан-другі абавязкова з'яўляўся пад раніцу на яго паверхні. Для гэтага трэба было прынесці каменю невялікую ахвяру ці паднашэнне і прашаптаць магічна-таямнічыя словы: «Камень-камянец! Дай мне на заўтра хлябец! Цяжка стала жыць – дзяцей няма чым карміць!» Зрабіў усё згодна канонам – і можаш смела кіраваць дамоў, а назаўтра прыходзіць па хлеб. Доўга гэтак дапамагаў камень людзям, выручаў не раз і не два. Але аднойчы здарылася бяда.

Жыў у бліжняй вёсцы злы знахар, які зайздросціў таму, што ўсім камень дапамагаў, акрамя яго, і вырашыў ён зрабіць на злосць людзям. Прыйшоў пад вечар, каб ніхто не бачыў, не прынёс каменю паднашэння, не звярнуўся ласкава з традыцыйнымі словамі, а мовіў: «Камень-камяніска! Аддай сваё залаціска! Яно ў цябе ляжыць, а мне будзе добра жыць!» Пачуў камень такую просьбу і праваліўся ад абурэння разам са знахарам. Прыйшлі людзі раніцою, а каменя няма, толькі глыбокі-глыбокі калодзеж са сцюдзёнаю вадою... З таго часу толькі назва і засталася – Камянец. Пазней людзі там жыць сталі. Горад утварыўся.

# Легендарная горка

Месца, абранае ганцамі Валынскага князя Уладзіміра Васількавіча для пабудовы Камянца, было вельмі ўдалым з ваенна-стратэгічнага пункту гледжання. І не толькі. Гэтае месца знаходзілася на перакрыжаванні сухапутных гандлёва-ваенных шляхоў і воднага (хоць і не галоўнага, з выкарыстаннем рэчкі Лясной) Валынь-Балтыка. Шляхі існавалі задоўга да заснавання горада.

Горадам і землямі ў ваколіцы валодалі спачатку Галіцка-валынскія князі, а ў палове XVI стагоддзя горад і землі адыйшлі да Вялікага Княства Літоўскага. У гэты час па сваёй значнасці з усіх транспартных шляхоў выдзяляліся два – „бурштынавы” і „каралеўскі”. Першы выкарыстоўваўся для перавозу бурштыну з берагоў Балтыйскага мора ў паўднёвую Еўропу, а таксама для перавозкі іншых тавараў. Другі служыў дзяржаўным адносінам паміж дзьвюма сталіцамі – Кракавам і Вільняй - таму і называўся „каралеўскім”.

Нібы дзве змяі, віліся і праціскаліся праз густыя, драмучыя лясы і балоты, перасякаючы рэчкі, гэтыя два шляхі нідзе не мяжуюцца, і толькі перад Левай Лясной яны спалучаюцца ў адзін. Злучыўшыся, ўцягваліся праз Літоўскую вуліцу (цяпер Піўненка) у Камянец, каб, прайшоўшы плошчу Кірмаш (цяпер вуліца Леніна), пераправіўшыся па мосце цераз Лясную (раней было тры масты, цяпер адзін) разыйсціся ў канцы сялення Замасты. „Каралеўскі” шлях праз Вайскую, Мінькавічы, Мураўчыцы, Доўбнева, Высокае накіроўваўся да пераправы праз Заходні Буг у Нямірава і далей у Кракаў. (У 1942 годзе гэтым шляхам немцы гналі камянецкіх габрэяў на халакост).

„Бурштынавы” скручваў улева і праз Вялікаельню, Ліпну, Кругель, Ратайчыцы, Трасцяніцу, Рудавец, Брэст, уздоўж Заходняга Буга цягнуўся далёка на поўдзень.

Гэтыя транспартныя артэрыі выкарыстоўваліся на працягу некалькіх стагоддзяў. Шмат ганцоў, ваенных атрадаў, княжаскіх каралеўскіх асоб, гандлёвых абозаў праехала гэтымі шляхамі ў абодвух напрамках.

Купцы ніколі не адпраўляліся ў далёкую дарогу па адным. Гуртаваліся ў вялікія абозы з узброенай аховай (самі купцы таксама мелі зброю). На дарогах было небяспечна: нападалі ліхія людзі, рабавалі, забівалі. Вялікай групай лягчэй процістаяць нападаючым. Не лішняй была і дапамога адзін аднаму падчас пераправаў і непрадугледжаных аварый. Не заўсёды купцам удавалася абараніць свой тавар - трацілі ўсё, што мелі, у тым ліку жыццё.

Для некаторых людзей возніцтва ў абозах было спосабам пражыцць, адзінай крыніцай дабрабыту.

Падарожнічалі толькі ўдзень. На начлегі абоз спыняўся выключна ў паселішчах. Уздоўж усяго „бурштынавага" шляху было больш дзесятка „пунктаў", дзе абознікі маглі бяспечна адпачыць, падрамантаваць вазы, перакаваць коней.

Сярэдзіна XVI стагоддзя. Шмат дзён быў у дарозе абоз. Чэрвень. Спёка. Сляпні „даядаюць" і людзей, і жывёлу. Стаміліся людзі і коні. Найбліжэйшы жаданы „пункт" - у Камянцы, але круглы, таксама прытомлены, дыск сонца напалову схаваўся за гарызонт. Вопытныя возчыкі, не раз ездзіўшыя па гэтым шляху, ведалі: рызыкаваць нельга. У гэтых мясцінах лютуе грозная шайка разбойнікаў з бязлітасным Акімам на чале. Яна наводзіць страх на ўсю акругу. Таму вырашана не спакушаць лёс. На ноч затрымаліся ў сяле Вугляны.

Распэглі коней, далі ежу, возы паставілі кругам, звязаўшы колы ланцугамі. Атрымалася своеасаблівая крэпасць-вагенбург. Павячэралі, выставілі варту, памаліліся Богу і леглі адпачываць.

Толькі пачало світаць - людзі паўставалі, замітусіліся, пачалі паіць коней, рыхтавацца да далейшай дарогі. Неўзабаве абоз у ранішняй прахалодзе рушыў наперад.

Пярэднія вазы ўз’ехалі на пагорак. Ужо зусім недалёка віднеўся масіўны цыліндрычны Камянецкі стоўп, блішчэлі макаўкі і крыжы цэркваў, прыземістыя бязлікія хаты і хлявы камянчан. Раптам коні пярэдніх вазоў, нібы пачуўшы дзікага звера, захраплі і кінуліся ўбок, возчыкі нацягнулі лейцы, каб спыніць коней. Калі ж разгледзеліся, убачылі, што на вяршыні гары, якая ўзнімаецца злева ад дарогі, ля самотнай грушкі стаіць група людзей. Абоз спыніўся, некаторыя з купцоў пайшлі даведацца што здарылася. Падыйшоўшы бліжэй, убачылі чалавека са звязанымі рукамі, босага, да паловы распранутага, з ускалмачанымі валасамі. На грушы была павешана вяроўка з пятлёй на канцы. Вакол стаялі стражнікі, крыху збоку – кат з каптуром на галаве, далей стаяў натоўп мясцовых зявак, якія прыйшлі паглядзець пакаранне. Злачынца стаяў, панурыўшы галаву. Перад натоўпам выйшаў ураднік і пачаў чытаць прысуд. У гэты момант з-за чэмерскага лесу прыляцела зграя варон, якія, каркаючы, пачалі кружыць над горкай. Сказанец нібы не чуў таго, што адбываецца вакол, з сумам углядаўся ён ўдалечыню, на даліну Лясной, на ўзыходзячае сонца, на магутную пушчу. Глядзеў і ўсведамляў, што бачыць усё гэта ў апошні раз. Змоўк ураднік, а вароны працягвалі кружыцца і злавесна каркаць. Кат падыйшоў да дрэва, залажыў пятлю на шыю злачынцу. У адну хвіліну перад вачыма сказанага бліскавіцай праляцелі эпізоды жыцця: бацькоўская хата, сябры-падлеткі, з якімі бавіўся на блізкім лузе, бязвоблачнае дзяцінства і шчаслівае юнацтва. На гэтыя вобразы наплылі твары забітых ім людзей. Забітых дзеля грошай, дзеля нажывы. Успомніліся словы запаведзяў, якія часта паўтарала маці: „не забі”, „не ўкрадзі”. Маці казала, паўтарала, маліла, а ён не чуў яе слоў. Яшчэ імгненне - і ўсё знікне: і рэчка, і сонца, і лес, і людзі, і чорныя вароны... Прыйшла часіна расплаты. Кат выбіў яму калодку з-пад ног. Пятля моцна сціснула шыю, галава панікла, рукі бязвольна павіслі ўздоўж цела. Людзі

Музей і Асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы

пачалі разыходзіцца. Купцы таксама пайшлі да сваіх. Ішлі з дваякім пачуццём: справядлівага пакарання і чалавечай літасці. Ужо ведалі, што злачынцам быў той самы Акім – граза наваколля.

З тае пары горка на ўсходнім узбярэжжы Камянца называецца „Шыбеніца".

Абоз купцоў паехаў далей, везучы тавары з берагоў Балтыйскага мора, у тым ліку залатую смалу – бурштын - для прыгажунь паўднёвай Еўропы.

На працягу некалькіх стагоддзяў яшчэ многа разоў горка была месцам пакарання, дзе здзяйснялі кару смерці праз павешанне. Апошняе пакаранне адбылося падчас паўстання 1863 года, калі на „Шыбеніцы" павесілі інсургентаў.

Больш няма грушкі на гары, шуміць у тым месцы задумлівы лес, прыносячы сумныя развважанні пра нікчэмнасць чалавечага жыцця.

Кожны раз, калі бываю на ўзбярэжжы Камянца, задуменна гляджу, як ранкам над „Шыбеніцай" устае сонца - так, як некалі, ляцяць з-за чамярыцкага лесу вароны, толькі не кружаць над горкай у чаканні ахвяры, бо ахвяр там ужо няма.

# Ваўкі далі назву

На заходняй ускраіне Белавежскай пушчы больш чатырох стагоддзяў таму людзьмі з Валыні было заснавана некалькі сёл - Амелянец і Палічна. Былі яны асочнікамі, вартаўнікамі пушчы. Сустракаліся і асобныя асаднікі.

Такі вось асаднік паставіў сабе хату ў глухім лесе, непадалёку ад ракі Сыпіркі (Сіпуркі). Звалі чалавека Цімох. Паляваў Цімка на розных звяроў, рыбачыў. Прайшлі гады, побач з цімохавай хатай паявілася яшчэ некалькі.

Непадалёку ад таго паселішча быў невялічкі ўзгорак, на якім ваўкі мелі сваё логава. Узгорак называлі «Воўчы». Ваўкі зграяй час ад часу наведваліся ў паселішча, каб „зарэзаць” авечку, свінню ці нават цяля.

Паселішча з года ў год павялічвалася і вырасла ў вялікую прыгожую вёску, якая называецца Ваўкаставец. Назва – своеасаблівы напамін пра тое, што звяры былі тут раней за чалавека.

## Не стала царквы

З пакалення ў пакаленне жыхары вёсак Мікалаева (Вялікаельня) і Бялёва пераказваюць легенду пра царкву і могілкі, або, як часта называюць, – цвінтар.

Непадалёку ад сённяшняй вёскі Сарава, дзе зараз хутар, была зямля пана з Мікалаева. На гэтай зямлі стаяла старая драўляная цэркаўка, а побач знаходзіўся цвінтар.

Ці то за грахі пана, ці з якой іншай прычыны, падчас адной страшнай віхуры з громам і бліскавіцамі зямля нечакана расступілася і царква разам з цвінтаром скрылася ў нетрах.

Дагэтуль у тым месцы загадкавая яма, якая палохае ўсіх праязджаючых.

# Мурыны

Некалі ў Камянцы непадалёку ад габрэйскіх могілак „Кворэс” вілася невялічкая вулічка Мурынка. Сягала яна да вёскі Мурыны, размешчанай на ўзгорку. Цяпер няма тых могілак, а вёска амаль злучылася з Камянцом.

Цікавая назва – Мурыны. Пераглядаючы дакументы, архівы, нідзе не знойдзем звестак пра тое, кім былі будаўнічыя Камянецкай вежы і царквы Благавешчання Святой Багародзіцы. Можам здагадвацца, што цяперашнія жыхары вёскі Мурыны – патомкі славутых дойлідаў, мураваўшых і Стоўп, і царкву па загаду валынскага князя Уладзіміра Васількавіча.

Людзі расказваюць, што некалі ў вёсцы Мурыны была прыгожая царква. Зараз яе няма. Пэўнага разу маладая жанчына пайшла на ўзгорак за вёскай, каб накапаць жоўценькага пясочку. Узяла рыдлёўку, вядзерца і пачала капаць. Раптам пачула за спіной старэчы крэкт і голас: „Не капай, дзіцятка, святое месца тут. Некалі ў гэтым месцы царква стаяла, ды за грахі нашы пад зямлю правалілася.”

Азірнулася дзяўчына, а гэта дзядусь Пятро, той самы, славуты на ўсю Камянеччыну Пятро-музыкант, пра якога яшчэ на пачатку мінулага стагоддзя пісалі газеты.

Дагэтуль частка жыхароў вёскі мае прозвішча Мурын.

# Свінёва

Наша сяло Свінёва вельмі старое. Мае мо 300 гадоў, а мо і больш. Заснавальнікам сяла быў род Чачоткавічаў. Усякае бывала на працягу гэтых стагоддзяў: і войны, і пажары, і рабункі, і хваробы. Яшчэ перад Другой сусветнай вайной у вёсцы было 84 двары. Зараз няма і паловы. Памірае вёска. Людзі састарэлі, і, каб не прыезджыя з Валыні, не было б каму зямлю абрабляць.

У паўкіламетры за сялом, па правым баку ад грэблі на Асіннікі (некалі Тамаполе), на астраўку, дзе расце пустазелле, былі могілкі – цвінтар. Гэта зараз усё асушылі, а калісь тут усюды былі балоты. Яшчэ не так даўно на цвінтары можна было ўбачыць каваныя крыжы. Побач з цвінтаром Карнілкавы могілкі. Так людзі называюць магілу сям’і Карнілы Герасімовіча, якую немцы расстралялі нібы за сувязь з партызанамі.

Нехта спытае: чаму ў Свінёве ёсць могілкі, а няма царквы, бо так павялося: дзе царква - там і могілкі. Дык адкажу. Царква была некалі ў Асінніках, і могілкі там былі. Свінёва адносілася да тае парафіі. Але як прыйшла чорная хвароба – халера – людзі паміралі і хавалі іх на могілках у Свінёве. Гэтыя могілкі і называлі „халерычныя”. Не было ніякай рады, каб спыніць эпідэмію. Людзі мерлі, як мухі. Аднаго разу нехта сказаў, што трэба пайсці насуперак Хрысціянству і прынесці чалавечую ахвяру. Так і зрабілі. Знайшлі прыгажуню і жыўцом закапалі яе на халерычным цвінтары. Хвароба спынілася, толькі і жыхароў у навакольных вёсках засталося – на пальцах аднае рукі палічыць можна было. Буйныя землеўладальнікі, каб было каму абрабляць зямлю, прывезлі людзей з Палтаўшчыны і з Валыні.

# Бяздоннік

На поўдзень ад Камянца, у Мурынскім лесе, ёсць возера, якое карыстаецца дурной славай. З даўніх часоў старыя людзі казалі, што гэтае возера вельмі глыбокае – не мае дна – Бэздэннік – і спалучаецца падземным каналам з ракой Лясной, якая ўпадае ў Буг.

Легенда сведчыць, што аднойчы селянін прывёў сюды напаіць каня. Ступіўшы раз-другі, конь пайшоў пад ваду. Разгублены гаспадар, пастаяўшы ў роспачы, пайшоў дамоў.

А праз некаторы час жыхары вёскі Цюхінічы (каля Брэста) абвясцілі, што з рэчкі Лясная, побач з вёскай, выплыў конь. Той самы.

Зараз возера абмялела, ды і чутак пра тое, што хтосьці там патануў, даўно не было.

28 жніўня кожны год на Успенне збіраецца шмат людзей з ваколіц нашага раёна на святое месца «Грушка». Яно знаходзіцца непадалёку ад вёскі Вярховічы (20 хвілін пешшу), каля Бушміч.

Чаму на гэтым месцы вырастае пладовае дрэва груша, як бы яго ні стараліся знішчыць, вырваўшы з каранём? Ізноў якімсьці чынам прарастае маленькая сцяблінка і цягнецца да свету ўсё вышэй і вышэй.

У народзе існуе такая легенда: „Неяк раніцай дзяўчына-падлетак Параскоўя з сям'і Паўлючукоў з вёскі Бушмічы пасла на ўзгорку авечак каля вялікай разгалістай грушы. Набліжаўся поўдзень, на небе ніводнай хмаркі. Раптам пад дрэвам з'явілася Божая Маці ў вобразе жанчыны. Навокал яе зіхацелі сонечныя праменні. Дзяўчынка заплакала і распавяла жанчыне пра сваю сірочую долю. Божая Маці супакоіла малую і сказала, што тая будзе здаровая і шчаслівая, пасля чаго выява знікла. Людзі паверылі ў расказ сіроткі і сталі лічыць гэтае месца святым.

Ішлі гады. Усякія здарэнні, якія там адбываліся, пераканаўча даказвалі, што месца гэта святое, і там трэба маліцца за здароўе блізкіх.

Па просьбе царкоўных служыцеляў прыхаджане пабудавалі каля грушы невялікую капліцу для малення. Узведзеная яшчэ пры панскай Польшчы, яна прастаяла да 1960 г. Але ў 1960 годзе райкам партыі без усялякай веры ў гэтую боскую сілу, нягледзячы на пратэст людзей, вырашыў начыста ўсё знішчыць. З коранем вырвалі развесістую грушу, разабралі капліцу, усё вывезлі і спалілі. На гэтым месцы цудам прарасла маленькая груша, аберагаемая людзьмі. А маленні за здароўе кожны год пачынаюцца вечарам 27 жніўня і не спыняюцца да самай раніцы.

Побач з маленькай грушкай людзі пачалі ставіць невялічкія крыжыкі, якіх з гадамі станавілася ўсё больш.

Шмат часу прайшло з тае пары, але ізноў у 70-ых гадах было «нашэсце» ўлады на гэтае святое месца. Знішчылі ўсё, заааралі і пасеялі азімыя. Але ізноў прарастае гэтае кволае, але нязломнае перад цяжкім прыгнётам улады пладовае дрэўца.

Вялікі папрок ад людзей тым, хто ўдзельнічаў у знішчэнні гэтага святога месца. Амаль усе, хто прымаў прамы удзел у злачынстве, заўчасна пакінулі жыццё. У пакаранне?.. А, можа, гэта толькі супадзенне? Цяпер цяжка што-небудзь сцвярджаць або абвяргаць.

І толькі ў так званы час перабудовы дазволілі вернікам заапекавацца гэтым невялічкім кавалачкам зямлі. І людзі працягваюць маліцца на гэтым месцы за здароўе сваіх родных і беражліва ахоўваць святое месца «Грушка».

А дзяўчынка-сірата ва ўзросце 16 год з’ехала ў Злучаныя Штаты Амерыкі і там жыла. Ці шчаслівая? Абяцанні Божай Маці дазваляюць верыць, што так.

# Легенда пра горад Высокае

З усходняга боку да горада прымыкае невялікі лес, які завуць „Панечка" (Пенечка, Пеначка). Паводле легенды, калі тут з сілай кінуць камень аб зямлю, да слыху данясуцца дзіўныя гукі, падобныя на стогны. Старажылы пра гэта даўно ведаюць. Калісьці, гадоў пяцьсот таму, расказваюць яны, на гэтым месцы было глыбокае возера. На беразе стаяў замак знатнага літоўскага магната, суровага і жорсткага. Любіў ён толькі жонку ды юную дачку. Аднойчы, вяртаючыся з палявання, гаспадар заўважыў закаханую пару. Нацягнуўшы цеціву лука, ён стрэліў. Нежывое цела дзяўчыны ўпала на зямлю.

На другі дзень ля парога спачывальні магнат знайшоў труп сваёй жонкі. Гэта была помста. Дачка ўладальніка замка ўсе дні праводзіла ў малітвах. І вось неяк у акно капліцы асцярожна пастукалі. На парозе стаяў прыгожы юнак. Расказам пра свой горкі лёс ён крануў сэрца дзяўчыны. Не ведала яна, што гэта – юны мсцівец. Праз некалькі дзён маладая пара стаяла перад грозным гаспадаром замка. Дачка прасіла благаславення. Стары пільна прыглядаўся да твару суджанага сваёй дачкі. І раптам у вачах яго прамільгнула страшная здагадка. Ён успомніў закаханую пару ў парку і труп сваёй жонкі. Так, гэта ён! «Гэта ж забойца тваёй маці!» – закрычаў стары. Але дачка не слухала яго лямант. Тады ў адчаі бацька пракляў сваю дачку.

А назаўтра жыхары горада былі сведкамі дзіўнай з'явы. На вачах усіх замак і капліца зніклі ў глыбіні возера, берагі якога сышліся. І цяпер на гэтым месцы паляна адзываецца дзіўнымі гукамі. Гэта – стогны загінуўшых насельнікаў замка.

# Манах

Высокае. Стары парк. Амаль штоноч перад уваходам з боку сінагогі можна ўбачыць таямнічую постаць у шэрым клабуку.

Прывід ці жывы чалавек?

Ён прыходзіць на захадзе сонца. Паднімаецца па сходах праз абаронны вал на дзядзінец і крочыць няспешна да ўязной брамы. Там, спыніўшыся на хвіліну, узыходзіць на развалiны і замірае, сумна гледзячы туды, дзе некалі быў кляштар братоў Баніфратараў. Ад колішняга кляштара застаўся толькі будынак, які сваёй строгасцю, нават суровасцю, страшыць і адначасова прыцягвае.

Манах, чаго шукаеш у сённяшнім мітуслівым свеце? На каго чакаеш? Якую таямніцу крыеш у сваім сэрцы?

Ніхто не бачыў твару, бо каптур насунуты нізка на вочы. Гавораць толькі, што, мінаючыся з таямнічай постаццю, чуеш павеў зімна. Цягне холадам нават у спёку.

А што ж сам манастыр? Якая яго таямніца?

Гісторыя манастыра пачалася шмат стагоддзяў таму. Аднаго разу Аляксандр Сапега, тагачасны ўладальнік Высокага, загадаў пабудаваць шпіталь. Пачалася будова, якая доўжылася 10 год, але Сапега нечакана спыніў работы і загадаў разабраць сцены. На гэтым месцы вырашыў узвесці манастыр. 1 жніўня 1773 года будова пачалася нанова. Праз 12 год у манастыры пасяліліся манахі - браты Баніфратары - адкрылі шпіталь, апекаваліся хворымі, сіротамі, удовамі. Мужыкам з навакольных вёсак не надта падабалася такое суседства. Мо ў людзях гаварыла зайздрасць, а мо неразуменне таго, чым займаліся мніхі. Карацей кажучы, на Баніфратараў спісвалі ўсе грахі, усе злачынствы і хібы людскія. Незадавальненне нарастала з года ў год. Калі некага з манахаў

памылкова, а часцей мэтанакіравана, абвінавачвалі ў злачынстве, той не адбіваўся, не апрадваўся, а толькі маліўся за душы крыўдзіцеляў. Мужыкі не разумелі такой паставы і злавалі яшчэ больш.

Манастыр існаваў 55 год. І вось жыхары навакольных вёсак вырашылі пазбыцца „святога" суседства. Аднойчы цёмнай ноччу 1840 года, узброіўшыся віламі і косамі, яны рушылі „наводзіць парадкі". Якім жа было іх здзіўленне, калі ўбачылі, што манастыр пусты, усе манахі зніклі, быццам праваліліся пад зямлю. Разам з імі зніклі і іх падапечныя. Толькі вецер гуляў у пустых мурах...

Людзі строілі здагадкі куды маглі падзецца манахі. Можа, уцяклі падземным калідорам у сапегаўскі палац або ў воўчынскі касцёл? Можа, з'ехалі поцемкам у Барок, дзе, як вядома, пасялілася нячыстая сіла, і там прапалі? А, можа, Бог забраў іх на неба... Так ці інакш – манастыр быў пусты. Праўду ведалі толькі манастырскія сцены, але яны маўчалі.

Будынак па былым манастыры братоў Баніфратараў па сённяшні дзень беражэ таямніцу. З напаўразбуранай паркавай брамы глядзіць на яго манах, намагаючыся адгадаць падзеі сівой даўніны.

Убачыўшы таямнічую постаць, не чапайце яе, не перашкаджайце. Сыдзіце з дарогі, прапусціце нязвыклага вандроўніка. Няхай ідзе з Богам.

# Пра нячыстую сілу

Паміж горадам Высокае і вёскай Агароднікі, па левым баку шашы, знаходзіцца лес Барок. Шмат незвычайных гісторый звязана з ім. Гавораць, што ў Барку знайшла сваё месца нячыстая сіла. Людзі расказвалі, што аднойчы пад вечар ехаў возам мужык з базара, і калі праязджаў ля Барка, з лесу выбег чорны баран. Конь затрымаўся і не пайшоў далей. Мужык паганяе каня пугаю, а той – ні з месца. Сышоў гаспадар з воза, злавіў барана, паклаў на фурманку і намерыўся ехаць далей. Толькі конь штораз неспакайнейшы, мітусіцца. Здагадаўся чалавек: штосьці не тое з баранам. Скінуў яго з воза, сцебануў пугай, і пабег баран у лес. Зашумела, загуло ў лесе. Конь страпянуўся і пакрочыў наперад.

– Нячыстая сіла, відаць,– буркнуў мужык і перахрысціўся.

Дагэтуль лес мае дурную славу, бо надта ж аблюбавалі гэтае месца самагубцы. Здараецца, што знаходзяць у Барку знясіленых людзей, якім абрыд белы свет. І ніхто не ведае, ці самі яны пасягнулі на сваё жыццё, ці, можа, нехта «дапамог». Рэдка бабы ходзяць у Барок па ягады, хаця ягады там растуць буйныя ды сакавітыя. А калі і ідуць, то цэлай кампаніяй, каб не страшна было. Не збіраюцца ў Барку на пагулянкі (лес у пяці хвілінах хады ад горада), хоць у гэтым невялічкім ляску вельмі маляўнічыя зацішныя паляны, скрытыя ад чужога вока гушчаром. Нават дзеці, якія любяць адкрываць нязведаныя і таямнічыя мясціны, неяк інстынктыўна абыходзяць Барок стараной.

# Таполя – абаронца

У ваколіцах Высокага ёсць невялічкая вёска Кусічы. Нічым не выдзяляецца гэта вёска сярод іншых, толькі мела яна некалі адну асаблівасць. На лузе, ля ракі, дзе жыў гаспадар Карніла, расла вялікая таполя. Людзі кажуць, што тую таполю лічылі абаронцай усёй вёскі. Калі надыходзіла бура, грымела і бліскалі маланкі, таполя прымала на сябе ўсе перуны. Ніводная хата ў вёсцы не загарэлася, не была знішчана, а таполя гарэла некалькі разоў.

Аднойчы, пасля моцнага ўдару перуна, у таполі згарэла верхавіна, але праз год у весну яна зноў амаладзілася. Здаралася, што таполя гарэла па некалькі разоў у год, але заўсёды знаходзіла сілы на далейшае жыццё. Некалькі гадоў таму, калі маланка ізноў запаліла таполю, а пярун бяздушна губіў яе, таполя ў апошні раз выратавала вёску ад бяды. Моцы адрадзіцца ў дрэва ўжо не хапіла. Яно памерла, але памяць пра яго і ўдзячнасць жыхароў жывуць дагэтуль.

# Паніквы

Рэчка Паненка, якая дала назву вёсцы Паніквы, „памятае” падзеі, што адбываліся тут на пачатку XVIII стагоддзя. Непадалёк стаяў маёнтак, дзе гаспадарылі паны Панятоўскія (дзед, бацька, сын). Задумаў паніч пабудаваць на рэчцы млын. Нарыхтавалі дрэва, прывезлі камяні, збіраліся наймаць рабочых. І сніцца малодшаму Панятоўскаму сон, быццам прыйшоў ён на рэчку і бачыць: стаіць у вадзе маладая прыгажуня ў белай сукенцы. Наблізіўшыся, пан пачуў жаласлівую просьбу: „Дарагі мой пане, пакінь мне волю, не стаў на мне млын. Я ж такая маладая, хачу жыць свабодна і вольна дыхаць. Млын будзе перашкаджаць мне. А з дрэва і каменя, што нарыхтаваныя, пабудуй людзям хаты. Я буду за гэта вельмі ўдзячная. Зрабі гэта дзеля майго кахання да цябе.”

Раніцай, прачнуўшыся, пан даў загад расчысціць ад зарасніку берагі ракі і залажыць дзесяць хат сваім людзям. Так пачалася вёска, якую назвалі Паніквы, а рэчка атрымала назву Паненка.

Да нашых дзён застаўся фундамент таго маёнтка, мясцовыя жыхары надалей называюць панскімі поле, узгоркі, лес. А рэчка ператварылася ў ручай - вузкі і мелкаводны. Але ўспаміны пра яе гісторыю старажылы берагуць у сваёй памяці.

За вёскай Бардзёўка, што непадалёку ад Высокага, ёсць незвычайнае месца з простай назвай Лужок. Некалі там працякала вялікая рака, якая пачыналася ў Польшчы, плыла ля вёсак Вычулкі і Клюкавічы. Несла свае воды ля Бардзёўкі і Кавалік, далей праз парк, дзе жыў граф Патоцкі, і ўпадала ў Пульву.

Аднойчы ля ракі праязджаў дзядок. Валы, запрэжаныя ў калёсы, рухаліся лява, бо было горача, ды і дзень схіляўся да вечара. Дзядок спяшаўся дахаты. Вось і вырашыў ён скараціць дарогу - паехаць напрамкі праз раку.

Валы ступілі ў ваду і патапіліся. Угнявіўся дзедка, што такое няшчасце здарылася. У гневе пракляў ён раку. І знікла рэчка назаўсёды. Застаўся невялічкі раўчук, як напамін. Дагэтуль плыве бурлівы раўчук, не высыхае нават у найбольшую спёку, нясе свае воды ў паркавы пруд, а адтуль - у Пульву.

# След Божай Маці

Здарылася гэта шмат гадоў таму.

Па лузе ва ўрочышчы „Підліскі", што непадалёку вёскі Макарава, якая ляжыць за Высокім, ішла Божая Маці. Крочыла няспешна, разглядалася наўкола. Нечакана на яе дарозе з'явіўся велізарны камень. Багародзіца хацела пераступіць праз яго, але зачапілася нагою. Збіла палец, з ранкі пацякла кроў. Тады Божая Маці наступіла на камень і пакінула на ім след. Быццам закляты, валун перастаў расці.

Нельга было чапаць гэты камень, бо быў азначаны святой асобай. Да нядаўняга часу шэры камень выглядаў з зямлі. На ім быў відны след чалавечай стапы. Ды толькі калі лугі пачалі касіць не косамі, а машынамі, камень некаму пачаў перашкаджаць, яго выцягнулі з зямлі і некуды вывезлі. Куды – ніхто не ведае.